
ANNUS ALBARUTHENICUS 2018



LITTERAE ▪ MEDIA ▪ CULTURA ▪ DISCUSSIO ▪ ARS

ГОД
БЕЛАРУСКІ
2018

ANNUS ALBARUTHENICUS 2018

LITTERAE

MEDIA

CULTURA


DISCUSSIO

ARS

XIX TRIALOH
KRYNKI 31.08–01.09.2018

BELARUSIAN OUTSIDE

ГОД БЕЛАРУСКІ 2018



ІДЭЯ НЕ ВЕДАЕ МЕЖАЎ

Тэма сёлетняга Трыялогу наўмысна неаднназначная. Справа ў тым, што неаднназначным з'яўляецца і само англійскае паняцце „outside" якое адрозніваецца ад тэрміну „abroad". У прынцыпе, гэтае першае паняцце азначае, што нехта або нешта знаходзіцца „па-за", „звонку", „на ўзбочыне". Па-беларуску, як дарэчы і па-польску аднак у ангельскім маўленні „аўтсайдар" адназначна схіляецца ў бок нечага або некага хто „адстае", „не паспявае", не адпавядае пэўнай цэласнасці або катэгорыі. І так у спорце аўтсайдар з'яўляецца найслабейшы гулец або каманда, апошнія ў класіфікацыі, якія адхіленыя ад далейшага спаборніцтва. Затое ў сацыялогіі гэта чалавек, які існуе на перыферыі грамадства як неўдалота, вырадак, парый, які не адпавядае агульным стандартам грамадства. Для мяне тэма „Беларусь звонку" прыводзіць на думку некалькі аспектаў на якія я хачу звярнуць увагу. На мой погляд, тэма ўказвае ў першую чаргу на:

– наяўнасць вялікай, беларускай эміграцыі і дыяспары;
– наводзіць на думку ступень прысутнасці і актыўнасці беларусаў і іх культуры ў свеце;
– указвае на факт, што Беларусь прасоўваюць і прапагандуюць у свеце гэтак даўнія як і цяперашнія выдатныя людзі ў розных дзялянках;
– Беларусь з'яўляецца аб'ектам жывога і бескарыслівага зацікаўлення і даследаванняў з боку многіх аўтарытэтных замежных беларусістаў у пары дзясяткаў важных краін свету;

– па прычыне свайго палітычнага выбару краіна з'яўляецца аўтсайдарам у многіх галінах, застаецца маргіналізаваным вырадкам і парыем.

Спрадвечная з'ява міграцыі

Калі ў выпадку краіны ці народу мы кажам пра іх месца ў свеце, дык аўтаматычна прадугледжваем, што яны не абмяжоўваюцца канкрэтнай тэрыторыяй. Тут сама сабою ўзнікае думка пра расцярушанасць і міграцыю. Пад паняццем міграцыі разумеем іміграцыю, эміграцыю і рээміграцыю а таксама рэпатрыяцыю. Як працэс перамяшчэння і змены месца пражывання, выезду з месца жыхарства і паходжання і прыбыцця на новае месца, міграцыя тычыцца ўсіх без аніякага выключэння народаў свету. Розніца можа тычыцца толькі маштабаў гэтай з'явы. У выпадку такой невялікай краіны як Беларусь, з няцэлымі 10 мільёнамі жыхароў, маштабы эміграцыі надта вялікія і сягаюць амаль чвэрці ўсяго насельніцтва. Найболей беларусаў жыве ў Расеі, ЗША, Украіне, Польшчы, Літве, Аўстраліі ды Ізраілі. Апрача самой Рэспублікі Беларусь, дзе беларусы складаюць 4.5 усяго насельніцтва, многія згуртаванні беларусаў знаходзяцца на Беласточчыне, на Віленшчыне, у латышкай Латгаліі, у памежных раёнах Расеі і Украіны, хаця гэта не эмігранты, а карэннае насельніцтва, аўтахтоны, якія там жывуць стагоддзямі. З большага можна сказаць, што паза межамі цяперашняй Рэспублікі Беларусь жывуць ад 2 да 3,5 мільёна людзей нейкім чынам звязаных з Беларуссю. Зараз, паза межамі Рэспублікі Беларусь жывуць і працуюць каля аднаго мільёна пераважна заробкавых эмігрантаў з чырвона-зялёным пашпартам. Цікава, што толькі летась, у 2017 годзе, польскія консульствы ў Беларусі выдалі 35 працоўных віз. Паводле сацыялагічных даследаванняў, больш як палова маладых беларусаў мараць аб тым каб з'ехаць за мяжу. Калі аднак надалей застаюцца на месцы дык толькі таму, што ў іх няма такой магчымасці. Затое старэйшыя людзі не схільныя змяняць месца жыхарства па аб'ектыўных прычынах. Іх ніхто, нідзе не чакае і нікому яны ўжо не патрэбныя.
Прычыны эміграцыі бываюць:
– эканамічныя, звязаныя з пошукамі лепшага жыцця, умоўна кажучы „за хлебам";
– палітычныя, якія спрычынены пераследам палітычнай апазіцыі, Свет прыняў норму, што калі нехта дакажа факт пераследу па палітычных матывах на радзіме, якому трэба даць палітычны прытулак або згоду на жыхарства ды апеку з боку дадзенай дзяржавы. Многія беларусы пакінулі Беларусь цалкам нядаўна, пасля прэзідэнцкіх выбараў 2010 года;
– бываюць таксама рэлігійныя эмігранты, з тэрыторыі ахопленых міжрэлігійнай варажнечу, у краіны з рэлігійнай свабодай або тыя, дзе дадзенае рэлігія з'яўляецца дамінуючай;

– затое ваенныя эмігранты гэтыя тыя, якія ўцякаюць ад узброеных канфліктаў ратуючы сваё жыццё.

Ад дабра не ўцякаюць

У выпадку беларускай эміграцыі прынялося яе тлумачыць пераважна пошукам „хлеба, волі і долі”, гэтай значыць лепшага матэрыяльнага становішча, большай свабоды і агульнага паляпшэння сваёй долі. Кожная вайна, паўстанне, акупацыя або голад схілялі людзей да выезду з краіны. Самая масавая эміграцыя – 1,5 мільёна людзей, прыпадае на канец XIX – пачатак XX стагоддзя. Чарговая вялікая хваля гэта больш за чвэрць мільёна чалавек з заходняй Беларусі ў 20–30 гады XX стагоддзя. Савецкі перыяд азначаў для беларусаў рэпрэсіі, ссылкі, прымусовыя перасяленні. Наступная вялікая хваля эміграцыі гэта канец II Усясветнай Вайны. Пасляваенныя гады прынеслі масавую эміграцыю беларускіх Жыдаў, затое апошнія 20 гадоў палітычную эміграцыю.

У той ці іншай ступені кожную эміграцыю трэба лічыць „прымусовай”, бо кожная ўказвае на нейкую ступень незадавальнення істотных жыццёвых патрэб, што ўзбуджае рашэнне пра выезд. Людзі вырашаюць з’ехаць куды-небудзь паколькі іх важныя жаданні і памкненні былі недастаткова заспакоеныя. Рашаючыся на на выезд эмігрант у асноўным кіруецца аб’ектыўнымі ўмовамі быцця на Радзіме і супастаўляе іх з умовамі, якіх спадзяецца ў замежжы. У выніку міграцыі краіны з якіх людзі з’язджаюць губляюць працоўную сілу ды інтэлектуальны патэнцыял. Затое набываюць іх краіны, якія мігрантаў прымаюць і гэтыя краіны, як правіла, найбагацейшыя. Краінай, якая прыблізна ўжо 100 гадоў селекцыянуе імігрантаў з’яўляюцца Злучаныя Штаты. Зараз, дакладна „ адсейвае” імігрантаў таксама Аўстралія.

Плюсы і мінусы эміграцыі

Калі ў прынцыпе ніхто не ўцякае ад добрага і шчаслівага жыцця і кожныя эміграцыя ў нейкай ступені прымусовая, то яе наступствы трэба разглядаць шырэй чым толькі ў катэгорыях старты альбо набыцця працоўнай сілы і інтэлектуальнага патэнцыялу. У асноўным, сацыёлагі называюць чатыры сцэнарыі якія пераважна знаходзяць прымяненне ўсім без выключэння эмігрантам пасля іх прыбыцця ў любую краіну:

– асіміляцыя, інакш поўнае адмаўленне ад роднай мовы, культурнага досведу і лучнасці з суайчыннікамі. Такая сітуацыя цягне за сабою поўнае і безагаворачнае прыняцця за свае мадэлі жыцця і культуры новай радзімы. Нашчадкі беларусаў, якія прыбылі ў Амерыку звыш 100 гадоў таму часта нават не веда-

юць – адкуль паходзілі іх дзяды і прадзеды. Нават іхнія прозвішчы, якія маглі б указваюць на нацыянальнасць цалкам альбо часткова змяніліся пад мясцовую манеру.
– сепаратызм або жаданне захаваць як мага болей традыцыі, і каштоўнасці сваёй сапраўднай Радзімы. Такая пазіцыя вядзе да жыцця ў сваёй малой групе, своеасаблівым гета. Фанатычнае ўзвышэнне сваёй уласнай культуры і бясконнае падкрэсліванне сваёй адметнасці робіць немагчымы паўнавартасны ўдзел у жыцці дадзенай краіны. Калі сепаратызм дадаткова спалучаны з перакананнем аб вяршэнстве сваёй рэлігіі і маралі разам з пагардай для разняволенага ладу жыцця ў дадзенай краіне, гэта дасканалы грунт для экстрэмізму, у прыватнасці ісламскага.
– інтэграцыя або спроба аб'яднання лепшых рыс, якія былі ў культуры сваёй сапраўднай Радзімы і знаходзяцца ў культуры краіны пражывання. Гэта жаданая процілегласць сепаратызму, але палітыка мультыкультуралізму, прынамсі, у Заходняй Еўропе, не здала экзамену.
– маргіналізацыя або адмаўленне ад абедзвюх культур, паступовая дэградацыя асобы і стан грамадскага сіроцтва. Гэта самы трагічны вынік эміграцыі калі чалавек жыве ў стане ізаляцыі і адчужанасці, бо адно страціў а другога не прыдбаў. Шмат такіх неўдалотаў знаходзіцца сярод шматэтнічных груп бамжоў.
У выпадку беларускіх эмігрантаў, калі не разыходзіцца пра цалкам іншую часовую, заробкавую працу ў суседніх краінах, яны амаль на ўсе 100% падлягаюць або асіміляцыі альбо інтэграцыі. Гэтак было ў мінулым і гэтак сітуацыя выглядае зараз. У пераважнай большасці выпадкаў мэта эміграцыі бывае дасягнутай: за мяжою жывецца больш заможна, спакайней, з большай стабільнасцю і бяспекай. Ёсць магчымасць самарэалізацыі. Праўда, ёсць цяжкасці з адаптацыяй да новых рэалій, ёсць туга за Радзімай, сям'ёю, бываюць разарваныя сужонствы, разводы і разрыў сямейных сувязяў. Аднак з цягам часу адчуванне страт становіцца ўсё меней балючае і ўрэшце цалкам знікае, асабліва ў выпадку асоб, якія маюць магчымасць перыядычна наведваць блізкіх і родных на Радзіме. Аднак для гэтай самой Радзімы эмігранты з'яўляюцца страчанымі назаўжды, паколькі рээміграцыя, вяртанне з чужыны здараецца вельмі рэдка.
Чатыры гады таму, 16 чэрвеня 2014 года, пасля 15 гадоў кансультацыі, Беларусь нарэшце прыняла закон „Аб беларусах замежжа". Улады разлічваюць на тое, што эмігранты стануць амбасадарамі сваёй краіны ў свеце, што будуць спрыяць выпраўленню яе іміджу ў свеце і ажыўленню гандлёвых сувязяў ды прыцягненню замежнага капіталу. У замен прэзідэнт, урад і асобныя міністэрствы абяцалі спрыяць захаванню эмігрантамі сваёй мовы і культуры. Дакумент неверагодна слабы і бязглузды, непрадуманы і чыста дэкларатыўны. Гэтак як і за савецкім часам, стаўленне да эмігрантаў у лукашэнкаўскай Беларусі непрыязны, насцярожаны як да

дысідэнтаў, людзей ідэйна чужых. Закон нявартыя паперы на якой ён быў надрукаваны. Краіна не можа дапамагаць у захаванні беларускасці за мяжою, калі ў сябе на месца займаецца чымсьці цалкам процілеглым. Апрача таго, беларуская эміграцыя, асабліва новая, слаба арганізаваная, адносна бедная і пазбаўленая ўплываў, чаго нельга сказаць пра Жыдаў, выхадцаў з Беларусі. Па-другое, калі цягам апошніх 25 гадоў нехта з'ехаў з Беларусі за хлебам або па палітычных матывах, дык хутчэй за ўсё не захоча мець справу з краінай надалей беднай і надалей кіраванай тым жа самым чалавекам. Такім чынам для беларусаў эміграцыя гэта як правіла падарожжа ў адзін бок.

Бяз'ідэйнасць Раўназначная з Дэнацыяналізацыяй

Усе без выключэння даследчыкі беларускай эміграцыі згодныя адносна мізэрнай нацыянальнай свядомасці беларусаў. У мінулым, калі не было сваёй нацыянальнай дзяржавы, беларусам не было з кім сябе атаясамліваць. У такой сітуацыі, кожны выдатны беларус аўтаматычна лічыўся выдатным расейцам або палякам ці жыдам. У эміграцыі беларусы вельмі часта далучаліся да больш шматлюдных і лепей арганізаваных расейцаў, палякаў і ўкраінцаў. З гэтымі апошнімі па сённяшні дзень дзень у беларусаў найвялікшай згода і ўзаемаразуменне. Усе хто выехаў за мяжу да пачатку I сусветнай вайны як непісьменныя сяляне, выключна " за хлебам" імгненна асіміляваліся і зніклі як асобная этнічнай група. Як пісаў эмігранцкі палітычны дзеяч і публіцыст – Зянон Пазняк „некалі амаль уся 14-я вуліца на Мангэтане размаўляла па-беларуску. Аднак будучы малаграматнымі рабочыя і сяляне хутка раставалі ў амерыканскім тыглі ўжо ў першым пакаленні, сталі 'угнаеннем гісторыі', сыравінай для біялагічнага і генетычнага існавання амерыканцаў, спажывецкім рынкам для чужых". Таксама ў міжваенны перыяд, палітычная эміграцыя гуртавалася бліжэй роднага краю, у Чэхаславаччыне, Літве, Латвіі, затое заробкавая эміграцыя з'язджала далей на захад, пераважна ў абедзве Амерыкі. У 1921 годзе ў Н'ю Ёрку быў заснаваны Беларускі Народны Камітэт і Беларускае Прэсавае Бюро, а ў 1923 годзе ў Чыкага з'явілася Беларуска-амерыканскае Народнае Задзіночанне. Аднак вынік іх працы быў мізэрны. Яны не здолелі падштурхнуць дыяспару да палітычнай актыўнасці. На жаль, з улікам невялікай нацыянальнай свядомасці, без павагі да роднай мовы, без этнічнай салідарнасці і лучнасці са старой радзімай, без належнай кансалідацыі і арганізаванасці, нешматлікія беларускія арганізацыі не здалі экзамену на выжыванне.

Цалкам іншая была пасляваенная эміграцыя ў 40. гады. Напрыканцы і пасля заканчэння II Усясветнай вайны, у заходняй Еўропе апынулася каля 300 тысяч беларусаў, як правіла гарачых патрыётаў, людзей у асноўным маладых і актыўных. Хаця

частка з іх супрацоўнічала з немцамі, аднак выключна з патрыятычных меркаванняў, у спадзяваннях, хоць наіўных ды ілюзорным на стварэнне незалежнай Беларусі. З лагераў для перамешчаных асоб яны пераважна трапілі ў Вялікую Брытанію, ЗША, Канаду і Аўстралію. Не маглі жа яны вярнуцца ў савецкую Беларусь на непазбежную смерць!. У замежжы яны стварылі моцныя, актыўныя арганізацыі такія як Задзіночанне беларусаў Вялікай Брытаніі, Беларуска-амерыканская Асацыяцыя або „Беларускі Саюз Моладзі ў Канадзе”. Некаторыя арганізацыі створаныя адразу пасля вайны альбо крыху пазней дзейнічаюць па сённяшні дзень.

Зараз, як мінімум 44 беларускія арганізацыі актыўна дзейнічаюць у 24 краінах: у Аргентыне, Аўстраліі, Балгарыі, Бельгіі, Вугоршчыне, Швейцарыі, Эстоніі, Швецыі, Чэхіі, Францыі, Узбекістане, Украіне, Расеі, Польшчы, Малдове, Літве, Латвіі, Канадзе, Казахстане, Ізраілі, ЗША, Грузіі, Нямеччыне і ў Вялікай Брытаніі. У прыватнасці, Беларускі Саюз у Польшчы заснаваны 2е гадоў таму з'яўляецца федэрацыяй 7-мі меншых арганізацыі. У Канадзе мае сваю сядзібу Рада Беларускай Народнай Рэспублікі створанай 100 гадоў таму. Абсалютна ўнікальнай установай з'яўляецца Беларускай Бібліятэка і Музей імя Францыска Скарыны ў Лондане, дзе сабрана 40 тысяч тамоў кніг, газет і часопісаў.

Аднак будучыня гэтых арганізацыі няпэўная з гэтай прычыны, што найноўшая хваля эміграцыі з Беларусі гэта людзі, як правіла добра адукаваныя і крутыя, але беларускасці ў іх няшмат. Старшыня Федэральнай Рады беларусаў Аўстраліі – Яўген Груша лічыць, што новых эмігрантаў Беларусь не цікавіць. „Іх цікавяць долары. Усе яны русіфікаваныя, перакананыя, што без Расеі Беларусь не пражыве. Як мы можам перадаць ім штурвал кіравання нашымі арганізацыямі” – кажа Спадар Груша. Аднак цалкам процілеглае меркаванне выказаў Павал Севярынец. „Эміграцыя, гэты дыстыляцыя беларускасці да чысціні слязінкі. У чужым асяроддзі, без апірышча ў выглядзе роднай зямлі, без матэрыяльнай прымесі, ідэал далёкай Беларусі становіцца выключна ўзнёслы, светлы, у ўрэшце рэшт – духоўны”. З маіх асабістых назіранняў таксама вынікае, што эміграцыя, асабліва без магчымасці вяртання, узбуджае патрыятычныя пачуцці ў людзей, якія дагэтуль не атаясамлівалі сябе з беларускасцю. На чужыне, прынамсі ў адносна далёкай Амерыцы, існуе моцная патрэба атаясамлівання сябе з нейкім народам, хаця неабавязкова з дзяржавай.

Што эміграцыя дала Беларусі?

Хаця стаўленне да эміграцыі ў Беларусі цягам дзесяцігоддзяў было варожае і надалей застаецца насцярожаным, недаверлівым, трохі пагардлівым, непрыязным як да дэзерціра, рэнегата альбо некага, хто выбраў лёгкі хлеб, то эмігранты неверагодна ўзбагацілі беларускую культуру і расславілі яе ў свеце. Пацверджаннем гэтаму

з'яўляецца рэакцыя на зборнік вершаў Наталлі Арсенневай „Пад блакітным небам". У часопісе „Полымя" у 1927 годзе літаратурны крытык пісаў: „Н. Арсеннева – не наша, савецкая паэтка, але яна належыць да беларускай культуры незалежна ад месца яе ўзнікнення, уваходзіць у агульную плынь беларускага культурнага развіцця". Шмат напісаў пра творчасць паза межамі краіны Барыс Сачанка ў сваёй кніжцы „Беларуская эміграцыя" выдадзенай у Мінску ў 1991 годзе. Аднак кніжка ў значнай ступені скажоная савецкай прадузятасцю ў дачыненні да эміграцыі, хаця самых фактаў аўтар не не перайначвае. Сачанка цалкам слушна лічыў, што заслуга эміграцыі найбольш заўважная ў галіне літаратуры і выдавецтваў. Калі ў 1867 годзе царскія ўлады забаранілі пісаць і выдаваць па-беларуску, кнігі пачалі выходзіць у Лондане, Парыжы, Кракаве. Ён пералічвае многіх беларускіх паэтаў і празаікаў, вучоных, спевакоў, кампазітараў і іншых, якія жылі або надалей жывуць у эміграцыі. Іх спадчына несумненна з'яўляецца важнай часткай беларускай культуры, хаця на Радзіме яна мала даследваная і невысока ацэньваная. Тут варта прыгадаць, што што Інстытут Беларускай Гісторыі і Культуры выдае цыкл брашур пад назвай „100 знакамітых дзеячаў беларускай культуры". Прызнаюся, што ў выпадку некаторых асоб іх сувязь з беларускай культурай невялікая або моцна перабольшаная. Будучы пераважна грамадзянамі Расейскай Імперыі, паходзячы з польскай шляхты, яны пераважна працавалі на на расейскую або польскую культуру. Я асабіста лічу, што само месца нараджэння або некаторы час дзейнасці на тэрыторыі Беларусі ці навукова-даследчыцкая зацікаўленасць беларускай тэматыкай не сведчыць пра іх беларускасць.
Апрача таго я лічу, што сярод выдатных дзеячаў беларускай культуры абавязкова павінны знайсціся знакамітыя дзеячы ранейшыя за Францыска Скарыну. Тут я маю на ўвазе ў прыватнасці Еўфрасінію Полацкую, праваслаўную манашку-асветніцу з XII стагоддзя, першую святую-жанчыну на ўсходнеславянскіх землях. Таксама ў XII стагоддзі жыў знакаміты праваслаўны іерарх Кірыла Тураўскі названы „рускім Залатавустам". Надта заслужаны для беларускай культуры быў Сымон Будны, аўтар беларускага перакладу Катэхізісу з 1562 года. Справу Скарыны працягвалі: Васіль Цяпінскі і яшчэ адна праваслаўная святая, княжна Сафія Слуцкая.
Тым не меней, якраз месца нараджэння стала вырашальнай прыкметай прыналежнасці да беларускага народу для аўтараў амерыканскага праекту „Пантэон сусветных знакамітасцей" створанага паводле ўвагі прысвечанай ім у электронных медыях. У першай 20-тцы знайшліся: Адам Міцкевіч, ізраільскі палітык – Шымон Пэрэс, савецкі псіхолаг – Леў Выгоцкі, славуты мастак – Марк Шагал, ізраільскі палітык Мэнахі Бэгін, вялікі князь літоўскі і польскі кароль – Станіслаў Панятоўскі, савецкі рэвалюцыянер і бальшавіцкі дзеяч – Фелікс Дзяржанскі, навуковец і лідар сіяніцкага руху – Хаім Вейцман, польскі рэпарцёр і пісьменнік – Рышард Капусцінскі,

савецкі дыпламат – Андрэй Грамыка, амерыканскі эканаміст Сайман Кузнец, паэт Янка Купала, французскі скульптар – Осіп Задкін, амерыканскі кампазітар – Ірвінг Бэрлін, мастак і стэнограф – Лявон Бакст, прэзідэнт Беларусі – Аляксандр Лукашэнка, французскі мастак – экспрэсіяніст – Хаім Суцін, ізраільскі палітык Іцхак Шамір, ізраільскі грамадскі дзеяч Эліазар Бэн-Егуда, ізраільскі пісьменнік і палітык – Залман Шазар. Жыдоўскага паходжання быў таксама народжаны ў віцебскай губерні беларускі і савецкі скульптар Заір Азгур. З вышэй пералічанага спісу вынікае, што беларуская зямля найбольш паслужыла Ізраілю, а многія вядомыя ў свеце людзі выдатныя людзі народжаныя ў Беларусі былі жыдоўскага паходжання, хаця і ўзбагацілі яны культуру некалькіх краін.

Калі аднак прыняць іншую метадалогію і пункт гледжання, дык да выдатных асоб звязаных з Беларуссю трэба далучыць у прыватнасці Тадэвуша Касцюшку, вельмі заслужанага гэтак для Польшчы як і для ЗША. Ігнат Дамейка, вялікі вучоны, нацыянальны герой Чылі нарадзіўся на Гарадзеншчыне і першыя 30 гадоў жыў на Радзіме. Вялікі геолаг і даследчык Сібіры – Ян Чэрскі свае маладыя гады правёў на роднай Віцебшчыне. З гэтай самай вобласці паходзіў знакаміты савецкі канструктар – Павал Сухой. Затое народжаны ў Магілёве Мікалай Судзілоўскі (Nicholas Russel) маладосць правёў на Радзіме перш чым рушыў у свет і апынуўся на Гаваях.

З другога боку трэба памятаць, што большасць выдатных беларусаў не была на ўсё жыццё прывязаная да месца свайго нараджэння і мела большы або меншы эміграцкі досвед. Пачынаючы з вялікага Францыска Скарыны і канчаючы лаўрэаткай Нобелеўскай Прэміі – Святланай Алексіевіч, таксама палітык, грамадскі дзеяч і літаратар – Зянон Пазняк ці вялікі пісьменнік – Васіль Быкаў, а таксама многія вядомыя людзі, жылі або надалей жывуць паза межамі Рэспублікі Беларусь. Для многіх з іх эміграцыя ў бліжэйшае ці далейшае замежжа была жыццёвай неабходнасцю або выратаваннем ад ад смерці і зняволення. Для яшчэ іншых эміграцыя дала патрэбныя ўмовы для жыцця і развіцця іх таленту. Былі людзі, якія ні за што ў свеце не пагадзіліся б пісаць па-расейску. Без эміграцыі іх талент быў бы цалкам змарнаваны.

XX стагоддзе прынесла Беларусі пэўную форму дзяржаўнасці аднак з усімі пертурбацыямі як наступствам палавінчатых і нявдзейсненых нацыянальных памкненняў. На кароткі час з'явілася Беларуская Народная Рэспубліка. Пасля яе была створаная Савецкая БССР аддзеленая ад заходняй Беларусі ў складзе Польшчы. На долю беларусаў народжаных у канцы XIX і пачатку XX стагоддзя выпала не толькі адраджэнне „нашаніўскай пары", але таксама драма бальшавіцкага перавароту, камуністычныя і санацыйны рэпрэсіі, дзве ўсясветныя войны і вялікі зыход самай актыўнай часткі насельніцтва.

Ілюстрацыяй заблытаных лёсаў гэтага перыяду ў прыватнасці можна лічыць Язэпа Германовіча (псеўданім Віцук Адважны), каталіцкага святара, паэта і празаіка,

аўтара біяграфічнай кнігі „Кітай, Сібір, Масква" а таксама „Як Ганульа збіралася ў Аргентыту". Выдатная паэтка і дзеячка народнага руху – Ларыса Геніюш маладосць пражыла на Гарадзеншчыне, 11 гадоў жыла ў Празе, 9 гадоў прабыла ў савецкім гулагу і ў 1983 годзе памерла ў Зэльве. Калі б не эміграцыя, мабыць не было б пранізанага журбою за роднымі мясцінамі зборніка вершаў „Ад родных ніў" і калі б не яе драматычныя лёсы, пэўна творы не былі поўныя мужнасці і стойкасці духа спалучаных з жаноцкай чуллівасцю і цеплынёю. Большасць свайго доўгага жыцця пражыла ў эміграцыі Наталля Арсеннева (1903–1997), паэтка, драматург, перакладчыца, эміграцкая культурна асветніцкая дзеячка. У яе творчасці, аднолькава калі закранала гістарычныя тэмы такія як Слуцкае Паўстанне або асобу Францыска Скарыны, дамінуюць патрыятычныя матывы з філасофскім і містычным падыходам. Яе верш „Магутны Божа" па сённяшні дзень лічыцца духоўным гімнам Беларусі. Талент Арсенневай быў належна ацэнены нават у савецкай Беларусі, што з'яўляецца доказам несумненнага прызнання. У якасці другога паводле значнасці эміграцкага літаратара прынята лічыць паэта, празаіка і перакладчыка – Масея Сяднёва. Гэтак як у выпадку многіх аўтару, якія падаліся ў эміграцыю, ён дэбютаваў у міжваенны перыяд, а яго асноўныя творы, у прыватнасці прысвечаныя драматычнаму досведу з савецкіх лагераў і турмаў, былі напісаныя ўжо ў ЗША. Яго кніжкі пра злачынствы камунізму напэўна не маглі б пабачыць свет інакш як толькі на чужыне. Сяднёў моцна перажываў з прычыны русіфікацыі Беларусі і ў 1988 годзе пісаў: „Я ўсё жыццё аддаў слову. З прычыны яго я пакутаваў за кратамі. Я прынёс ахвяры на алтар слову. І як жа прыкра ўсведамляць, што яно стала непатрэбным. Мае браты-беларусы адракліся ад яго. Эх, ты маё недасягальнае слова! Навошта я мучыўся з табою? (Памятаю, што ў хвіліны прыгнечанасці таксама Сакрат Яновіч гаварыў: „а на чорта я дапешчваю кожнае роднае слова калі ў самой Беларусі вышэй цэняць „общчэпанятный язык").

Праўда, хаця і каратка, але ўсё ж у эміграцыі, у Празе, жыў знакаміты паэт, перакладчык і крытык – Уладзімір Жылка. У Празе з ім здарыўся надзвычай цікавы выпадак. Паэта, які хварэў на сухоты памылкова палічылі мёртвым. Незразумела чаму, пасля ўдзелу ў мінскай літаратурнай канферэнцыі ён вырашыў застацца ў савецкай Беларусі. Зрэшты, на сваю бяду, бо неўзабаве ён стаў перад судом, быў прысуджаны да ссылкі і ва ўзросце ўсяго 33 гадоў памёр на неабсяжных прасторах савецкай імперыі. Калі б застаўся ў Празе, мабыць напісаў бы яшчэ шмат цудоўных вершаў!

Тут варта хаця б адным сказам прыгадаць яшчэ аднаго эміграцкага паэта – Уладзіміра Клішэвіча. У 1937 годзе ён быў сасланы на Калыму, аднак з прычыны паўторнага разгляду яго справы паэт быў дастаўлены ў Мінск. Тут яго затрымала на радзіме вайна, а пасля вайны ён эміграваў на Захад і памёр у Лос Анджэ-

лес. Аднак гэты паэт, які першапачаткова востра асуджаў бальшавіцкія рэпрэсіі і калектывізацыю, раптам пачаў наведваць Беларусь, станоўча выказвацца пра тамтэйшыя парадкі, што выклікала хвалю крытыкі і астракізму ў эміграцкіх колах. Клішэвіч задумаў нават цалкам з’ехаць у Беларусь, аднак раптоўная смерць не дазволіла яму зрабіць гэтае глупства і пераканацца наколькі ён памыляўся ў сваіх ацэнках.

Таленавіты паэтам быў Алесь Салавей (сапраўднае прозвішча – Альфрэр Радзюк). Ва ўзросце ўсяго 22 гадоў ён апынуўся ў эміграцыі ў Берліне, затым у Празе, Вене і нарэшце ажно ў Аўстраліі. Выдаў усяго пару зборнікаў вершай і некалькі паэм пранізаных любоў’ю і сумам за Бацькаўшчынай, аднак крытыкі ставяць яго ў адным раду самых выдатных эміграцкіх творцаў, побач з Арсенневай і Сяднёвым. У сваю чаргу, паэт і празаік Янка Юхнавец увогуле дэбютаваў на чужыне. Фонд Крэчэўскага ўшанаваў памяць гэтага таленавітага літаратара ўстанаўляючы літаратурную прэмію яго імя. Яе ўручаецца 3 лістапада ў дзень нараджэння паэта.

Сваё месца ў гісторыі беларускай літаратуры занялі: Алесь Змагар (сапраўднае прозвішча Яцэвіч), Рыгор Крушына (Козак), Уладзімір Дудзіцкі, Міхась Кавыль (Язэп Лешчанка), Янка Золак (Антон Даніловіч), Анатоль Бярозка (Мацей Смаршчок), Пётра Сыч, Сяргей Хмара, Янка Запруднік. З ліку эміграцкіх празаікаў бадай найвышэй ацэньваецца творчасць Кастуся Акулы (Аркадзь Качан), хаця станоўчыя рэцэнзіі атрымлівалі таксама творы Уладзіміра Сядуры, Юркі Віцьбіча, Лявона Савёнка, Аляксандры Саковіч (Іна Рытар, Іна Каханоўская).

Эміграцыя і журба за Радзімай былі несумненна стымулам для творчасці найперш паэтаў і ўвогуле літаратару. У меншай ступені яны натхнялі да творчасці мастакоў. Аднак немалым прызнаннем карыстаўся мастак-імпрэсіяніст – Віктар Жаўняровіч. У прэстыжных галерэях выстаўлялі свае працы пераважна ўжо памерлыя:Уладзімір Шыманец, Івонка Сурвіла (Шыманец), Тамара Стагаловіч-Кольба, Пётр Міраповіч, Аляксандар Раманоўскі, Змітро Чайкоўскі, Ірына Рагалевіч а таксама скульптар Міхал Саўка-Міхальскі. У эміграцыі працавалі таксама знакамітыя кампазітары: Мікола Равенскі, Мікола Куліковіч-Шчаглоў, Эльза Зубковіч, Алесь Карповіч. Калі разыходзіцца пра спевакоў, дык найвялікшай славай карыстаўся Міхась Забэйда-Суміцкі. На яго помніку на Альшанскіх могілках у Празе знаходзіцца надпіс: „Пясняр беларускі... жыў песняй і песняй даваў людзям радасць”. „Беларускім салаў’ём” быў названы народжаны ўжо ў ЗША ў беларуска-ўкраінскай сям’і Багдан Андрусышын (Данчык), які зараз жыве і працуе ў Празе. Той самай „залатой Празе” якая прыняла ў мінулым гэтулькі знакамітых людзей і дзе зараз жыве немалая група прадстаўнікоў найноўшай хвалі палітычных эмігрантаў.

Адміністрацыйныя межы дзяржаў толькі зрэдку або і цалкам не супадаюць з месцам пастаяннага рассялення любога народу ці супольнасці. Падчас калі згуртаванні беларусаў у далёкім свеце можна назваць дыяспарай, гэта значыць прымусовым, спрычыненых экстраардынарнымі абставінамі расцярушваннем, дык памылкова часта гэтак акрэсліваецца беларусаў, якія спакон вякоў жывуць на сваёй зямлі. Тут маю на ўвазе дзясяткі тысяч этнічных беларусаў, грамадзян Польшчы, Літвы, Латвіі, Украіны і Расеі. Не паглыбляючыся ў падрабязнасці дастаткова сказаць, што на Беласточчыне і Віленшчыне, пачынаючы з часоў Вялікага Княства Літоўскага, цераз царскую Расею, Рэчапаспалітую Двух Народаў, ІІ Рэчапаспалітую да сённяшняга дня, не зважаючы на непазбежны працэс асіміляцыі і магутны прэсінг, беларускую нацыянальнасць дэкларуюць каля 50 тысяч чалавек. У падобных абставінах беларусамі лічыць сябе некалькі дзясяткаў жыхароў Літвы. Якой была б беларуская культура без Вільні незалежна ад таго, каму горад належаў? Як жа ўзбагацілі беларускую культуру такія людзі як Сакрат Яновіч (не памяншаючы ролі іншых творцаў). Калі разыходзіцца пра Яновіча, дык любіў ён Беларусь метафізічнай, узнёслай і чыстай любоўю як ідэю і ідэал, але пры гэтым не пераносіў ён, са шчэнтам русіфікаванай, савецкай Беларусі. З Гараденшчыны, за выключэннем сустрэч з літаратарамі, альбо наведвання Ларысы Геніюш у Зэльве ён вяртаўся прыгнечаны і расчараваны, асабліва тамтэйшым стаўленнем да беларускай мовы. З такой краінай немагчыма сябе атаясамліваць ці нават паважаць яе. Два гады таму гэта пацвердзіла Анна Ідзёр-Міранові у сваім даследаванні „Вобраз Рэспублікі Беларусь і беларусаў у свядомасці жыхароў усходняй часткі падляшскага ваяводства". Рэспандэнты, які дэкларавалі беларускую нацыянальнасць не атаясамліваюць сябе з беларускай дзяржавай як установай, аднак частка з іх называе Беларусь сваёй духоўнай Радзімай і радзімай продкаў". Наколькі вялікую паслугу аказваюць Беларусі такія мастакі як сусветнай славы Лявон Тарасэвіч, які не зважаючы на факт, што яго лічаць польскім мастаком, усё ж упарта падкрэслівае, што праўда, ён паходзіць з Польшчы, мае польскі пашпарт, але пачувае сябе беларусам. Калі нехта дасягне поспеху, прызнання і славы, як рэжысёр Тамара Саланевіч або пісьменніца Катажына Бонда, то факт што яны атаясамліваюць сябе з беларускасцю асабліва каштоўны і варты павагі, бо ён раўназначны са свайго роду гераізмам. Натуральна, такая пазіцыя не знаходзіць ніякага прызнання ў самой Беларусі, бо там, акрамя назвы, няшмат беларускага.

Значэнне сведчання славутасцей

Асабіста, я ніколі не быў прыхільнікам прысабечвання вялікіх імёнаў, хаця большасць людзей схільная падпраўляць сваю біяграфію і шукаць пацверджання сваёй

маніі велічы. Не ўхваляю таго, што з характэрнай для гэтай нацыі пачуццём велічы і лепшасці, палякі, не маргнуўшы вокам, лічаць сваімі, хаця і „крэсавымі" многіх выдатных людзей звязаных выключна з Беларуссю. Для мяне больш важнае не месца працы ці нараджэння, але тое кім сам чалавек лічыў сябе, з якой нацыянальнасцю і культурай ідэнтыфікаваўся. Бывае так, што нехта ўсё жыццё пражыў у Беларусі, але акрамя месца жыхарства, ён не мае нічога супольнага з краінай. Ён прыкладна адчуваў сябе грамадзянінам Савецкага Саюзу і працаваў на расейскую культуру. З другога боку, нельга недаацэньваць і таго факту, што такія людзі як Міцкевіч, Манюшка і Шагал выраслі на шматнацыянальнай, беларускай глебе. Хто ведае, ці некаторыя з выдатных людзей былі б такімі калі б нарадзіліся ў цалкам іншым месцы, у іншым асяроддзі. Акрамя таго я лічу, што для малой краіны, якая слушна ўспрыймаецца ў свеце як правінцыя або сатэліт Расеі проста неацэнным з'яўляецца тое, калі да сваіх беларускіх каранёў прызнаюцца такія людзі як Кірк Даглз, Гарысон Форд, Скарлет Ёгансон, Бэнджэмін Копман, Ліза Кудроў, Уэйн Грэцкі, Валянціна Церашкова. Кожны вялікі спартовец (як Вікторыя Азаранка), кожны спявак або вучоны (як Барыс Кіт), гэтак у мінулым як і зараз, якія падкрэсліваюць паходжанне або прынамсі беларускія карані, робяць вялікую паслугу краіне. Нават пераможца Эўравізіі Саша Рыбак нейкім чынам нагадвае пра музыкальную, пявучую Беларусь, якая многім амаль выключна асацыіруецца з лысым, вусатым, незаменным прэзідэнтам.

Роля Беларусістаў

Апрача эмігранцкіх творцаў і дзеячаў а таксама тых, якія на пастаяннай аснове жывуць у іншых краінах, амбасадарамі Беларусі ў свеце аказаліся многія беларусісты з прыкладна двух дзясяткаў краін свету. Гэта пераважна сур'ёзныя, аўтарытэтныя навукоўцы, якія з прычыны сваіх зацікаўленні рэгіёнам Усходняй Еўропы, нейкім чынам засяродзіліся якраз на Беларусі. Каля 600 вучоных энтузіястаў Беларусі з 23 краін згуртаваныя ў Міжнародным Таварыстве Беларусістаў створаным 27 гадоў таму трыма міністэрствамі і Акадэміяй Навук Беларусі. Таварыства арганізуе Кангрэсы на якіх выступаюць такія людзі як Арнольд МэкМілін і Джым Дынглі (Вялікая Брытанія), Тымоты Снайдэр (ЗША), Пол Сутэр (Швайцарыя), Адраш Зольтан (Вугоршчыны) Нікалай Нікалаеў (Расея) Рыгор Піўтарак (Украіна), Рышард Радзік (Польшча). Многія беларусісты нагэтулькі паглыбіліся ў беларускую тэматыку што вывучылі нават беларускую мову. Надзвычай цікавая асоба англійскага беларусіста Гайя Пікарда. Гэты выпускнік Сарбоны і Оксфарду, юрыст французска-англійскага паходжання меў цётку, хрышчаную жыдоўку, якая аднойчы завяла яго ў праваслаўны Сабор у Парыжы. Пікарда захапіўся царкоўнымі спевамі. Пазней,

будучы сакратаром Таварыства культурных сувязяў з савецкім Саюзам ён зацікавіўся і беларускай музыкай. З навуковай экспедыцыяй наведаў нават Падляшша, збіраў даўнюю царкоўную музыку і публікаваў яе. „Мы павінны адукаваць брытанцаў, расказваць ім пра Беларусь” – маўляў Пікарда. Акрамя музыкі ён цікавіўся Скарынам, беларускімі перакладамі Біблії і тэматыкай Вялікага Княства Літоўскага. Вартае падкрэслення тое, што Пікарда не цікавіўся палітыкай і гаварыў, што Беларусь яго цікавіць цалкам незалежна ад таго – хто зараз мае пры ўладзе ў Мінску.Фармальна не маючы нічога супольнага з Беларуссю, Пікарда з бэнэдыктынскай цярплівасцю, ціха і метадычна працаваў дзеля беларускай культуры не атрымліваючы за гэтай аніякай выгады ні матэрыяльнай карысці. Унікальны чалавек. Шкада, што адышоў у вечнасць 11 гадоў таму ва ўзросце 76 гадоў.
Апрача Таварыства Беларусістаў існуе яшчэ падобная арганізацыя, ці лепш сказаць праграма, праект. Гэта беларуска-літоўская ініцыятыва Міжнародны Кангрэс Даследчыкаў Беларусі. Кангрэс гуртуе каля 500 даследчыкаў і аналітыкаў, экспертаў і прадстаўнікоў грамадзянскай супольнасці а таксама ўрадавых і няўрадавых арганізацыі, якія займаюцца палітыкай, грамадствам і культурай Беларусі. Кангрэс гуртуе шырокае кола спецыялістаў з Беларусі, Еўразвязу, асабліва Польшчы і Літвы, Украіны, Расеі, ЗША ды іншых краін. Прэміі, якія ўручаюцца за найлепшыя працы з розных галін з'яўляюцца штуршком для студэнцкай моладзі каб зацікавіцца беларускай тэматыкай.

Сакрат Яновіч быў гарачым патрыётам Беларусі, насіў Беларусь у сэрцы хаця і жыў паза БССР і Рэспублікай Беларусь, у сваёй малой Радзіме. Апрача таго што напісаў і апублікаваў, ён шмат сказаў пра Беларусь, беларусаў у краіне і паза межамі ў прыватных гутарках з сябрамі. Спадзяюся і чакаю, што ў якасці развіцця і ўзбагачэння гэтага пралогу будуць прыведзеныя яго незабыўныя словы.

Кастусь Бандарук
Васількаў, жнівень 2018





IDEA NIE ZNA GRANIC

Temat tegorocznego Trialogu jest rozmyślnie wieloznaczny. Rzecz w tym, że niejednoznaczne jest samo angielskie pojęcie „outside", które różni się od pojęcia „abroad". Zasadniczo to pierwsze oznacza kogoś albo coś „poza czymś" „na zewnątrz", „osobno", „na uboczu". W języku białoruskim zresztą podobnie w polskim jakkolwiek wymawianym z angielska, pojęcie „autsajder" zdecydowanie skłania się ku określeniu czegoś, co „odstaje", „nie nadąża", „nie pasuje", „nie odpowiada" pewnej całości lub kategorii. Tak więc w sporcie autsajderem jest zawodnik najsłabszy, ostatni w klasyfikacji, ten, który został odrzucony i wyłączony z dalszego współzawodnictwa. Natomiast w socjologii jest to człowiek, który egzystuje na marginesie społeczeństwa jako nieudacznik, wyrzutek, albo ktoś nieprzystający do ogółu społeczeństwa. Dla mnie temat „Białoruś na zewnątrz" przywodzi na myśl kilka kwestii, na których chcę się skupić. W moim przekonaniu temat wskazuje na:

– istnienie licznej, białoruskiej emigracji i diaspory;

– przywodzi na myśl pewien stopień obecności i aktywności Białorusinów oraz ich kultury w świecie;

– sugeruje fakt, że Białoruś promują w świecie zarówno jej dawni, jak i obecni wielcy ludzie w najrozmaitszych dziedzinach;

– Białoruś jest przedmiotem bezinteresownego zainteresowania i studiów ze strony wielu renomowanych entuzjastów – białorusistów z kilkunastu ważnych krajów świata;

– za sprawą swego politycznego wyboru kraj jest autsajderem w wielu dziedzinach, pozostaje mało znaczącym i mało znanym, zmarginalizowanym wyrzutkiem i pariasem.

Odwieczne zjawisko migracji

Gdy w przypadku kraju lub narodu mówimy o jego miejscu w świecie, to automatycznie zakładamy, że nie ogranicza się on tylko do konkretnego terytorium. Tu siłą rzeczy nasuwa się kwestia rozproszenia i migracji. Pod pojęciem migracji rozumie się imigrację, emigrację i reemigrację oraz repatriację. Jako proces przemieszczeń i zmiany miejsca zamieszkania, wyjazdu z miejsca pochodzenia i przyjazdu do miejsca przeznaczenia, migracja dotyczy wszystkich bez wyjątku krajów świata. Różna może być natomiast skala tego zjawiska. W przypadku tak niewielkiego kraju, jak Białoruś, z niespełna 10 milionami mieszkańców, skala zjawiska emigracji jest bardzo duża i sięga co najmniej 1/4 ludności. Jest to zasadniczy powód, dla którego nie sposób pominąć tego zagadnienia i wręcz wypada poświęcić temu więcej uwagi. Najwięcej Białorusinów mieszka w Rosji, USA, Ukrainie, Polsce, Australii oraz Izraelu. Oprócz samej Republiki Białoruś, gdzie Białorusini stanowią 4/5 ludności, liczne ich skupiska znajdują się na Białostocczyźnie, Wileńszczyźnie, w przygranicznych rejonach Łotwy, Rosji i Ukrainy. Oczywiście, nie są to emigranci, lecz autochtoni mieszkający od wieków na tych terenach. W dużym zaokrągleniu można powiedzieć, że poza granicami obecnej Republiki Białoruś mieszka od 2 do 3,5 milionów ludzi w jakiś sposób związanych z Białorusią. Obecnie, poza granicami kraju żyje i pracuje około miliona, głównie zarobkowych, emigrantów z czerwonozielonym paszportem. Dość powiedzieć, że tylko w 2017 roku polskie konsulaty wydały Białorusinom 35 tysięcy wiz pracowniczych. Według badań socjologicznych, ponad połowa młodych Białorusinów, do lat 30., marzy o wyjeździe za granicę, a jeżeli tkwi na miejscu, to dlatego, że po prostu nie ma możliwości wyjazdu. Natomiast ludzie starsi nie są skłonni do zmiany miejsca zamieszkania z przyczyn obiektywnych. Na nich nikt nigdzie nie czeka i nikomu oni nie są już potrzebni.
Przyczyny emigracji bywają:
– ekonomiczne, związane z poszukiwaniem lepszego życia, umownie mówiąc – „za chlebem";
– polityczne, wynikające z prześladowań opozycji politycznej. Świat przyjął zasadę, że każdy, kto udowodni prześladowanie, zasługuje na prawo azylu, czyli zgodę na stały pobyt i opiekę ze strony obcego państwa. Wielu Białorusinów opuściło kraj po wyborach 2010 roku;
– są też religijne migracje, z terenów objętych tymi problemami do krajów tolerancji religijnej lub do krajów, gdzie dane wyznanie jest dominujące;

– natomiast wojenne migracje związane są ze zbrojnymi konfliktami w obawie przed utratą życia.

Od dobrego się nie ucieka

W przypadku białoruskiej emigracji zwykło się ją tłumaczyć głównie skądinąd naturalnym i zrozumiałym poszukiwaniem „chleba, woli i doli", czyli większego dobrobytu, więcej wolności oraz ogólnej poprawy swego bytu. Każda wojna, powstanie, okupacja albo głód skłaniały ludzi do opuszczenia swej ojczyzny. Najbardziej masowa emigracja Białorusinów – 1,5 miliona ludzi, przypada na koniec XIX – początek XX wieku. Kolejna wielka fala to emigracja około ćwierć miliona ludzi z zachodniej Białorusi w latach 20. i 30. XX wieku Sowiecki okres oznaczał dla Białorusinów straszliwe represje, zsyłki, przymusowe przesiedlenia. Następna wielka fala to koniec II wojny światowej. Powojenne lata przyniosły masową emigrację białoruskich Żydów, natomiast ostatnie 20 lat – emigrację polityczną.

W pewnym sensie każdą migrację można uznać za „przymusową", gdyż każda wskazuje na jakiś stopień niespełnienia, niezaspokojenia istotnych potrzeb życiowych, a to powoduje niełatwą decyzję o wyjeździe. Ludzie decydują się przenieść gdzie indziej, ponieważ ich ważne, wręcz podstawowe pragnienia i ambicje nie są należycie zaspokojone w dotychczasowym miejscu. Decydując się na wyjazd za granicę, emigrant motywowany jest głównie obiektywnymi warunkami rozwoju w ojczyźnie i porównuje je z warunkami, jakie spodziewa się zastać na emigracji. Oczywiście, wskutek migracji kraje, z których się wyjeżdża, zawsze tracą siłę roboczą oraz znaczny potencjał intelektualny. Zyskują je kraje, które imigrantów przyjmują i te z reguły są najbogatsze. Krajem, który od co najmniej 100 lat selekcjonuje imigrantów według ich przydatności są Stany Zjednoczone. Obecnie bardzo skrupulatnie „przesiewa" imigrantów również Australia.

Plusy i minusy emigracji

Jeżeli generalnie nie ucieka się od dobrego i szczęśliwego życia i każda emigracja jest w jakimś stopniu przymusowa, to jej skutki należałoby rozpatrywać szerzej aniżeli tylko w kategoriach straty lub pozyskania siły roboczej i potencjału intelektualnego. Zasadniczo, socjologowie formułują cztery opcje, które najczęściej przydarzają się wszystkim bez wyjątku emigrantom po ich przybyciu do dowolnego kraju:

– asymilacja, czyli całkowite odrzucenie swojego ojczystego języka, doświadczeń kulturowych, oraz więzi z byłymi rodakami. Ta sytuacja ciągnie za sobą pełną i bezwarunkową akceptację modelu życia i kultury nowej Ojczyzny. Potomkowie Białorusinów, którzy przybyli do Ameryki ponad 100 lat temu często nawet nie wiedzą, skąd pochodzili ich

biedni i niepiśmienni pradziadkowie. Nawet ich nazwiska mogące sugerować narodowość uległy całkowitej zmianie lub zniekształceniu.
– separatyzm albo pragnienie, aby zachować jak najwięcej z tradycji i wartości swojej ojczyzny. Powoduje to życie w obcym kraju w swojej małej grupie, w swoistym getto. Fanatyczne uwielbienie dla własnej kultury i bezustanne podkreślanie swej odmienności wyklucza z pełnego udziału w funkcjonowaniu danego państwa. Jeżeli separatyzm jest ponadto połączony z przekonaniem o wyższości swej kultury i religii oraz z pogardą dla swobody obyczajów w danym kraju, jest to znakomita pożywka w szczególności dla ekstremizmu islamskiego.
– integracja, czyli próba połączenia najlepszych cech, które były w kulturze swej prawdziwej Ojczyzny i tych, które są w kulturze kraju osiedlenia. Jest to pożądane przeciwieństwo separatyzmu, jednak polityka wielokulturowości, przynajmniej w Europie Zachodniej, nie zdała egzaminu.
– marginalizacja lub odrzucenie obydwu kultur, stopniowa degradacja osoby i stan sieroctwa społecznego. Jest to najtragiczniejszy skutek emigracji, kiedy człowiek trwa w stanie izolacji, bo jedno stracił a drugiego nie pozyskał. Wielu takich nieudaczników znalazło się wśród wielonarodowościowych grup meneli.
W przypadku emigrujących Białorusinów, jeżeli nie chodzi o czasową pracę zarobkową w sąsiednich krajach, niemal w 100% ulegają oni albo asymilacji, albo integracji. Tak było w przeszłości i tak jest obecnie. W przeważającej większości wypadków zasadniczy cel emigracji zostaje osiągnięty. Za granicą żyje się dostatniej, spokojniej, stabilniej i bezpieczniej. Jest wiele możliwości samorealizacji. Owszem, na początku są trudności z adaptacją do nowych realiów, jest dojmująca tęsknota za krajem, rodziną, bywają rozbite rodziny, rozwody, ulegają zerwaniu dawne więzi międzyludzkie. Jednak z czasem poczucie tych strat staje się mniej dokuczliwe i wreszcie całkiem zanika, zwłaszcza gdy ktoś ma możliwość odwiedzin rodziny i kraju ojczystego. Jednak właśnie dla tego kraju ci wyjeżdżający są z reguły ludźmi straconymi, ponieważ powroty z emigracji, jeżeli to nie był tylko wyjazd w celu podreperowania budżetu domowego, są rzadkie.
Cztery lata temu, 16 czerwca 2014 roku, po 15 latach konsultacji, Białoruś wreszcie przyjęła ustawę „o Białorusinach za granicą". Władze liczyły na to, że emigranci będą ambasadorami Białorusi w świecie, że będą sprzyjać lepszemu wizerunkowi kraju na świecie, ożywieniu handlu z nią oraz inwestycjom zagranicznym. W zamian prezydent, rząd, poszczególne ministerstwa obiecywali sprzyjać zachowaniu przez emigrantów ojczystego języka i kultury. Dokument jest słaby, nieprzemyślany i czysto deklaracyjny. Rzecz w tym, że podobnie jak to było za sowieckich czasów, stosunek do emigrantów na Białorusi Łukaszenki jest niechętny i nieufny, jak do dysydentów, ludzi obcych ideowo. Ten dokument jest niewart papieru, na którym go wydrukowano. Kraj nie może pomagać w zachowaniu białoruskości za granicą, skoro na miejscu zajmuje się czymś zgoła

przeciwnym. Ponadto, emigracja białoruska jest słabo zorganizowana, relatywnie raczej nadal biedna i pozbawiona wpływów, czego nie da się powiedzieć na przykład o Żydach z Białorusi. Po drugie, jeżeli ktoś w ciągu ostatnich 25 lat wyjechał za chlebem albo ze względów politycznych, to raczej nie zechce mieć do czynienia z krajem nadal biednym i nadal rządzonym przez tego samego człowieka. Wielu wyjechało właśnie z jego powodu. Tak więc dla Białorusinów ta prawdziwa, rzeczywista emigracja jest zasadniczo podróżą w jedną stronę.

Bezideowość równa się wynarodowieniu

Wszyscy bez wyjątku badacze emigracji białoruskiej są zgodni co do jej nikłej świadomości narodowej. W przeszłości, w sytuacji, gdy nie było własnego państwa narodowego, nie było się z czym utożsamiać. W takich warunkach każdy wybitny Białorusin automatycznie był uważany za Rosjanina, Polaka albo Żyda. Na emigracji Białorusini dołączali do liczniejszych i lepiej zorganizowanych Rosjan, Polaków i Ukraińców. Z tymi ostatnimi po dziś dzień panuje największa zgoda, przyjaźń i zrozumienie. Wszyscy, którzy wyjechali za granicę przed początkiem pierwszej wojny światowej, często jako małopiśmienni chłopi, wyłącznie „za chlebem", błyskawicznie zasymilowali się i znikli jako odrębna grupa etniczna. Jak pisał emigracyjny działacz polityczny – Zianon Paźniak, niegdyś cała 14. ulica na Manhattanie rozmawiała po białorusku. Jednak ci słabo wykształceni chłopi i robotnicy roztopili się w amerykańskim tyglu już w pierwszym pokoleniu, stali się „nawozem historii, surowcem dla biologicznego i genetycznego istnienia Amerykanów, konsumenckim rynkiem dla innych". Również w okresie międzywojennym, polityczna emigracja koncentrowała się w ośrodkach bliżej kraju, w Czechosłowacji, w Łotwie i na Litwie, natomiast ta zarobkowa, chłopska emigracja podążała dalej na zachód, głównie do obu Ameryk. W 1921 roku w Nowym Jorku powstał Białoruski Komitet Narodowy i Białoruskie Biuro Prasowe, natomiast 1923 roku w Chicago – Białorusko-Amerykańskie Stowarzyszenie Narodowe. Jednak efekt ich pracy był mizerny. Nie zdołały one pobudzić diaspory do aktywności politycznej. Niestety, przy nikłej świadomości narodowej, bez szacunku dla swego języka, bez solidarności etnicznej i więzi ze starą ojczyzną, wobec słabej konsolidacji i organizacji, nieliczne białoruskie gazety i organizacje nie przetrwały próby czasu.

Całkowicie inna była powojenna emigracja w połowie lat 40. Pod koniec i po zakończeniu wojny, w Europie Zachodniej znalazło się około 300 tysięcy Białorusinów, z reguły żarliwych patriotów, ludzi przeważnie młodych i aktywnych. Jeżeli część z nich współpracowała z Niemcami, co bezustannie się im wypomina, to trzeba wiedzieć, że robili to wyłącznie z patriotycznych motywów, w nadziei, wprawdzie naiwnej i złudnej, na utworzenie niezależnej Białorusi. Z obozów dla osób przesiedlonych trafili oni w większości

do Wielkiej Brytanii, USA, Kanady i Australii. Wszak nie mogli wrócić do sowieckiej Białorusi na pewną śmierć. Tam w krajach osiedlenia stworzyli oni prężne organizacje jak „Stowarzyszenie Białorusinów Wielkiej Brytanii", „Białorusko-Amerykańskie Stowarzyszenie" albo „Białoruski Związek Młodzieży w Kanadzie". Niektóre z organizacji emigranckich utworzonych tuż po wojnie albo w późniejszych latach działają po dziś dzień.

Obecnie, co najmniej 44 organizacje dość aktywnie działają w 24 krajach: Argentynie, Australii, Bułgarii, Belgii, na Węgrzech, w Szwajcarii, Estonii, Szwecji, Czechach, Francji, Uzbekistanie, Ukrainie, Rosji, Polsce, Mołdowie, Litwie, Łotwie, Kanadzie, Kazachstanie, Izraelu, USA, Gruzji, Niemczech, Wielkiej Brytanii. W szczególności Białoruski Związek w Polsce istniejący od 25 lat jest federacją 7 mniejszych organizacji. W Kanadzie znajduje się białoruski rząd na uchodźstwie – Rada Białoruskiej Republiki Ludowej powstałej 100 lat temu. Absolutnie unikalną instytucją jest Białoruska Biblioteka i Muzeum im. Franciszka Skaryny w Londynie, gdzie zgromadzono 40 tysięcy tomów książek, gazet i czasopism.

Jednak przyszłość tych organizacji jest niepewna ze względu na to, że stara emigracja odchodzi do wieczności a ostatnia fala imigrantów z Białorusi to z reguły całkiem inni ludzie. Owszem, są przeważnie wykształceni i obrotni, ale białoruskości w nich niewiele. Przewodniczący Federalnej Rady Białorusinów Australii – Jauhien Hrusza uważa, że nowych imigrantów Białoruś prawie nie interesuje. „Ich interesują dolary. Wszyscy są zrusyfikowani, uważają, że Białoruś nie może istnieć bez Rosji. Jakże możemy im przekazać ster kierowania naszymi organizacjami?" uważa Jauhien Hrusza.

Jednak zupełnie inaczej myśli Pawał Siewiaryniec. „Emigracja to destylacja białoruskości do czystości łzy. W obcym środowisku, bez oparcia w postaci ojczystej ziemi, bez materialnych domieszek, ideał dalekiej Białorusi staje się wyjątkowo wzniosły, jasny i w ostateczności – duchowy". Z moich osobistych doświadczeń wynika, że emigracja zwłaszcza bez możliwości powrotu, często wzbudza patriotyczne uczucia u ludzi dotychczas niepoczuwających się do białoruskości. Na obczyźnie, przynajmniej w stosunkowo dalekiej Ameryce, istnieje silna potrzeba identyfikacji, utożsamienia się z jakimś narodem, jakąś większą grupą, chociaż niekoniecznie z państwem.

Co emigracja dała Białorusi?

Mimo iż stosunek do emigracji w kraju przez całe dziesięciolecia był wrogi i nadal pozostaje nieufny, trochę wzgardliwy, raczej nieprzyjazny jak do dezertera, renegata, albo kogoś, kto poszedł na łatwiznę, to emigranci niezwykle ubogacili kulturę białoruską, rozsławili ją i sam kraj w świecie. Potwierdzeniem uznania tej roli dla kultury jest reakcja na zbiór wierszy Natalii Arsienniewej „Pod błękitnym niebem". W czasopiśmie „Po-

łymia" w 1927 roku krytyk pisał: „Natalia Arsieniewa nie jest naszą, sowiecką poetką, ale należy ona do literatury białoruskiej niezależnie od miejsca jej powstania, wchodzi w ogólny nurt białoruskiego rozwoju kulturalnego". Wiele powiedział o twórczości poza granicami kraju Barys Saczanka w swej książce „Emigracja białoruska" wydanej w 1991 roku w Mińsku. Jednak w znacznej mierze książka ta skażona jest starym, mocno zakorzenionym sowieckim uprzedzeniem do emigracji. Autor dość nisko ocenia talent większości twórców emigracyjnych, co stawia kwestię, czy aby co nieco przeczytał, ale podstawowych faktów nie przeinacza. Saczanka słusznie uważał, że zasługa emigracji najbardziej widoczna była w dziedzinie literatury i wydawnictw. Kiedy w 1867 roku władze carskie zabroniły pisać i wydawać po białorusku, zaczęły one wychodzić z druku Londynie, Paryżu i Krakowie. Wymienia on bardzo wielu białoruskich poetów i prozaików, uczonych, śpiewaków, kompozytorów oraz innych, którzy żyli albo nadal żyją na emigracji. Ich spuścizna jest niewątpliwie ważną częścią kultury białoruskiej, jakkolwiek w Ojczyźnie mało zbadaną i niedostatecznie docenioną. Warto wspomnieć, że Instytut Białoruskiej Historii i Kultury wydaje cykl broszur pod nazwą „100 znakomitych działaczy kultury białoruskiej". Przyznaję, że w moim odczuciu, w przypadku niektórych znakomitości ich związek z kulturą białoruską jest nikły lub mocno naciągnięty. Jako obywatele Imperium Rosyjskiego i często wywodzący się z polskich rodów szlacheckich pracowali oni przeważnie na rzecz kultury rosyjskiej lub polskiej. Osobiście uważam, że samo miejsce urodzenia albo pewien okres działalności na terytorium Białorusi, jak również zainteresowanie tematyką białoruską, nie świadczą o białoruskości tych ludzi. Uważam, że wśród wybitnych postaci obowiązkowo powinni się znaleźć wcześniejsi niż Franciszek Skaryna, na przykład Eufrozyna Połocka, święta mniszka prawosławna z XII wieku, otaczana na Białorusi wielką czcią, pierwsza kobieta-święta na wschodniosłowiańskim obszarze. Również w XII wieku, żył wybitny, prawosławny biskup Cyryl Turowski zwany „ruskim Złotoustym". Wielce zasłużony dla kultury białoruskiej jest Szymon Budny, autor białoruskiego przekładu Katechizmu z 1562 roku. Kontynuatorami dzieła Skaryny byli Wasil Ciapiński, przedstawiciel starobiałoruskiej literatury polemicznej doby reformacji oraz święta prawosławna, księżna Zofia Słucka.

Tym nie mniej, samo miejsce urodzenia zostało potraktowane jako wyznacznik przynależności do narodu przez amerykański Panteon światowych znakomitości według uwagi poświęconej im w mediach elektronicznych. W dwudziestce znalazły się takie postaci jak Adam Mickiewicz, izraelski polityk Szymon Perez, sowiecki psycholog Lew Wygotskij, malarz Marc Chagall, izraelski polityk Menachem Begin, wielki książę litewski i król polski Stanisław August Poniatowski, sowiecki rewolucjonista i działacz bolszewicki Feliks Dzierżyński, naukowiec i lider ruchu syjonistycznego Chaim Weizman, polski reporter i pisarz Ryszard Kapuściński, sowiecki dyplomata Andrej Hramyka, amerykański ekonomista Simon Kuzniets, poeta Janka Kupała, Ossip Zadkine, francuski rzeźbiarz, ame-

rykański kompozytor Irving Berlin, malarz i scenograf Leon Bakst, prezydent Białorusi Aleksandar Łukaszenka, francuski malarz-ekspresjonista Chaim Soutine, polityk izraelski Icchak Shamir, izraelski działacz społeczny Eliazar Ben-Yehuda, izraelski pisarz i polityk Zalman Shazar. Z pochodzenia Żydem był również urodzony w guberni witebskiej białoruski i sowiecki rzeźbiarz Zair Azgur. Z wyższego spisu wynika, że ziemia białoruska najbardziej przysłużyła się Izraelowi a wiele znakomitości urodzonych w Białorusi jest pochodzenia żydowskiego, mimo iż wzbogacili oni kulturę innych krajów.

Jeżeli przyjąć inną metodologię i punkt widzenia, to do najwybitniejszych postaci związanych z Białorusią należy zaliczyć w szczególności Tadeusza Kościuszkę, wielce zasłużonego zarówno dla Polski, jak i Stanów Zjednoczonych. Ignacy Domeyko, wielki uczony, bohater narodowy Chile, urodził się na Grodzieńszczyźnie i pierwsze 30 lat spędził w kraju. Wielki geolog i badacz Syberii – Jan Czerski młodość także przeżył na rodzinnej Witebszczyźnie. Z tego samego regionu pochodził wybitny sowiecki konstruktor – Paweł Suchoj. Natomiast urodzony w Mohylowie Mikołaj Sudziłowski (Nicholas Russel) urodził się w Mohylewie i tu spędził młodość, zanim ruszył w świat i dotarł aż do Hawajów.

Z drugiej strony należy pamiętać, że większość wielkich Białorusinów nie była przykuta na całe życie do miejsca swego urodzenia i miała mniejsze lub większe doświadczenie emigracyjne. Poczynając od wielkiego Franciszka Skaryny i kończąc na współczesnych takich jak laureatka nagrody Nobla Swiatłana Aleksijewicz, polityk, działacz społeczny i literat Zianon Pazniak albo wielki pisarz Wasil Bykau, bardzo wiele znakomitości przez jakiś czas żyło albo nadal żyją poza granicami kraju. Dla wielu emigracja do bliższej lub dalszej zagranicy była życiową koniecznością albo wręcz wybawieniem od śmierci, lub zniewolenia. Dla jeszcze innych emigracja dała niezbędne warunki do życia i rozwoju ich talentu. Byli ludzie, którzy za nic w świecie nie chcieliby przejść na język rosyjski. Ich talent bez emigracji zostałby zaprzepaszczony.

Wiek XX przyniósł Białorusi pewną formę państwowości jednak ze wszystkimi perturbacjami wynikającymi z połowiczności i niespełnieniania dążeń narodowościowych. Na krótko pojawiła się Białoruska Republika Ludowa, po niej BSSR i zachodnia Białoruś w składzie Polski. Udziałem wybitnych Białorusinów urodzonych w końcu XIX i początku XX wieku stało się nie tylko odrodzenie okresu Naszej Niwy, lecz także dramat rewolucji, bolszewickie i sanacyjne represje, dwie wojny światowe i wielki exodus najaktywniejszej części społeczeństwa.

Ilustracją pogmatwanych losów tego okresu był w szczególności Jazep Hermanowicz (pseudonim Wincuk Adważny), duchowny katolicki, poeta i prozaik, autor biograficznej książki „Chiny, Syberia, Moskwa" oraz „Jak Hanula wybierała się do Argentyny". Znakomita poetka i działaczka ruchu narodowego – Łarysa Hieniusz młodość przeżyła na Grodzieńszczyźnie, 11 lat mieszkała w Pradze, 9 lat spędziła w sowieckich łagrach

i zmarła w 1983 roku w Zelwie. Gdyby nie jej emigracja pewnie nie byłoby przepełnionego nostalgią za rodzinnymi stronami zbioru wierszy „Z rodzinnych poletek" (Ad rodnych niu) i gdyby nie dramatyczne losy pewnie jej utwory nie byłyby tak odważne i pełne hartu ducha wraz z kobiecą wrażliwością i ciepłem. Większość swego długiego życia, ponad pół wieku, przeżyła na emigracji Natalia Arsienniewa (1903–1997), poetka, dramaturg i tłumaczka, emigracyjna działaczka kulturalno-oświatowa. W jej twórczości, zarówno, gdy podejmuje tematy z historii, jak Powstanie Słuckie albo postać Franciszka Skaryny, dominują motywy patriotyczne, filozoficzne i mistyczne. Jej wiersz „Mahutny Boża" po dziś dzień jest traktowany jako duchowy hymn Białorusi. Jej talent został doceniony nawet w sowieckiej Białorusi, co jest dowodem najwyższego uznania. Jako drugiego według talentu i dorobku wśród emigracyjnych twórców wymienia się poetę, prozaika i tłumacza Masieja Siadniowa. Jak wielu późniejszych emigrantów debiutował on w okresie międzywojennym, ale jego najważniejsze utwory, w szczególności traktujące o swych przeżyciach w więzieniach i łagrach, powstały już w USA. Jego powieści o zbrodniach komunizmu z pewnością nie ukazałyby się inaczej jak tylko na obczyźnie. Siadniou ubolewał nad rusyfikacją Białorusi i w roku 1988 pisał: „Ja całe swe życie oddałem słowu. Z jego powodu cierpiałem za kratami. Złożyłem ofiary na ołtarzu słowa. I jakże przykro jest uświadamiać, że stało się ono niepotrzebne. Bracia-Białorusini wyrzekli się go. Och, ty, moje niezgłębione słowo. Po co ja męczyłem się z tobą?". (Pamiętam, że w chwilach największego rozżalenia również Sokrat Janowicz mawiał: „a po diabła ja dopieszczam każde słowo ojczyste, skoro w samej Białorusi wyżej się ceni ‚obszczepaniatnyj jazyk' ").

Wprawdzie krótko, ale również na emigracji, w Pradze, żył znakomity poeta, tłumacz i krytyk Uładzimir Żyłka. W Pradze miał miejsce niezwykle interesujący epizod, gdy poetę chorującego na suchoty uznano za zmarłego. Nie wiedzieć czemu po konferencji w Mińsku Żyłka postanowił zostać w bolszewickiej Białorusi. Na swoją zgubę, bo skazany na zsyłkę zmarł w wieku zaledwie 33 lat. Gdyby został w Pradze, pewnie napisałby jeszcze wiele wspaniałych wierszy. Tu warto wspomnieć jeszcze jednego poetę emigracyjnego Uładzimira Kliszewicza. W 1937 roku był zesłany aż na Kołymę, ale z powodu powtórnego rozpatrywania jego sprawy znalazł się w Mińsku, gdzie zastała go wojna. Po wojnie wyemigrował na zachód i zmarł w Los Angeles. Jednak ten poeta, który początkowo ostro potępiał bolszewickie represje i kolektywizację, raptem zaczął odwiedzać Białoruś, pozytywnie wypowiadać o tamtejszej rzeczywistości i nawet zamierzał powrócić z emigracji, co wywołało falę krytyki i ostracyzm w środowisku emigranckim. Gdyby nie niespodziewana śmierć, pewnie by wrócił i przekonałby jak bardzo się mylił w swej ocenie.

Utalentowanym poetą był Aleś Saławiej (prawdziwe nazwisko Alfred Radziuk). W wieku zaledwie 22 lat znalazł się na emigracji w Berlinie, Pradze, Wiedniu i wreszcie w Australii.

Wydał zaledwie kilka zbiorów wierszy i poematów przepełnionych miłością i tęsknotą do Ojczyzny, ale krytycy stawiają go w jednym rzędzie najwybitniejszych twórców emigracyjnych z Arsienniewą i Siadniowem. Z kolei poeta i prozaik Janka Juchnawiec w ogóle debiutował na emigracji. Fundacja Kreczeuskiego uszanowała pamięć tego zdolnego literata, który nie wszystko napisane wydał, ustanawiając Premię Literacką jego imienia. Wręcza się ją 3 listopada w dniu urodzin poety. Swoje miejsce w historii literatury białoruskiej zajęli: Aleś Zmahar (prawdziwe nazwisko – Jacewicz), Ryhor Kruszyna (Kozak), Uładzimir Dudzicki, Michaś Kawyl (Jazep Leszczanka), Janka Zołak (Anton Daniłowicz), Anatol Biarozka (Maciej Smarszczok), Piatro Sycz, Siarhiej Chmara, Janka Zaprudnik. Z grona emigracyjnych prozaików najwyżej ceniona jest twórczość Kastusia Akuły (Arkadź Kaczan), ale pozytywnie oceniane także utwory Uładzimira Siadury, Jurki Wićbicza, Lawona Sawionka, Aleksandry Sakowicz (Ina Rytar, Ina Kachanouskasja).
O ile emigracja i tęsknota za Ojczyzną były natchnieniem dla wielu poetów, to w mniejszym stopniu dla artystów. Jednak znacznym uznaniem cieszył się malarz-impresjonista Wiktar Żauniarowicz. W znanych galeriach wystawiali swe prace przeważnie już zmarli: Uładzimir Szymaniec, Iwonka Surwiła (Szymaniec), Tamara Stahałowicz-Kolba, Piotr Miranowicz, Alaksandar Ramanouski, Zmitro Czajkouski, Iryna Rahalewicz, oraz rzeźbiarz Michał Sauka-Michalski. Na emigracji tworzyli znakomici kompozytorzy: Mikoła Rawienski, Mikoła Kulikowicz-Szczahłou, Elza Zubkowicz, Aleś Karpowicz. Jeżeli zaś chodzi o śpiewaków, to największą sławą cieszył się Michaś Zabejda-Sumicki. Na jego pomniku na Olszańskim cmentarzu w Pradze widnieje napis „Pieśniarz białoruski... żył pieśnią i pieśnią dawał ludziom radość". „Białoruskim słowikiem" nazwany został, urodzony już w USA syn białorusko-ukraińskich emigrantów, Bahdan Andrusyszyn (ps. Danczyk), który obecnie mieszka i pracuje również w Pradze. Tej samej „złotej Pradze", która przyjęła w przeszłości tylu wspaniałych ludzi i gdzie obecnie mieszka liczna grupa z ostatniej fali emigracji politycznej.

Białorusini – autochtoni poza Białorusią

Granice administracyjne państw rzadko, a raczej wcale nie pokrywają się z miejscem stałego osiedlenia przedstawicieli dowolnego narodu lub wspólnoty. O ile skupiska Białorusinów w świecie można nazwać diasporą, czyli przymusowym lub wymuszonym przez jakieś okoliczności rozproszeniem, o tyle często mylnie określa się tak Białorusinów od wieków mieszkających na swojej ziemi. Mam na myśli dziesiątki tysięcy obywateli Polski, Litwy, Łotwy, Ukrainy i Federacji Rosyjskiej. Aby szczegółowo nie zagłębiać się tę tematykę, dość powiedzieć, że na Wilenszczyźnie i Białostocczyźnie od wieków, poczynając od czasów Wielkiego Księstwa Litewskiego przez Rzeczpospolitą Obojga Narodów, carskie panowanie, II Rzeczpospolitą, do chwili obecnej mieszkają etniczni

Białorusini. W Polsce według ostatniego spisu powszechnego narodowość białoruską nadal, pomimo nieubłaganej asymilacji i potężnej presji, deklaruje około 50 tysięcy osób i w podobnych warunkach niemal tyle na Litwie. Czym byłaby kultura białoruska bez Wilna, niezależnie od tego, do kogo to miasto należało? Jakże ubogacili kulturę białoruską tacy polscy Białorusini jak Sokrat Janowicz, nie umniejszając znaczenia twórczości innych literatów. Jeżeli chodzi o Janowicza, to kochał on Białoruś metafizyczną miłością jak ideę i ideał, ale nie cierpiał on zrusyfikowanej do szpiku kości sowieckiej Białorusi. Z Grodzieńszczyzny, z wyjątkiem spotkań z literatami, np. pobytu w Zelwie u Łarysy Hieniusz, Janowicz wracał przygnębiony i rozczarowany zwłaszcza tamtejszym stosunkiem do języka białoruskiego. Z takim krajem niełatwo jest utożsamiać się, lubić go albo przynajmniej szanować go. Dwa lata temu potwierdziła to Anna Idzior-Mironowicz w swej książce „Obraz Republiki Białoruś i Białorusinów w świadomości mieszkańców wschodniej części województwa podlaskiego". „Respondenci, którzy zadeklarowali narodowość białoruską nie utożsamiają się z państwem białoruskim jako instytucją, jednak przez część z nich Białoruś nazywana jest duchową ojczyzną lub ojczyzną przodków" – konkluduje ona. Jak wielką przysługę okazują Białorusi tacy artyści jak Leon Tarasewicz, który będąc uważanym za polskiego malarza wciąż uparcie podkreśla, że owszem, pochodzi z Polski i ma polski paszport, ale czuje się Białorusinem. Jeżeli ktoś osiągnie sukces, uznanie i sławę, jak reżyser Tamara Sołoniewicz albo pisarka Katarzyna Bonda, ich utożsamianie się z białoruskością jest szczególnie cenne i godne uznania, bo jest to równoznaczne ze swego rodzaju heroizmem. Oczywiście, ta postawa nie znajduje uznania w samej Białorusi, bo prócz nazwy niewiele tam z białoruskości.

Znaczenie świadectwa sław

Osobiście, nigdy nie byłem zwolennikiem zawłaszczania wielkich imion, jakkolwiek wszyscy są skłonni do poprawiania swej biografii i szukania uzasadnień dla swej megalomanii. Nie pochwalam tego, że z charakterystycznym dla nich poczuciem wyższości, Polacy, bez mrugnięcia okiem, uważają za swoich, jakkolwiek „kresowych", wiele wybitnych postaci związanych niemal wyłącznie z Białorusią. Dla mnie ważniejszym jest nie miejsce urodzenia albo pracy, ale to, za kogo ten ktoś sam się uważał, z jaką narodowością albo kulturą się utożsamiał. Bywa, że ktoś całe swe życie przeżył na Białorusi, ale poza miejscem zamieszkania nic go z Białorusią nie łączyło. Czuł się przykładowo obywatelem Związku Sowieckiego i pracował na rzecz kultury rosyjskiej. Z drugiej strony nie wolno całkowicie lekceważyć faktu, że ktoś taki jak Mickiewicz, Moniuszko albo Chagall wyrośli na białoruskiej wielonarodowościowej glebie. Kto wie, czy niektórzy wielcy ludzie byliby wielkimi, gdyby urodzili się gdzie indziej, w innym środowisku. Ponadto uważam, że dla małego kraju słusznie postrzeganego w świecie jako prowincja albo satelita Rosji

wprost bezcenne jest, gdy do swych białoruskich korzeni przyznają się albo przyznawali tacy ludzie jak Kirk Douglas, Harrison Ford, Scarlett Johansson, Benjamin Kopman, Lisa Kudrow, Wayne Gretzky, Walentyna Tierieszkowa. Każdy wielki sportowiec (jak Wiktoria Azarenka), każdy śpiewak, uczony (jak Barys Kit), zarówno w przeszłości, jak i obecnie, który podkreśla pochodzenie albo przynajmniej swe białoruskie korzenie oddaje wielką przysługę krajowi. Nawet zwycięzca Eurowizji Sasza Rybak w jakiś sposób przypomina o rozśpiewanej, muzykalnej Białorusi kojarzonej niemal wyłącznie z łysym, wąsatym niezastąpionym prezydentem.

Rola Białorusistów


Prócz emigracyjnych twórców i działaczy oraz tych stale mieszkających w sąsiednich krajach, ambasadorami Białorusi w świecie okazali się liczni białorusiści w kilkunastu krajach świata. Są to przeważnie poważni, uznani naukowcy. Z racji swych zainteresowań regionem Europy Wschodniej, jakimś trafem szczególnie zainteresowali się oni akurat Białorusią. Około 600 uczonych entuzjastów Białorusi z 23 krajów skupiło się w Międzynarodowym Stowarzyszeniu Białorusistów. Utworzone zostało ono 27 lat temu przez trzy ministerstwa i Akademię Nauk Białorusi. Stowarzyszenie organizuje Kongresy, na których występują tacy uczeni jak Arnold McMillin i Jim Dingley (Wielka Brytania), Timothy Snyder (USA), Paul Suter (Szwajcaria), Andras Zoltan (Węgry), Nikołaj Nikołajew (Rosja), Ryhor Piwtorak (Ukraina), Ryszard Radzik (Polska). Wielu białorusistów tak dalece zagłębiło się w tematykę białoruską, że opanowali nawet język białoruski. Wręcz fascynująca jest postać angielskiego białorusisty Guy'a de Picarda. Ten absolwent Sorbony i Oxfordu, prawnik pochodzenia francusko-angielskiego miał ciotkę, ochrzczoną Żydówkę, która zaprowadziła go w Paryżu do cerkwi prawosławnej i gdzie Picarda zachwycił się śpiewem cerkiewnym. Później jako sekretarz Towarzystwa więzi kulturalnych ze Związkiem Sowieckim Picarda zainteresowal się muzyką białoruską. Z ekspedycją naukową odwiedził nawet Podlasie, zbierał dawną muzykę cerkiewną i publikował ją. „Powinniśmy edukować Brytyjczyków, opowiadać im o Białorusi" – mawiał Picarda. Prócz muzyki interesował się on Skaryną, białoruskimi przekładami Biblii oraz tematyką Wielkiego Księstwa Litewskiego. Co godne podkreślenia, Guy Picarda nie interesował się polityką i powtarzał, że Białoruś go interesuje niezależnie od tego, kto aktualnie sprawuje władzę w Mińsku. Formalnie niemający nic wspólnego z Białorusią Guy Picarda z benedyktyńską cierpliwością, cicho i metodycznie pracował na rzecz kultury białoruskiej nie czerpiąc z tego żadnych profitów, ani korzyści materialnej. Unikalny człowiek. Godny najwyższego uznania. Wielka szkoda, że odszedł 11 lat temu w wieku 76 lat.

Prócz Stowarzyszenia Białorusistów istnieje jeszcze jedna pokrewna organizacja albo raczej białorusko-litewskie przedsięwzięcie: Międzynarodowy Kongres Studiów Biało-

ruskich. Kongres skupiający około 500 badaczy i analityków został zainicjowany jako coroczne spotkanie ekspertów i przedstawicieli społeczeństwa obywatelskiego, instytucji rządowych i pozarządowych, którzy zajmują się polityką, społeczeństwem i kulturą Białorusi. Kongres gromadzi szerokie grono specjalistów z Białorusi, Unii Europejskiej (w tym w szczególności z Polski oraz Litwy), Ukrainy, Rosji, USA oraz innych krajów. Przyznawane przez Kongres nagrody za najlepsze prace z różnych dziedzin pobudzają młodzież akademicką do zainteresowania się tematyką białoruską.
Sokrat Janowicz był żarliwym patriotą białoruskim, nosił Białoruś w sercu, mimo iż mieszkał poza BSSR i Republiką Białoruś, w swojej małej Ojczyźnie. Prócz tego, co napisał i wydał, bardzo wiele powiedział o Białorusi i Białorusinach w kraju i za granicą w prywatnych rozmowach z przyjaciółmi. Ufam i oczekuję, że w charakterze rozwinięcia i wzbogacenia tego wstępu zostaną przywołane jego niezapomniane słowa.

Konstanty Bondaruk
Wasilków, sierpień 2018





ЯБЛЫК

Славутая медная грав'юра Альбрэхта Дзюрэра – „Адам і Ева ў раі" цудоўна ўпісваецца ў тэматыку нашага сёлетняга, трыялогавага зацікаўлення. Эдэн – райскі сад быў першабытным, самым лепшым і Божым уладкаваннем чалавека сярод усяго астатняга стварэння. Згодна Божаму Провіду, рай быў вытокавай Радзімай чалавека, ідэальным месцам для жыцця. Аднак акт непаслухмянасці званы „першародным грахом", парушэнне першазданнай чысціні, дзявоцтва і беззаганнасці сталі прычынай выгнання з раю, а гэта пацягнула за сабою страту чалавекам шчасця і набліжанасці да Бога, парушыла гарманічнае суіснаванне з прыродным светам, прынесла цяжкасці, нягоды, ліха, гараванне, хваробы і смяротнасць.
Біблія нічога нам не кажа пра канкрэтны від забароненага плоду з дрэва пазнання дабра і зла. Гэта магла быць фіга, плод фінікавай, дактылавай пальмы або нават банан, але ў найстарэйшых міфалогіях і легендах згадваецца менавіта пра яблык. Прынята лічыць, што якраз яблыкам Ева спакусіла Адама. Адам быў створаны поўным, бясполым чалавекам пасля падзеленым на дзве роўныя часткі. Толькі з таго часу яны сталі як быццам дзвюма ідэальна дапасаванымі і адзін аднаго дапаўняючымі паловамі яблыка. У „Застоллі" Платона, Зеўсу прыйшло на думку, каб непакорлівых, неўтаймаваных людзей аслабіць шляхам падзелу, але гэтым самым колькасна іх памножыць. Гэтая метафара замацавалася ў народнай абраднасці многіх этнасаў: яблык як сімвал пладавітасці але і падзелу, па сённяшні дзень нагадваецца

маладажонам. У грэцкай міфалогіі, залаты яблык з надпісам „для найпрыгажэйшай" быў кінуты багіняй Ірыс падчас вяселля Тэціды і Пелеўса, што выклікала варажнечу паміж Герай, Афрадзітай і Афінай. Затым адбыўся працэс паступовай дэвальвацыі яблыка як сімвала, і ён апусціўся да ўзроўню шляхецкай і гарадской геральдыкі.

Такім чынам, яблык мае сваё сімвалічнае вымярэнне гэтак рэлігійнае, абраднае, міфалагічнае як і... палітычнае. З аднаго боку ён асацыіруецца з райскім дабрастанам і беззаганнасцю, а з другога ўказвае на падзел, варожасць, неўстрыманне і смерць. Аднак у іканаграфіі яблык, які прывёў у свет грэх і смерць змяшчаецца ў руцэ Ісуса Хрыста як прадвесце і сімвал адкуплення.


Рай, першабытная Радзіма, выгнанне з раю, яблык узвышэння і падзення, каралеўскай годнасці але таксама нязгоды і адкідвання, лёгка спалучыць з прадметам нашага сёлетняга, трыялогавага зацікаўлення. Рай – наша першая Радзіма, наш зыходны пункт і канчатковая мэта нашага зямнога паломніцтва. Аднак наша зямная радзіма бадай ніколі не бывае і не бывала ні раем ні краінай, хаця б адноснага, шчасця.Часта яна ўшчэнт парваная, перасвараная, нездаровая і з'едзеная чарвякамі. Часцей чым аб'ект мар гэты „рай" хутчэй нагадвае пекла ад якога з агідай адхіляем зрок і ад якога вельмі часта, з болем у сэрцы – уцякаем. Не трагедыя і не ганьба калі з'язджаем па сваёй волі ў пошуках чагосьці іншага ці лепшага; дабрабыту супакою, жыццёвай прасторы або перспектыў. Сапраўдная трагедыя бывае тады, калі мы вымушаныя пакінуць роднае гняздо, калі нам няма месца пад ўласнай страхою, калі прызналі нас лішнімі, адкідамі, лупінамі і смеццем. Тады, далёка недасканалая Айчына, узвышаецца да рангу раю, страчанага раю.

Калі прыраўняць краіну або народ да яблыка, дык яго вонкавая абалонка, шкурка бывае вельмі часта найбольш шматколерная, прывабная, пахучая. Яна зачароўвае зрок і прыцягвае ўвагу. Гэты знешні, бачны бок плоду часта бывае не толькі самы прыгожы, але і самы вартасны. У выпадку краіны ці народу бывае таксама гэтак як з абаранкам да якога Пілсудскі прыраўняў Польшчу: „Усё, што найлепшае – па баках, а пасярэдзіне – пустэча". Вонкавае аблічча, бачны і распазнавальны бок, неаднойчы бывае адзіным, які чужыя людзі ведаюць. Гэта неаднойчы візітная картачка краіны, яе брэнд, марка, імідж. Зняважліва ставячыся або адкідаючы шкурку мы пазбаўляемся прыцягальнай моцы ўпакоўкі і не даем зацікаўленым асобам магчымасці разабрацца наконт істотнага зместу прадмету. А зноў жа з другога боку, уласна плод і яго жыватворная, адраджальная сіла схаваная ў зярнятах, знаходзіцца ўнутры, у сярэдзіне. На месцы (паза некаторымі выключэннямі як жыды і армяне, застаецца большасць любога грамадства). У роднай краіне заўсёды застаецца духоўны цэнтр, умоўна кажучы – сэрца народу, хаця неабавяз-

кова мазгі і яго асноўны патэнцыял. Абалонка і нутро з'яўляюцца інтэгральнай цэласнасцю. І адно і другое
– важнае як імідж і сапраўдны выгляд, як шыльда і магазін, як знак і значэнне.

Кастусь БАНДАРУК
Васількаў, жнівень 2018





JABŁKO

Wspaniały miedzioryt Albrechta Durera „Adam i Ewa w raju" znakomicie wpisuje się w tematykę tegorocznego Trialogu. Eden – rajski ogród był pierwotnym, optymalnym i Bożym umiejscowieniem człowieka pośród całego pozostałego stworzenia. W zamyśle Bożym raj był pierwotną Ojczyzną człowieka, optymalnym miejscem do życia. Jednak akt nieposłuszeństwa zwany „grzechem pierworodnym", niezachowanie czystości, dziewictwa i niewinności spowodowały wygnanie z raju, banicję, a te pociągnęły za sobą utratę przez człowieka szczęśliwości i bliskości ze Stwórcą, zakłóciły harmonijne współistnienie ze światem przyrody, przyniosły trudy, znój, poniewierkę, choroby i śmiertelność.
Biblia nic nie mówi o gatunku zakazanego owocu z drzewa poznania dobra i zła. Mogła to być figa, owoc palmy daktylowej albo nawet... banan, ale w najdawniejszych mitologiach i podaniach wymienia się właśnie jabłko. Rzekomo właśnie jabłkiem Ewa skusiła Adama. Adam stworzony jako pełny człowiek został podzielony na dwie równe części i odtąd wraz z Ewą stali się jak dwie, znakomicie dopasowane i uzupełniające się, połówki jednego jabłka. W „Uczcie" Platona Zeus wpadł na pomysł by krnąbrnych, nieokiełznanych ludzi przez podział zarówno osłabić, ale tym samym liczebnie ich pomnażając. To porównanie zamocowane w obrzędowości ludowej wielu narodów: jabłko jako symbol płodności, ale i podziału, jest po dziś dzień przypominane nowożeńcom.

W mitologii greckiej złote jabłko z napisem „dla najpiękniejszej" rzucone przez boginię Eris podczas wesela Tetydy i Peleusa stało się przyczyną sporu pomiędzy Herą, Afrodytą i Ateną. Jabłko po łacinie zwane 'globus cruciger' było symbolem władzy cesarskiej i królewskiej, które jednak powoli przechodziło degradację i zejście nawet do heraldyki szlacheckiej i miejskiej.
Tak więc owoc ten ma wymiar symboliczny zarówno religijny, obrzędowy, mitologiczny, jak i polityczny. Z jednej strony nasuwa skojarzenie z rajskim błogostanem i niewinnością, z drugiej wskazuje na podział, wrogość i odrzucenie oraz śmierć. Jednak w ikonografii jabłko, które sprowadziło grzech i śmierć na świat, umieszcza się w rękach Jezusa Chrystusa jako zapowiedź i symbol odkupienia.
Raj, pierwotna Ojczyzna, wygnanie z raju, jabłko wywyższenia i upadku, znak wysokiej, królewskiej godności oraz niezgody i odrzucenia łatwo daje się skojarzyć z przedmiotem naszego tegorocznego trialogowego zainteresowania. Raj jest naszą pierwotną Ojczyzną, naszym punktem wyjścia i ostatecznym celem ziemskiego pielgrzymowania. Jednak nasza ziemska ojczyzna niemal nigdy nie jest i nigdy nie była rajem ani krainą nawet względnej szczęśliwości. Często jest rozdarta, skłócona, podzielona, niezdrowa i robaczywa. Częściej niż wymarzony raj przypomina ona raczej piekło, przed którym wzdragamy się i od którego tak często z bólem w sercu po prostu uciekamy. Nie jest tragedią, gdy wyjeżdżamy z własnej woli w poszukiwaniu czegoś innego i lepszego: dobrobytu, spokoju, przestrzeni życiowej, perspektyw. Tragedią jest, gdy zostaniemy przymuszeni do porzucenia gniazda rodzinnego, kiedy zabraknie dla nas miejsca pod własnym dachem, kiedy zostaliśmy uznani za zbędnych, za odpadki, obierki, za śmieci. Wówczas daleka od doskonałości Ojczyzna nabiera rangi raju, raju utraconego.
Jeżeli przyrównać kraj albo naród do jabłka, to jego zewnętrzna otoczka, skórka jest częstokroć najbardziej kolorowa, powabna, pachnąca, przyciągająca wzrok i uwagę. Ta zewnętrzna widzialna strona owocu często jest nie tylko najpiękniejsza, ale i najwartościowsza. W przypadku kraju lub narodu również bywa jak z obwarzankiem, do którego Piłsudski przyrównał Polskę: „Wszystko, co najlepsze znajduje się na obrzeżach, natomiast w środku – pustka". Zewnętrzna, widzialna i rozpoznawalna strona jest niekiedy jedyną, jaką się zna. Jest to niekiedy wizytówka kraju, jej brand, marka, wizerunek. Lekceważąc lub odrzucając skórkę, tracimy przyciągająca moc opakowania i pozbawiamy zainteresowane osoby możliwości rozeznania co do istotnej treści przedmiotu. A z drugiej strony, właściwy owoc i jego życiodajna, odradzająca moc, ukryta w ziarnach, znajduje się w środku. Na miejscu (poza kilkoma wyjątkami jak Żydzi i Ormianie) zwykle pozostaje większość społeczeństw. W kraju ojczystym zawsze pozostaje duchowe centrum, umownie mówiąc – serce narodu, chociaż niekoniecznie mózg i jego zasadniczy potencjał. Otoczka i wnętrze

są integralną całością i jedno, i drugie są ważne jak wizerunek i rzeczywisty obraz, jak znak i znaczenie.

Konstanty BONDARUK
Wasilków, sierpień 2018





XIX ТРЫЯЛОГ

Сімпазіён „Belarusian outside”

Каўказская сінагога ў Крынках, 1 верасня 2018

XIX TRIALOH

Sympozjon „Belarusian outside”

Synagoga Kaukaska w Krynkach, 1 września 2018

частка I / część I

ЛІТАРАТУРА / LITERATURA

Лявон Тарасэвіч:

Шчыра ўсіх вітаю на сёлетнім „Трыялогу”. Ну і пачнём ад літаратуры. Сакрат заўсёды хацеў, каб літаратура, каб думка беларуская была прысутная ў Еўропе, ну і на гэтых салонах. Так што салон еўрапейскі перанеслі сёння ў Крынкі. Мадэратарам у гэтым годзе будзе Яраслаў Іванюк. Oklaski zwykle są w telewizji... (*апладысменты*)... Яраслаў, калі ласка.

Яраслаў Іванюк:

Дзякую сардэчна. Для мяне гэта вялікі гонар у такім месцы, з такімі выступоўцамі, з такімі ўдзельнікамі дыскусіі, пры такім арганізатары як „Villa Sokrates” тут быць разам, мадэраваць гэтую дыскусію. Каб такім усім працэдурам „stało się zadość”, трэба сказаць, што арганізатарам гэтай імпрэзы ёсць Fundacja „Villa Sokrates” w Krynkach, суарганізатар – гэта Muzeum Podlaskie w Białymstoku. Партнёры: Urząd Miasta Krynki, Gminny Ośrodek Kultury w Krynkach і Беларускі інфармацыйны цэнтр. А „Annus Albaruthenicus 2018”, які выйдзе з матэрыяламі з нашай сённяшняй дыскусіі, будзе дафінансоўвацца фундацыяй PKO Bank Polski. Гэтая імпрэза мае таксама медыя-патронаў. Гэта „Gazeta Wyborcza”, Беларускае Радыё Рацыя і Polskie Radio Białystok. І тут таксама як у тэлебачанні oklaski (*апладысменты*)...

Большасць гасцей, якіх бачу на сённяшнім „Трыялогу”, ведае, што сам „Трыялог” – гэта такая сустрэча творцаў, артыстаў, часам таксама – палітыкаў, якія разважаюць паміж сабою, але таксама разважаюць з гасцямі, якія прыехалі, каб да гэтага прыслухацца. Таксама будзе і ў гэтым годзе. Прадставім тры дыскусійныя блокі: гэта будзе літаратура, сродкі масавай інфармацыі і культура. Пачнём літаратурай, і ў гэтым блоку я сардэчна хачу прывітаць Уладзіслава Ахроменку. Гэта асоба, якая на гэты момант пражывае ў Чарнігаве на Украіне, паходзіць з Мінску, пісьменнік, журналіст, зараз даследуе архівы КДБ ва Украіне. Вітаем (*апладысменты*)... Па чарзе – Янка Максімюк, ён ад нас, з Падляшша, нараджэнец Ляхоў, зараз у Празе на Радыё Свабода, перакладчык, аналітык, публіцыст. Вітаем (*апладысменты*)... Сяргей Шупа, мінчук, але таксама цяпер Прага, Радыё Свабода, перакладчык, чалавек, які шмат свайго жыцця прысвяціў таксама журналістыцы (*апладысменты*)... І Павал Касцюкевіча, асоба з Мінску, чалавек, які жыве там, у Беларусі, але думаю, што шмат можа сказаць пра тое, наколькі беларуская літаратура, наколькі Беларусь прысутнічае за мяжою, займаецца якраз такімі праектамі, якія між іншым прасоўваюць, папулярызуюць беларускую літаратуру па-за межамі. Добры дзень (*апладысменты*)... Калі дазволіце, я ўсё ж такі сяду. Межы нашай дыскусіі, рамкі нашай дыскусіі акрэслівае тэкст Кастуся Бандарука, паколькі, як напісана ў гэтых уступных матэрыялах, ідэя меж не мае, таму і мы не будзем абмяжоўвацца толькі гэтым тэкстам, які напісаў Кастусь Бандарук. Але можа пачнём якраз з гэтага тэксту. Кастусь між іншым піша, што Беларусь прасоўваюць і прапагандуюць у свеце, гэтак даўнейшыя, так

і цяперашнія выдатныя людзі ў розных дзялянках. І дадае да гэтага, што Беларусь з'яўляецца аб'ектам жывога і бескарыслівага зацікаўлення і даследаванняў з боку многіх аўтарытэтных замежных беларусістаў у пары дзясяткаў важных краін свету. Я хацеў бы нашую дыскусію пачаць з такога пытання, чаму нам так важна, каб спасылацца на гэтых вядомых эмігрантаў, якія нечага дабіліся па-за межамі Беларусі, і чаму так важна падкрэсліваць, што намі ў свеце ўсё ж такі цікавяцца. Ці гэта нейкі такі комплекс недаацэненасці беларусаў, зрэшты, думаю, не толькі беларусаў. Я памятаю, напрыклад, як у Польшчы аказалася, што першым пілотам F-16, польскага F-16, быў „хлопэць з Ляхоў". Як мы ганарыліся тым, што гэта вось наш хлопец, дарэчы яшчэ і гаворыць па-свойму. Уяўляю сабе, як Янка Максімюк ганарыўся, бо гэта ж з яго роднай вёскі. Чаму гэта так ёсць, як думаеце? Ну, Янка, давай, можа ад цябе тады.

Ян Максімюк:

Ты пра лётчыка хочаш?

Ярасласлаў Іванюк:

Ну, не пра лётчыка, а пра тое, чаму нам так важна падкрэсліваць тое, што мы такія важныя?

Ян Максімюк:

Не, ну паколькі ты пачаў з маёй вёскі, то можа я пару слоў скажу пра гэтага лётчыка. Гэта калега майго брата, яны хадзілі разам у школу, былі ў адным класе, гэта равеснікі. І фактычна гэты хлопец гаворыць па-свойму, калі прыязджае ў гэтую нашую вёску. Я яго помню яшчэ, калі я працаваў у Варшаве ў амерыканскай амбасадзе. Ён прыехаў, кажа, Ваня, у мяне ёсць шанц выехаць у Амерыку, толькі трэба навучыцца ангельскай мовы, кажа, трэба здаць экзамен, бо мяне не возьмуць. Ці ты, кажа, не маеш знаёмства ў амбасадзе, каб мне гэты экзамен здаць проста „за ніц". Я кажу, Росцік, ён Расціслаў называецца, калі ты хочаш навучыцца лётаць на амерыканскіх самалётах, то ты лепш навучыся мовы, бо гэта табе не жарты. Ну і ён паслухаўся, навучыўся, і яго ўзялі.

Яраслаў Іванюк:

І мы ганарымся цяпер і тымі ж лётчыкамі, і тымі літаратарамі...

Ян Максімюк:

Але нашы людзі кажуць, што ён даўно ўжо павінен быць генералам. Але ж прыйшоў PiS да ўлады, і яму генерала не дасць, бо ён праваслаўны пры тым усім. Гэта так выглядае, ну гэта пра лётчыка, так. А што тычыцца таго, як ганарыцца нашымі

людзьмі, якія там недзе выбіліся за мяжою, ну чаму ж бы не? Вось, напрыклад, Сяргей Шупа, я ім ганаруся, ён жа ж за мяжою, у Літве задзейнічаў моцна. І кожны народ хоча ганарыцца, беларусы асабліва. Таму што ў сваёй культуры і ў сваёй мове не ўсе мелі ці то нагоду, ці то проста магчымасць, ці проста маглі рэалізавацца, а рэалізаваліся часцей за ўсё, калі былі за мяжою, у іншых мовах, у іншых культурах. І кожны народ, асабліва мы тут у Польшчы ведаем, як палякі ганарацца сваімі „rodakami" за мяжою. Мы, зрэшты, таксама. Можа хлопцы нешта падкажуць са свайго досведу. Можа яны нейкіх такіх лётчыкаў ведаюць са сваёй вёскі.

Яраслаў ІВАНЮК:

Сяргей, калі ласка.

Сяргей ШУПА:

Ну, я думаю, тут пытанне было не толькі пра сваіх, якія кудысьці паехалі, нечага дасягнулі, а – чаму нам важная ацэнка з боку, звонку, ад некага іншага. Гэта, па-мойму, такое натуральнае пачуццё і адчуванне як на ўзроўні асобы, так і на ўзроўні нейкіх калектыўнасцей, у тым ліку нацыянальных. Любому чалавеку прыемна, калі на яго звяртаюць увагу ў добрым сэнсе. Скажам, калі мужчыну ці жанчыне кажуць, што яны прыгожыя, што яны добра выглядаюць, гэта заўсёды павышае самаацэнку. Асабліва, калі чалавек мае нейкія комплексы, мае нейкае адчуванне абмежаванасці ў сабе. Што, я думаю, для беларусаў як для народа ў прынцыпе характэрна. Яны сябе трошкі не даацэньваюць і адчуваюць, што яны можа недзе не дацягваюць. І таму, калі нехта звонку кажа, вось, я таксама зацікавіўся вамі, што вы такі народ, які мае сваю мову, літаратуру, гэта падымае беларуса найперш ва ўласных вачах. І гэта як бы падкрэслівае тое, пацвярджае, што тое, што ён робіць, тое, да чаго ён імкнецца, яно мае нейкі сэнс і варта гэта рабіць далей, і рабіць як найлепей.

Яраслаў ІВАНЮК:

Павал, ты згодзен з тым, што беларусы маюць сапраўды нейкі такі комплекс, яны недаацэненыя, і гэта таму так?

Павал КАСЦЮКЕВІЧ:

Я ўсё ж такі вярнуся да літаратуры. Наш зорны час беларускі, 2015 год, Святлана Алексіевіч атрымлівае Нобеля. Ясна, для чытачоў беларускіх гэта было, канешне, нарэшце! У адрозненні ад хакея, мы выйшлі ў фінал і ўсіх там перамаглі. На ўзроўні спецыялістаў усе сказалі ага, зразумела, мы атрымалі Нобеля, таму што шведы хацелі выбіраць аўтара, які піша, належыць з аднаго боку да расейскай літаратуры, але сам не расіянін, і плюс з Украіны, нарадзіўся ва Украіне. Святлана Алексіевіч нарад-

зілася ў Івана-Франкоўску. І плюс яна супраць Пуціна, то бок усё выдатна, мы ўсё гэта разумеем, гэтую ўсю гульню шведскай акадэміі. Культурныя менеджары сказалі: зразумела, у яе быў моцны агент, у яе француженка, якая ўжо 30 гадоў з ёй ездзіць, носіцца. Сама спадарыня Святлана няўрымслівы чалавек, якая пастаянна працуе над сваімі кнігамі, над сваім іміджам. Але я думаю, што мы тут забываем, вось гэтым сваім гонарам, мы забываем, што шмат чаго ў перамозе Алексіевіч, у нашай перамозе Алексіевіч, шмат чаго зрабіла русістыка, сусветная русістыка, то бок прадстаўнікі ў кожным універсітэце, якія выкладаюць русістыку, год за годам папулярызавалі Алексіевіч. Ясна, са сваіх меркаванняў, навуковых, не ведаю, палітычных. Аўтарку, якая піша па-руску, таму што яны выкладалі гэтую расейскую мову ва ўніверсітэтах. І Алексіевіч – гэта шмат у чым стратэгія і тактыка русістаў, якія па ўсім свеце выкладаюць гэтую навуку. І калі мы кажам, вось пытанне было, чаму нам важна гэтая ацэнка збоку, гэтая ацэнка збоку шмат у чым змадэлявана. Шмат у чым змадэлявана гэтымі самымі людзьмі, якія зацікаўлены. Дык вось, гэта ўжо пытанне да наступнага беларускага Нобеля, калі ён з’явіцца, што хутчэй за ўсё выязджаць ужо на русістыцы не атрымаецца. Трэба ствараць сваё, свой базіс для новага Нобела, то ёсць беларусістыку ва ўсіх краінах, груба кажучы. То бок я хачу сказаць, што папулярнасць – гэта не толькі папулярнасць, гэта яшчэ і праца зацікаўленых арганізацый, людзей, і таму адваротны бок медаля хачу паказаць і перанакіраваць нашую сённяшнюю дыскусію менавіта на гэта, як дасягнуць, каб пра нас гаварылі. А псіхалагічныя ўжо аспекты, слава, прыемнасці, што пра нас кажуць, гэта ўсё ёсць, не трэба гэта абмяркоўваць. Калі добра, калі пра нас кажуць, гэта добра. Давайце падсумуем. Давайце гаварыць, каб гэта адбылося, бо гэтага не адбылося, вось акрамя выпадку з Алексіевіч. Дзякуй.

Яраслаў Іванюк:

Значыць, трэба чакаць чарговага Нобеля?

Павал Касцюкевіч:

Працаваць над гэтым. Я думаю, пажадана, каб нашая дыскусія сённяшняя была, што трэба зрабіць, а не нашы адчуванні ад таго, што сафіты звернуты на нас, як мы пачуваемся. Пачуваемся добра. Людзі пачуваюцца добра, калі яны перамагаюць, калі хакейная каманда выйграе – гэта радасць. Калі наш Нобель выйшаў у фінал, гэтымі тэрмінамі паслугоўваемся спартовымі, гэта добра. Але давайце ўсё ж такі пагаворым, што трэба зрабіць, каб нас пачулі.

Уладзіслаў Ахроменка:

Справа ў тым, вось на мой погляд, што нашы нобелі, нашы лётчыкі, нашы героі, нашы пераможцы, гэта пытанне самаідэнтыфікацыі. Хочам мы таго ці не хочам,

у той жа Украіне Беларусь, беларусы ідэнтыфікуюцца з Лукашэнкам. Гэта вось такое, як кажуць, факт, а не рэклама. Калі ў размове з украінцамі нагадваеш, што наш Піліп Орлік, ён з Беларусі, з Вілейкі, ён напісаў вам Канстытуцыю. Нагадваеш яшчэ там пра людзей, якія жылі ва Украіне з Беларусі, той жа Багушэвіч, той жа Караткевіч, які вучыўся ў Кіеўскім універсітэце, людзі ўжо пачынаюць, тыя ж украінцы, яны ўжо пачынаюць ідэнтыфікаваць Беларусь і беларусаў з іншым культурным слоем і з іншымі асобамі. І таму, зноў такі на мой погляд, у той жа Украіне, – я толькі пра Украіну магу гаварыць, таму што я там жыву, – Беларусь у вачах украінцаў, гэта краіна неверагодна заміфалагізаваная. 60-65 адсоткаў украінцаў, паводле статыстыкі, за сваё жыццё не выязджала за межы сваіх абласцей, што там ужо гаварыць пра суседнія, ці што там гаварыць пра тую ж самую Беларусь. Але на вялікі жаль, тэндэнцыя такая захоўваецца, што ў той жа Украіне пра Беларусь ведаў проста вобмаль.

Яраслаў Іванюк:

Мне здаецца, што не толькі ва Украіне, але таксама ў многіх іншых краінах Беларусь асацыіруецца ў асноўным з тым жа Аляксандрам Лукашэнкам, і не шмат больш пра гэтую Беларусь у свеце людзі ведаюць. Тым не менш, Севярын Квяткоўскі, вядомы тут усім удзельнікам дыскусіі, напісаў нядаўна, што ён усё ж такі менш звяртае ўвагу на тое, што пра беларусаў, пра Беларусь, сказаў нейкі замежнік, таму што гэтых выказванняў усё больш і больш, і нават цяжка адсочваць гэта. Застаючыя пры тым, пра што ты, Павал, гаварыў, на чым хацеў засяродзіць сённяшнюю дыскусію, дык якая праца павінна быць гэтай часткі беларусаў у эміграцыі, каб на Беларусь усё больш звярталі ўвагу, якім чынам можна прасоўваць гэтую літаратуру. Усе вы тут у пэўным сэнсе, у многіх сэнсах нават, гэтым прасоўваннем беларускай літаратуры, ведаў пра яе, займаецеся ў гэтых краінах, дзе жывяце. Ты, Павал, таксама маеш свой праект, які прапагандуе беларускую літаратуру за мяжою. Дзе найпрасцей на гэты момант дайсці з гэтай літаратурай?

Павал Касцюкевіч:

Думаю, літаратура беларуская найперш цікава нашым суседзям і Нямеччыне. Але вось так наўскідку, колькі, напрыклад, выйшла кніг, скажам, у Польшчы беларускіх аўтараў у перакладзе – я налічыў за 2018 год тры. Летась было дзве. Нашы суседзі, так? Украінцы, я налічыў, дзве кніжкі выдалі беларускіх аўтараў па-ўкраінску. У літоўцаў – адна. Валодаючы такой статыстыкай, вось гэта паказвае на цікаўнасць да Беларусі нашымі суседзямі, нашымі бліжэйшымі суседзямі. Меў цікавую гутарку на Варшаўскім кніжным кірмашы з дамай з выдавецтва Znak, такое вядомае выдавецтва, вялікае. Я спытаў, што трэба зрабіць, каб беларускіх аўтараў пачалі

перакладаць. Яна гартала каталог беларускіх аўтараў, які мы выдалі па-ангельску нарэшце. Яна сказала простую рэч, маўляў, калі ў вас будзе Майдан, тады мы вамі зацікавімся. Вось такі адказ, я думаю, што не трэба крыўдаваць на яго. Гэта такая рэальнасць. Вялікія краіны, дзе ёсць кніжны рынак, у іх ёсць пэўныя крытэры да літаратуры і нераскручаная літаратура, хаця здавалася б суседзі, павінны адказваць на гэтыя крытэры. Крытэры такія: каб кніжка куплялася. На дадзены момант Беларусь пакуль як брэнд такі – не цікавая. Вось так яно.

Яраслаў Іванюк:

Застанёмся яшчэ на момант пры Польшчы і пры тых перакладах, якія тут выходзілі. Ян, ты некалькі такіх кніжак хацеў якраз польскаму чытачу прысвоіць, некалькіх аўтараў з беларускай літаратуры. Гэта было таксама і ў Беластоку яшчэ, але і пазней, калі ты супрацоўнічаў з Анджэем Дамброўскім ва Вроцлаве, дзе выходзіла серыя перакладаў беларускай літаратуры на польскую мову. І гэтыя кнігі перакладаліся, але фактычна яны не трапілі ў дыстрыбуцыю, іх нельга было амаль нідзе купіць.

Ян Максімюк:

Ну так. Я проста гэтымі кнігамі займаўся хутчэй не як дыстрыбутар, а як перакладчык, і да пэўнай ступені як рэдактар, скажам так. Сама дыстрыбуцыя да мяне не належала, але гэта фактычна праблема ўсёй беларускай літаратуры, не толькі той, якая выходзіла ў Польшчы ў перакладах на польскую мову, але таксама літаратуры, якая ў нас выходзіць па-беларуску, і якая выходзіць у Беларусі таксама па-беларуску . Рэч у тым, што ўвесь беларускі выдавецкі працэс, і перакладны працэс, ён хутчэй нагадвае нейкую гуманітарную акцыю для беларусаў, чым кніжны бізнес, у якім працуюць вялікія выдавецтвы. І мы ў такі бізнес ніколі не патрапілі. Я сам быў задзейнічаны пры выданні як перакладчык ці як рэдактар, я думаю, недзе каля дзесяці ці дванаццаці кніжак на польскую мову, так што ў мяне нейкі такі досвед назбіраўся. Але хутчэй за ўсё, гэта горкі досвед, таму што пераклады былі зробленыя, вокладкі намаляваныя, кніжка надрукаваная, ну а потым заставалася праблема дыстрыбуцыі і ніхто не ведаў, што далей з тым рабіць, як гэта прасоўваць. Па-першае, не было кантактаў ні з сеткай продажу гэтых кніг, не было кантактаў ні з нейкімі знаёмымі крытыкамі, з часопісамі, якія маглі б пра гэтую кніжку напісаць і чалавек у Польшчы мог бы пра гэтую кніжку дазнацца. Я нават не ўпэўнены як яна прадавалася, таму што мой занятак гэтымі перакладамі беларускай літаратуры на польскую мову якраз супаў у часе з маім пераездам у Прагу. Гэта было ўжо 20 гадоў таму назад. Я ў Празе гэтыя пераклады рабіў ці рэдагаваў, а тут людзі ў Беластоку гэтым займаліся. Я, шчыра сказаўшы, нават сабе не ўяўляю, дзе тая кніга магла патрапіць. Яна магла ў рэдакцыі „Нівы” сабе быць, хтосьці мог купіць,

магчыма, яшчэ на кірмашах якіх прынагодных, натуральным шляхам у кнігарні яна не патрапіла. Але гэта ўсё ж мела значэнне, як я сёння гляджу на гэта з перспектывы амаль 20 гадоў. Мы тады выдалі, хто не ведае, чатыры кнігі. Гэта была „Анталогія маладой беларускай паэзіі", гэта быў зборнік эратычных апавяданняў Адама Глобуса, зборнік апавяданняў Уладзіміра Арлова і зборнік апавяданняў „Сцяна" Васіля Быкава. На працягу 3-4 гадоў гэтыя кніжкі выйшлі. Мне здаецца, гэтыя прозвішчы для ўсіх, хто цікавіцца беларускай літаратурай, былі знакавыя і паказальныя на той момант. І калі я гляджу на гэтую выдавецкую акцыю, то яна была значна важнейшая для нас, для беларускага асяроддзя, чым для тых аўтараў, якіх мы перакладалі і якіх мы хацелі прамаваць, але нам не ўдалося. Таму што за гэтыя пераклады ўзялося пакаленне сыноў, я сказаў бы, Сакрата Яновіча. Гэта былі людзі ў веку ягоных сыноў. Гэта было зусім іншае пакаленне, у нас ужо была створаная ў Беластоку свая, скажам, літаратурная іерархія, як Сакрат Яновіч, Юрка Валкавыцкі, Ян Чыквін і іншыя. Гэта ўсё былі старэйшыя. А тут як бы свайго месца ў літаратуры, у перакладах шукала маладзейшае пакаленне, якое гэтыя кніжкі перакладала. І для гэтага пакалення акцыя мела значэнне нейкай такой культурнай інтэграцыі. А таксама на той момант, у 1990-х гадах, мы адчулі нейкую такую бліжэйшую лучнасць з Беларуссю, не з нейкай дзяржавай, але менавіта з гэтымі людзьмі, якія тады пісалі, якія былі ў нашым больш-менш веку. Яны пісалі пра рэчы, якія нам падабалася чытаць і нават падабалася перакладаць. Для нас гэта было істотна. Гэта быў першы мой этап.

Яраслаў Іванюк:

Тваё пакаленне, якое перакладала на Беласточчыне гэтыя кнігі так на энтузіязме, для ідэі. Але ўжо ва Вроцлаве Kolegium Europy Wschodniej больш прафесійна гэтым павінна было заняцца, але іхнія кніжкі таксама не трапілі нідзе. Сяргей, у Празе цяпер рыхтуюцца да выдання ўспаміны Ларысы Геніюш „Споведзь" на чэшскай мове. Перакладчыца гэтых успамінаў Святлана Вранава сказала мне на пачатку жніўня, што фактычна на чэшскую мову амаль нічога з беларускай не перакладалася. А нават калі б хацелася перакласці нейкага класіка, Быкава, Караткевіча, то ён не знойдзе чытача ў Празе, у Чэхіі.

Сяргей Шупа:

Мы тут гаворым пра тое, што мы маглі б за межамі Беларусі зрабіць, каб папулярызаваць беларускую літаратуру. Вось Ян згадаў, што пакуль гэтым будуць займацца толькі энтузіясты, пакуль гэта не стане справай кніжнага бізнесу, то на нейкую папулярнасць няма чаго разлічваць. Але я хачу звярнуць увагу на тое, што ў самой Беларусі беларуская літаратура не ёсць сёння справай бізнесу. Фактычна гэта та-

кая партызанская барацьба, культурная барацьба на выжыванне. Гэтая літаратура сучасная, якая пішацца сёння – не будзем класіку браць, там іншае пытанне – яна выходзіць мізэрнымі тыражамі, займае на паліцах у кнігарнях, у нейкім куточку зусім нябачнае месца. Абсалютная бальшыня беларусаў пра сучасную беларускую літаратуру нічога не ведае. Мы праводзілі апытанне на вуліцах Мінска, пыталіся, што яны думаюць пра Святлану Алексіевіч. Палова людзей, якіх спынялі на вуліцах, першы раз чулі, хто такая Святлана Алекіевіч, і гэта праз год ці два пасля таго, як яна атрымала Нобеля. Гэта апісанне сітуацыі, у якой мы ёсць. Плюс: што трэба было б зрабіць? Ну я не хачу тут пошукам апраўданняў займацца, але пакуль нешта не зменіцца на ўзроўні дзяржавы, гэта будзе заставацца партызанскім змаганнем, таму што ўсе краіны Еўропы – тут таксама перакладчыкі сядзяць і яны ведаюць – у кожнай краіне ёсць спецыяльная інстытуцыя, якая фінансава падтрымлівае папулярызацыю сваёй літаратуры і фінансава падтрымлівае пераклады сваёй літаратуры на іншыя мовы. Гэта ёсць ва ўсіх – у літоўцаў, у румынаў, у палякаў. Любы перакладчык на беларускую мову проста прыйдзе, запоўніць заяўку і пры добрых умовах атрымае гэты грант. І тая літаратура, з якой ён перакладае, атрымае дадатковы шанец. Беларусы – адзіны народ Еўропы, які такога не мае, беларуская дзяржава не мае такой інстытуцыі. Ні Міністэрства культуры такім не займаецца. Ды што казаць, увогуле незалежных выдаўцоў, вось як Логвінава, дзяржава не тое, што не падтрымлівае, а часам стараецца як бы і прыдушыць. Мы сёлета былі ў Празе на штогадовым кніжным кірмашы „Свет кнігі", і там упершыню быў беларускі стэнд, афіцыйны. Маленькі такі куточак. Дык там не тое, што, скажу так, нашага Саюзу пісьменнікаў не было ніводнай кніжкі, там і „чаргінцоўскага" не было ніводнай кніжкі. Там усе кніжкі былі: саломка, народнае адзенне, альбомчык такі, альбомчык сякі, архітэктура, нашыя славутыя землякі. І там прадстаўнікі былі Міністэрства інфармацыі, усе, хто адказвае за кнігі. Для іх кніга – гэта не літаратура. Для іх кніга – гэта нейкі такі сувенірны набор, каб прапхнуць нейкія там трактары ці яшчэ штосьці.

Яраслаў Іванюк:

Больш-менш гэта так выглядала і на Варшаўскім міжнародным кірмашы. Там прынамсі былі беларускія незалежныя выдавецтвы, побач з дзяржаўнымі. Але там таксама на дзяржаўным стэндзе пра ніякую літаратуру нельга было гаварыць. Павал, ты займаешся праектам „Books from Belarus". Якім чынам вы выбіраеце гэтыя кнігі, якія пазней можна будзе перадаць далей? Бо тут Сяргей гаворыць, што наогул гэтая беларуская сучасная літаратура, яна не надта вядомая ў самой Беларусі. Але ёсць такія хіты, як, напрыклад, „Радзіва Прудок" Андруся Горвата. Ці гэта тая кніга? Яна цяпер у Беларусі ўжо здаецца трэці тыраж прадаецца. Гэта кніга, паводле

якой зробленая п’еса, якая ставіцца ў купалаўскім тэатры, дзе Андрусь Горват быў дворнікам у свой час. Ці такая менавіта кніга можа трапіць да чытача за мяжой?

Павал Касцюкевіч:

Я хачу прадоўжыць думку Сяргея наконт інстытуцый, якія не займаюцца. Сапраўды, працуючы ў „Books from Belarus”, гэта ініцыятыва, якая была накіраваная на папулярызацыю беларускай кнігі, беларускай літаратуры за мяжой, мы прыйшлі да такой высновы: тое кола замежнае, тых беларусістаў, яно ёсць. Амаль у кожнай краіне Еўропы ёсць людзі, якія цікавяцца, і якія не проста цікавяцца, якія аўтарытэтна ўмеюць перакладаць і разбіраюцца ў літаратурнай сітуацыі сваёй краіны, але і ведаюць беларускую літаратуру, як у Польшчы Малгажата Букалік і Ян Максімюк, як у Нямеччыне Томас Вайлер, выдатны перакладчык Альгерда Бахарэвіча, як Джым Дынглі, брытанскі прафесар, сама крытычная прытомнасць, вось зараз выйшла кніга Тані Скарынкінай. У нас гэта ўсё ёсць. Ёсць людзі з Беларусі, якія зацікаўленыя, якія ўжо працуюць як культурныя менеджары, вось гэтае само прадпрыемства „Books from Belarus”, усё гэта ўжо ёсць. Няма толькі аднаго. Няма грошай. Грошы павінна, у нас у дадзеным выпадку такая выснова, цягнуць беларуская дзяржава, ствараючы Інстытут беларускай кнігі на прадмет як ёсць Інстытут польскай кнігі ў Кракаве, як ёсць Інстытут Гётэ, які падтрымлівае, то ёсць, ён не выдае кніжкі, ён дапамагае мясцовым выдаўцам еўрапейскім і перакладчыкам, трошкі іх як бы падштурхоўвае сваімі ганарарамі перакладчыкаў, ён не плаціць за ўсё, ён дае на штосьці адно, альбо на выданне, альбо на пераклад. Ён проста надае аб’ём гэтаму праекту. І гэта тое, чаго нам у дадзеным выпадку не хапае. Таму пакуль... Усё астатняе ў нас ёсць, базіс, інфраструктура дзеля гэтага ў нас ёсць. Таму я думаю, усё ўпіраецца ну, без беларускай дзяржавы, думаю, даволі цяжка гэта ўявіць на дадзеным этапе. Як бы мы яе не хавалі, але без дзяржавы, без яе ўдзелу інстытуцыйнага, цяжка ўявіць.

Яраслаў Іванюк:

Уладзіслаў, Украіна падтрымлівае прасоўванне сваёй літаратуры за мяжой?

Уладзіслаў Ахроменка:

Ну я хацеў бы тут правесці паралелі паміж Беларуссю і Украінай. Ведаеце, у пачатку 90-х мы былі прыблізна ў роўных умовах з украінцамі, ну ў нечым яны былі наперадзе, у нечым мы былі наперадзе. І прамоцыяй украінскіх кніжак не займаліся, і такіх вось фестываляў не было. Цяпер ва Украіне якія ёсць фестывалі самыя вядомыя, іх увогуле процьма! Самыя вядомыя, гэта „Кіеў Арсенал”, гэта „Кніжковый форум” у Львове і ў Тэрнопалі. У Беларусі, калі не памыляю-

ся, напрыканцы зімы быў кніжны кірмаш. Вось вялізны-вялізны ўкраінскі стэнд. Прыязджае дэлегацыя ўкраінскіх пісьменнікаў, іх сустракаюць ад амбасады на вакзале, іх засяляюць, ім робяць прамоцыю такую, якая нам і не снілася, афармляюць стэнд, які быў адзін з лепшых. Колькі я быў на ўкраінскіх форумах, фестывалях, я не бачыў там ні разу, ніводнага прадстаўніка беларускай амбасады, які там у прынцыпе павінен быць. Увогуле дзяржаве на культуру, як не прыкра, на кніжкі, на ўсё астатняе, глыбока напляваць. І спадзявацца на нейкую дапамогу дзяржавы, гэта, прабачце, такая „манілаўшчына". Прынамсі ў бліжэйшы час гэтага ніколі не будзе і нам трэба спадзявацца толькі на сябе. Гэта маё глыбокае перакананне.

Яраслаў ІВАНЮК:

Значыць, дзяржава ці мы самі?

Павал КАСЦЮКЕВІЧ:

Як я гэта бачу ўжо з досведу, без беларускай дзяржавы проста нікуды. Проста таму, што гэта вялікае фінансавае, можна сказаць, „цела", якое можа даць найвялікшую колькасць проста фінансавых уліванняў. Усё астатняе...

Уладзіслаў АХРОМЕНКА:

Хай бы яны хаця б не замінալі, вось хаця б...

Павал КАСЦЮКЕВІЧ:

Я проста бачу вось на людзях, якія сапраўды захопленыя гэтай справай, на еўрапейскіх нейкіх уліваннях гэта, на жаль, не працуе. Эксперымент з беластоцкімі перакладамі выявіў, што Беласток – гэта як Лас-Вегас, „што здараецца ў Беластоку – застаецца ў Беластоку". Ну, на жаль, гэта так.

Яраслаў ІВАНЮК:

Таму, напрыклад, кніга пра бежанства Анэты Прымакі-Онішк выдадзена была ў выдавецтве Czarne і таму яна вядомая ва ўсёй Польшчы.

Павал КАСЦЮКЕВІЧ:

Беласток не ёсць заканадаўцам моды. У Беластоку ўсё добра, тут ёсць і сапраўды інфраструктура і шмат людзей, і шмат магчымасцей, але няма выхада на ўсю Польшчу.

Яраслаў ІВАНЮК:

Перакладчыкі ў асноўным тут ёсць.

Павал Касцюкевіч:

Не толькі перакладчыкі, тут культурныя дзеячы, тут будзе прэса. Беласточчына – усё ў парадку. Але Беласточчына не ахоплівае ўсю Польшчу як хацелася б беларускай літаратуры.

Ян Максімюк:

Ну няма выхаду ў Беласточчыны на такія выдавецтвы, для якіх кніжка – гэта бізнес. Вось як Павел казаў пра Wydawnictwo Znak ці Wydawnictwo Literackie ў Кракаве, ці нават гэтае новае выдавецтва, якое немцы заснавалі, Muza, якія проста прадаюць кніжку і на гэтым зарабляюць вялікія грошы. Я хачу трошку сказаць пра гэты перыяд недзе чатырох-пяці гадоў майго супрацоўніцтва з Вроцлавам. Яны таксама, з другога боку Польшчы выдавалі, тая ініцыятыва трошку больш сур'ёзная выглядала за нашую беластоцкую партызаншчыну, бо там былі больш сур'ёзныя дзяржаўныя ўліванні ў гэты Kolegium Europy Wschodniej, там яны бралі таксама грошы ад горада Вроцлава. Ён так прамаваўся як цэнтр культуры і амаль што супернік Варшавы тады. І яны давалі грошы на праграму „Беларуская бібліятэка", якую ажыццяўляла Kolegium Europy Wschodniej. Kolegium Europy Wschodniej – гэта не выдавецтва. Гэта арганізацыя „użyteczności publicznej", як палякі называюць, якая, скажам, будуе добрыя суадносіны з суседзямі, з Украінай, з Беларуссю, з Літвой і так далей. І там праграма выдавецкая – гэта было нешта пабочнае і не самае важнае ў іхнай дзейнасці. Там у іх быў ужо рэдактар у гэтай праграме, не трэба было ўсё рабіць самому, як мы гэта рабілі ў Беластоку, перакладаць, маляваць вокладку і рэдагаваць, і яшчэ ў друкарню несці. Там яны ўжо гэтым займаліся і там быў нейкі намінальны рэдактар. Хаця за гэтыя пяць гадоў, як я з імі працаваў, яны не мелі рэдактара, які б ведаў беларускую мову. І фактычна кніжку Бахарэвіча, на якой стаіць прозвішча нейкай рэдактаркі, я зрэдагаваў, бо ж яна не ведала беларускай мовы, і я мусіў тыя пераклады ў дзвюх трацінах перапісаць, бо тыя дзяўчаты, якія іх рабілі, яны таксама слаба ведалі мову, а Бахарэвіч піша даволі складана. І па-другое, калі ўжо гаварыць пра самыя ганарары, гэта былі такія даволі смешныя грошы. Калі б я не быў зацікаўлены перакладамі, калі б мне не балела душа, каб гэта перакладаць, я б не ўзяўся гэта рабіць, бо грошы яны плацілі такія, што можна было пайсці папрацаваць пры разгрузцы вугалля і за дзень зарабіць больш, чымсьці я зарабіў за апавяданні Арлова ці за версэты Разанава, якія мы тады перакладалі. Ну і яны таксама не мелі кніжнай дыстрыбуцыі, яны тады арганізавалі фестываль, але грошы ў іх былі менавіта, каб угрохаць у яго, запрасіць гасцей, накарміць іх, напаіць, зрабіць адну ці дзве прэзентацыі ва ўроцлаўскіх кнігарнях. Кнігам, якія мы там выдавалі, а выйшла іх пад дзесяць штук, і то даволі добрых аўтараў, варта было зрабіць добрую прамо-

цыю: Разанаў, Арлоў, Бабкоў, Акудовіч там быў, і іншыя добрыя аўтары. Можна было б, каб у іх былі грошы на тое, паехаць у Польшчу, паказаць Акудовіча, Разанава ў Гданьску, у Варшаве і так далей. Гэтым яны не займаліся, таму што яны не былі выдавецтвам. Трошкі сур'ёзней, чым нашая беластоцкая партызанка, але нічога зусім сур'ёзнага. Вось, каб мы мелі выхад на Wydawnictwo Znak. Або на Wydawnictwo Czarne, пра якое ты казаў тут і пра гэтую кніжку Прымакі, яно таксама напалову, здаецца, на грантах цягне, але яно ўжо марку мае, яно выдала добрую літаратуру і некалькіх пісьменнікаў у Польшчы зрабіла вядомымі...

Яраслаў Іванюк:

Ёсць яшчэ такое выдавецтва Bellona, якое ладзіць кірмаш гістарычнай кнігі ў Варшаве, там кожны год прыязджаюць таксама беларускія аўтары, на гэты кірмаш. Вальдэмар Кучыньскі, прэзас гэтага выдавецтва гаварыў, што ў Польшчы, каб зрабіць добрую прамоцыю аўтару, трэба некалькі соцень тысячаў злотых выдаткаваць, каб сапраўды гэты аўтар стаў вядомы. Беларусь мае такія грошы наогул, каб такім чынам прамаваць аўтараў?

Павал Касцюкевіч:

Безумоўна, мае. Парадаксальным чынам Міністэрства культуры беларускае – нягледзячы на тое, што ганім савецкую сістэму, там паўпрацэнта ці колькі ішло на культуру – пераняло тое з савецкай сістэмы і гэтыя грошы ёсць у гадавых бюджэтах Рэспублікі Беларусь. У нас ідзе нейкі працэнт ад нашага валавага прадукту на Міністэрства культуры. Але парадокс у тым, што літаратурай у нас загадвае не Міністэрства культуры, а Міністэрства інфармацыі, а культуры ў нас апякуе ў асноўным тэатры, я так разумею. А газетамі і выданнямі апекуецца Міністэрства інфармацыі, у якім бюджэт значна меншы і магчымасці меншыя, але грошы ёсць. Усё ж такі дзяржава – гэта такая вялікая машына, нават не самая багатая, але грошы ў яе ёсць. Я думаю, што гэта пытанне мэтазгоднасці, калі дзяржава разумее, што гэтае пытанне можа быць ці то нацыянальнай бяспекі, ці то нацыянальных прэферэнцый, тады яна пачынае выдаткоўваць. Я не бачу праблемы прыняцця нейкага рашэння. Грошы ёсць.

Яраслаў Іванюк:

Значыць вырашыць, што грошы лепш выкарыстоўваць на трактары і хакей ці на літаратуру?

Павал Касцюкевіч:

Ну ці там не ведаю, на газеты, на тэатры.

Уладзіслаў Ахроменка:

Павел, але мы забываемся, што ў Беларусі ёсць так званыя „чорныя спісы” пісьменнікаў, музыкаў і гэтак далей. І я не думаю, што дзяржава будзе даваць грошы з гэтай паловы адсотка на людзей ну такіх вось...

Павал Касцюкевіч:

Пасля падзей ва Украіне змянілася, канешне, але так, безумоўна, гэта частка праблемы.

Яраслаў Іванюк:

Так, як я гаварыў напачатку, гэта размова не толькі тут за сталом, але размова з гасцямі, размова з публікай, калі ласка, можа ад вас, шаноўнае спадарства, нейкія пытанні да нашых гасцей.

Мікола Ваўранюк:

Я дапоўню Яна Максімюка наконт дыстрыбуцыі гэтых кніжак перакладаў, якія ў 90-ыя гады ў Беластоку з’явіліся. Я нават адну, не памятаю, ці гэта быў Глёбуса „Дамавікамэрон”, ці гэта была „Анталогія сучаснай беларускай паэзіі”, завёз у Кнігарню Пруса ў Варшаву. Гэта навуковая кнігарня на Кракаўскім прадмесці, не ведаю, ці яна яшчэ там ёсць, была насупраць універсітэту. Нават пяць экзэмпляраў, атрымаў пасведчанне нейкае, паперку, што я туды аддаў і нават пару разоў ездзіў і бачыў, што яна стаяла ў вітрыне, а потым знікла. Але я не пацікавіўся, наогул ніхто з нас не пацікавіўся, яны нічога не адпісалі, можа яна прадалася, а можа ў падвалах гэтай кнігарні яшчэ ёсць, калі не выкінулі на сметніцу. А наконт яшчэ Беластока, ты Яраслаў кажаш, перакладчыкі ў нас ёсць. Калі Ян Максімюк з’ехаў, я не ведаю, хто можа ўзяцца перакладаць, можа Міра Лукша адная яшчэ, з патэнцыялам тым у нас...

Яраслаў Іванюк:

Ну больш, чым у Гданьску. Маем кніжны кірмаш і фонд „Суседзі”, які якраз арганізуе гэты кніжны кірмаш у Беластоку. Ён таксама ўжо некалькі кніжак выдаў – Барыса Пятровіча, Алену Брава, цяпер рыхтуецца да выдання таксама Зміцер Бартосік і Віктар Шалкевіч. Калі ласка...

Госця з залы:

У мяне можа больш такая дыгрэсія і запытанне, што вы думаеце наконт гэтага. Таму што я пачала чытаць кніжку Матэвуша Марчэўскага „Koliste jeziora Białorusi”, якая выйшла ў выдавецтве Czarne. І ў маім пакаленні яна досыць, ну не ведаю, кожны другі ці трэці мой сябар, знаёмы, знаёмая ведае пра гэтую кніжку і вельмі яе даца-

няе. І калі я чытаю, у мяне такія ўнутраныя эмоцыі, ну чаму беларусы не напішуць так прыгожа пра Беларусь.

Павал Касцюкевіч:

Натуральна, з боку лепш відаць. У Беларусі, не ведаю, заспелі знянацку, у сэнсе, у нас цудоўная літаратура, у нас Нобель. У нас сітуацыя такая постсавецкая з аднаго боку, з іншага боку ўвесь сучасны свет ідзе на нас. То бок гэта выглядае як вось, я заўсёды прыводжу прыклад, калі ідзе дэманстрацыя нейкая са сцягамі, з трактарамі „Беларусь", а па баку ідуць маладыя людзі і глядзяць у свае айпады, тыркаюць, у навушніках. Гэта ў нас такая бананавая рэспубліка, дзе сюжэты як бананы, толькі хадзі і зрывай. У нас выдатная з гэтай нагоды літаратура, абсалютна моцная проза менавіта дзякуючы гэтай абсурднай беларускай сітуацыі, толькі пра гэта шмат хто не ведае. У нас выдатныя кніжкі. Пералічваць даволі бессэнсоўна. Літаратуры... не трэба шмат. Дастаткова тры-чатыры кніжкі на год і яны ёсць у нас, да таго, калі літаратура буяе. Калі можа быць застанёмся ў кулуарах, я вам скажу імёны, кніжкі. Выдатная літаратура. Мы ж кажам тут не пра гэта. Мы кажам, што нашыя суседзі пра гэта не ведаюць і не хочуць ведаць. І што з гэтым трэба рабіць. Вось пра гэта мы кажам. А з літаратурай усё добра, з творамі і творцамі ўсё выдатна.

Яраслаў Іванюк:

Згадваны ўжо тут праз вас Бахарэвіч у адным са сваіх нядаўніх тэкстаў напісаў, што грамадства перастала адчуваць у літаратуры патрэбу, бо свята верыць у тое, што ў сучасным свеце можна без яе абысціся. Тады можа і суседзі могуць абысціся без беларускай літаратуры?

Павал Касцюкевіч:

Не думаю, што ўсё сыходзіцца на Беларусі: нас не чытаюць, бо нас не хочуць ведаць. Сапраўды, ва ўсім свеце ёсць шмат працэсаў, якія не звязаныя з Беларуссю. Людзі сталі менш чытаць літаратуры, гэта аб'ектыўна. Тыражы ўпалі да падлогі. Таму я бы так ужо не казаў, што ўсе супраць нас. Зменшылася нейкая кан'юнктура... Майдан, гэта было цікава. Вось тры гады казалі ўсе пра Майдан, таму была ўкраінская літаратура, украінскі аўтар Сяргей Жадан, які збірае тысячныя натоўпы прыхільнікаў у сябе на радзіме і сотні людзей-чытачоў за мяжой...

Яраслаў Іванюк:

Але тым не менш не Жадан і не Андруховіч атрымалі Нобелеўскую прэмію, але Святлана Алексіевіч...

Katarzyna SAWICKA-MIERZYŃSKA:

Ja bym nie przeceniała roli państwa i publicznych pieniędzy. Wspomniał pan o Wydawnictwie Czarne – ono jest „stricte" komercyjne. Tam nie ma żadnych grantów, naprawdę. To jest wielka machina finansowa. A jeżeli chodzi o Instytut Książki, to proszę mi wierzyć, że to jest instytucja upolityczniona. Na przykład teraz Olga Tokarczuk otrzymała nagrodę Bookera za książkę „Bieguni", a jej nazwisko figuruje na liście pisarzy zakazanych przez Instytut Książki – sugestia jest taka, żeby nie zapraszać jej na organizowane zagranicą spotkania czy imprezy literackie.

Павал КАСЦЮКЕВІЧ:

На галоўнай старонцы Інстытута кніжкі знаходзіцца Вольга Такарчук. Зараз яна атрымала Bookera, яна патрапіла на галоўную старонку, нягледзячы на ўсё, што адбывалася з Вольгай Такарчук. Але ўсё ж такі ёсць жа градацыя свабоды, ясна, што ёсць праблемы з левіцай і правіцай у Польшчы, але ўсё ж такі пабольш тут свабоды і гэта адчуваецца. Вольга Такарчук, канешне, на яе падтрымку не возьмеш, але на старонку, што яна атрымала Bookera, гэта ўсё ж такі прайшло. І гэта важна. У Беларусі і не пройдзе, калі нехта атрымаў прэмію з „непажаданых". Усё ж такі тут іншае. І ўсё ж такі фінансы тут граюць важную ролю. Інстытут кніжкі трошкі падштурхоўвае замежных выдаўцоў, каб польскую літаратуру чыталі. Яны не аплачваюць усё, яны плацяць кропкава, ці там перакладчыку, ці там на правы. Яны кажуць, вось паглядзі, у нас ёсць каталог, у нас ёсць трошкі грошай і давай, давай, давай. І не хапае гэтага „трошкі" насамрэч. Бо перакладчыкі ў нас ёсць. Прынамсі ў гэтым пакаленні, не ведаю, што будзе пасля. Перакладчыкі і людзі, якія размаўляюць пра літаратуру. Не хочацца называць іх аматарамі, гэта не аматары. Гэта прафесійныя перакладчыкі, прафесійныя прамоўтары. Трошачкі не хапае, каб гэта адбылося менавіта ў камерцыйным выдавецтве. Гэта вельмі важна. Вынаходзім проста ровар, а гэта даўно ўсё вынайдзена. Трэба, каб выйшла ў камерцыйным выдавецтве, пажадана ў сталіцы.

Сяргей ДУБАВЕЦ:

Я хачу прывесці прыклад з кніжкай Змітра Бартосіка, якая ўзяла ўсе магчымыя прэміі ў Беларусі, незалежныя вядома. І была якраз ідэя запусціць яе на польскі кніжны рынак як менавіта бізнес-праект, ну яна абсалютна на тое надаецца. „Быў у пана верабейка гаварушчы" называецца, гэта пра беларускую гісторыю XX стагоддзя, пра самыя невядомыя і схаваныя старонкі. Добра напісана. Цалкам можа быць папулярнае выданне. Вось Ян Максімюк пераклаў там нейкія кавалкі, аўтар даў гэта ў Інстытут польскі ў Мінску, каб той спрыяў прасоўванню ў Польшчы гэтай кніжкі на нейкае прэстыжнае выдавецтва. І Інстытут польскі сказаў, што трэба ўбраць пэўныя моманты.

Павал Касцюкевіч:

Інстытут Польскі займаецца прамоцыяй польскай культуры за мяжой. Чаму ён павінен прамаўціраваць беларускую культуру ў Польшчы? Гэта проста не іх праца. Таму не зусім зразумела, навошта звяртацца ў Інстытут Польскі ў Мінску.

Сяргей Дубавец:

Таму што гэта ўзаемны працэс.

Павал Касцюкевіч:

Не. Прамоцыя польскай культуры за мяжой, гэта іх праца. Усё.

Сяргей Дубавец:

Але была згода на тое, каб пачытаць гэта, каб зрабіць рэкамендацыю. Дык уперлася ў тое, што бываюць такія моманты, я ж чаму кажу што „лыжка дёгцю", што ў Польшчы вось гэта друкаваць нельга. Там дзе гаворка ідзе пра спаленыя вёскі на Беласточчыне. Вось гэтыя моманты яны „не праханжэ". І я гаварыў з дырэктарам Інстытута, была такая ідэя, што, канешне, мы гэта зробім разам, гэта будзе супер-праект, мы гэта запусцім. Ну пачытаў і сказаў – не.

Яраслаў Іванюк:

Але тут у зале ёсць Анджэй Каліноўскі з Фонду „Суседзі", які якраз рыхтуе гэтую кніжку Змітра Бартосіка, наколькі я разумею, да друку.

Andrzej Kalinowski:

Ale ja chcę państwu w dużym skrócie opowiedzieć, co bym zrobił, żeby literatura białoruska... było o tej literaturze dużo bardziej głośno, niż jest. Mogę podać przykład tej ostatniej książki Bartosika. Dostaliśmy kilka złotych na przekład. Bardzo fajnie. I teraz Fundacja „Sąsiedzi" dokłada na druk, na proste działania i dokładamy powiedzmy cztery tysiące czy pięć, brakuje pięć tysięcy na promocję. Jak to zrobić? Mamy nawyk pisania, czekania na granty. Natomiast ja wierzę jeszcze w inną rzecz. Tak naprawdę nigdy tak się nie stało, że usiedliśmy w 5-8 osób, może Urząd Marszałkowski, może Leon Tarasewicz, może ja, może ktoś od państwa i żebyśmy zrobili porządek z tym wszystkim. Szukamy dziesięciu książek w roku, które są ważne, wybieramy z tych dziesięciu – pięć książek. Na każdą książkę, żeby zrobić dobrą promocję w Polsce, a Polska może być dobrym przeskokiem dalej na Zachód, potrzeba dwudziestu tysięcy. Z jednej strony to jest dużo, z drugiej strony to jest mało, bo wierzę w jedną rzecz. Nawet u nas na Podlasiu zdobycie dwudziestu tysięcy od sponsorów kiedy byśmy mieli jeszcze kilka osób, które dawałyby nam dobre rekomendacje, to tylko trzeba by było uporządkować, wierzę że

to nie są wielkie pieniądze, to jest trzech przedsiębiorców po pięć czy siedem tysięcy. To jest do załatwienia. Nigdy nie zrobiliśmy prostej rzeczy. Mamy pieniądze czasami na tłumaczenie, na wydanie, nigdy nie mieliśmy na promocję. Czas po prostu wydać książkę i powiedzieć: powinniśmy mieć 5-7 tysięcy na promocję. Dwa tysiące dwóm-trzem blogerom, których się czyta, bo teraz przez media społecznościowe książki się sprzedaje i promuje. Możemy poprosić kilku redaktorów, możemy w „Gazecie Wyborczej" gdzieś dać płatne artykuły. Nie wezmą wielkich pieniędzy, tylko jakieś pieniądze trzeba tam im dać. Zrobić po prostu porządek. Więc potrzebna by była taka mała rada. Jest przecież „Niwa" jeszcze, jest kilka firm, instytucji i ludzi, którzy mogliby to uporządkować. Tylko to się nigdy nie stało. My rozmawiamyileś lat o tym wszystkim i nic się dalej nie dzieje. Myśmy zaczęli coś robić, tylko musimy pójść dwa kroki dalej. I pytanie, jak zrobić te dwa kroki.

Яраслаў Іванюк:

Andrzeju, to może skoro ty masz pięć tysięcy na druk, a nie masz pięciu tysięcy na promocję, to może zrezygnować z książki drukowanej, jeżeli teraz w mediach społecznościowych książki się sprzedają, to może lepiej będą się w tych mediach sprzedawały- książki elektroniczne. Zrezygnujmy z druku i będziemy mieć na promocję.

Аліна Ваўранюк:

Не ведаю, на якой мове гаварыць маю, ці на польскай, ці на беларускай. Не выходзяць кніжкі толькі і выключна ў pdf-ах ці e-booki, а выходзяць таксама друкам. І так, і так. Andrzej, wydają się i papierowe i e-bookowe, i nie zawsze e-booki są. Так, бо мы прывыкшыя яшчэ ўсе гартаць паперу. Гэта па-першае. Па-другое, думаю, што калі гаварыць пра пераклады беларускай літаратуры, то не ў інстытуты, а трэба проста кіравацца да канкрэтных выдавецтваў. І толькі і выключна гэтыя выдавецтвы могуць дапамагчы. І яны таксама займаюцца не толькі тым, што перакладаюць, што друкуюць. Wiem Andrzej, też o tym mówiłeś, o dystrybyciji. Але таксама арганізуюць вялізныя прамоцыі. Слухайце, два гады таму назад здаецца сядзела тут сярод публікі Моніка Шнайдэрман – Wydawnictwo Czarne. І яна сказала, што не бачыць нічога цікавага ў беларускай літаратуры, каб можна было выдаваць. Жадана і Андруховіча якраз Czarne выдае. З другога боку, ну слухайце, беларускія аўтары таксама атрымоўвалі розныя ўзнагароды даволі прэстыжныя, не толькі ў Беларусі.

Мікола Ваўранюк:

Паколькі маю мікрафон па-суседску, family-business, то яшчэ маю адно пытанне да калег з Беларусі. А што адбываецца пасля прызнання прэміі Гедройца, бо ўсе пішуць, у газетах, усе СМІ прыводзяць, якая там вялікая куча грошай трапляе аўтару,

некаторыя аўтары дзеляцца з рэдактарамі гэтымі грошамі. Але там здаецца ўмова таксама такая, што гэтая кніжка выходзіць, кніжка-пераможца выходзіць ці павінна, у перакладзе на польскую мову. Ці з адна з гэтых кніжак, ну чуем гісторыю „Верабейкі", але ці ранейшыя кніжкі выйшлі ў перакладзе, ці гэты працэс хто-небудзь давёў да канца, ці ўсё так адбылося, як з гэтай нашай кніжкай, з нашым перакладам у Варшаве, што занеслі і потым ужо ніхто не цікавіўся, што з ёю.

Валянцін Акудовіч:

Дайце сябру журы. Я сябра журы прэміі Гедройца. Дарэчы, прашу ўсіх прадстаўляцца, а то слова бяруць, але не ўсе ўсіх ведаюць. Я ўжо чацвёрты раз сябра журы прэміі Гедройца. Тры разы быў, потым зышоў у адстаўку, зараз зноў у гэтым годзе. Мы ўжо вызначылі лонг-ліст і па сакрэту скажу, шорт-ліст, але ён не друкуецца пакуль з розных умоў і з мяне вы не выціснеце ні слова. Да пытання шаноўнага, папярэдняга і любімага. Не, першае месца было дзесяць тысяч рублёў, зараз пяць тысяч рублёў і гэтым абмяжоўваецца. Так, за першае месца больш ніякіх прэферэнцый няма. А вот там другое, трэцяе ў розныя гады, так ёсць і, ці бывала скажам так, адсылка да перакладу, трэцяе месца адпачынак там у Швецыі, у іншай краіне. Ну вот так. Карацей кажучы, за першае месца акрамя дзесяці тысяч, або пяці тысяч, больш нічога.

Яраслаў Іванюк:

Дзякуем. Я яшчэ Анджэя Каліноўскага хацеў бы запытаць. Pan przygotowuje Bartosika do druku, przewiduje Pan tam jakąś cenzurę tak jak tutaj była sugestia, że Instytut Polski miał takie akurat życzenie.

Andrzej Kalinowski:

Nie ma żadnej cenzury. To już jest gotowe, w tej chwili robimy tylko redakcję, ale i pójdzie to sobie, na tyle ile potrafimy o tym powiedzieć w Polsce – powiemy. Natomiast ja chcę wrócić jeszcze na chwilę, kilka zdań. Nie czekajmy na żadne duże wydawnictwa, bo to jest mit, możemy się tym mitem oszukiwać przez następne dziesięć lat. Potrzeba w cudzysłowie kilku wariatów, którzy się razem spotkają, zaskoczą, bo to w pewnym momencie coś musi zaskoczyć, i zaskoczymy ludzi w Polsce, bo wykonamy pracę, którą należy wykonać. Nie wykona tego jedna osoba, dwie osoby. Jedni drugim muszą podpowiedzieć, musimy znaleźć kilka złotych i nie żadne Wydawnictwo Znak czy Czarne, tylko wydawnictwo, które potrafi się dogadać z pięcioma osobami, które nagłośnią tę książkę. Oni oczywiście chcą przeważnie kilka złotych, i trzeba tych kilka złotych znaleźć. I będzie tak samo, jak ze Znakiem czy z Czarnym, czy z wszystkim innym.

Яраслаў Іванюк:

No dobra, szanowni Panowie. To kto z was pisze się na etat wariata do Andrzeja Kalinowskiego? Можа так у адводцы да гэтага, пра што Анджэй Каліноўскі сказаў пра такую раду, стварэнне...

Сяргей Шупа:

Сапраўды, я думаю, тут дастаткова вар'ятаў сядзіць, каб тут жа ж не заставацца пры словах, а пачаць ажыццяўляць прапанову, якая мае вялікі сэнс.

Яраслаў Іванюк:

Andrzej, chyba widzisz, że jest tu otwartość na twoją propozycję...

Сяргей Шупа:

У мяне яшчэ маленькае пытанне да шаноўнага члена журы. Мы ведаем, што выхад кніжкі ў польскім перакладзе – гэта была заўсёды другая прэмія. Колькі кніжак, якія атрымалі другую прэмію, выйшла ў польскім перакладзе? Я ведаю чалавека, які гэтых другіх прэмій атрымаў штук пяць. Колькі ягоных кніжак выйшла ў Польшчы?

Валянцін Акудовіч:

Шаноўны спадар Сяргей. Пытанне было пра першую прэмію, я на першую і адказваў. Я магу вам сказаць, хто ў нас лідар па другіх месцах, і сакрэту тут няма – Альгерд Бахарэвіч. І я думаю, уся літаратурная краіна зараз чакае чарговага Гедройца найперш таму, што там зноў на тысячу старонак кніга „Сабакі Еўропы" Альгерда Бахарэвіча, якая чамусьці называецца раман, гэта самае, да... Што будзе з бедным Альгердам Бахарэвічам, калі раптам ён у чацвёрты ці пяты раз атрымае не першую, а другую прэмію. Гэта драма з трагедыяй неверагодная, я сам баюся як сябар журы, бо кухталёў ён мне надае таксама ў карак, таксама я магу быць абсалютна вінаватым. А з перакладам: я ведаю, што на рускую мову „Сабакі Еўропы"...

Сяргей Шупа:

Дык колькі выйшла другіх месцаў у польскім перакладзе паводле ўмоў прэміі?

Валянцін Акудовіч:

Не знаю. Мусіць адзін, сапраўды. Астатнія не... Ну, я не знаю чаму, прабачце, гэта не пытанне да сябра журы. Як Максімюк казаў, што ён не кантралюе дыстрыбуцыю тых, што перакладае, так і я як сябра журы не кантралюю і не надта можа і цікаўлюся.

Ян Максімюк:

Я чуў, што адна кніжка выйшла з другога месца і што гэта было некалькі гадоў таму назад. Кніжка Аляксандра Лукашука „След матылька”. Гэта сапраўды была другая ці трэцяя ў Гедройца, не помню ўжо, у якім годзе. Але яна ва Вроцлаве якраз выйшла, выдаў яе Kolegium Europy Wschodniej. Па-мойму, гэта было звязана з Гедройцем. Ці выходзілі іншыя кніжкі, я не прыгадаю.

Яраслаў Іванюк:

Гэта таксама пытанне дыстрыбуцыі, бо напрыклад я цікаўлюся гэтымі кнігамі, якія выходзяць з беларускай літаратуры на польскай мове, і паколькі іншыя, выдадзеныя Kolegium Europy Wschodniej маю, бачыў прынамсі, то вось гэтай кнігі Аляксандра Лукашука я не бачыў. Тут яшчэ было пытанне.

Яна Шостак:

Так, быў каментар. Яна Шостак. Шмат чаго назбіралася, выбачыце. Я проста тут парываюся, як такое маладое пакаленне, якое ведае, што трэба грошы, каб магчы дзейнічаць і існаваць, але можа давайце навучымся карыстацца, карыстаць з капіталу сімвалічнага, які побач знаходзіцца з намі, каторы можна браць і выкарыстоўваць дзеля супрацоўніцтва. Я ўсё скланяюся к таму, што калі б быў іншы прэзас Фонда „Villa Soktates”, то не ведаю, ці была б тут хоць палова людзей. І мне падаецца наконт літаратуры, кніжак, таксама як я звязаная больш з мастацтвам, ведаю, што калі ідэя „сэксі”, то і знойдзецца выдавец, і знойдуцца людзі, якія будуць чытаць, і знойдуцца людзі, якія будуць прамаваць і таксама, канешне, сіла ў групе, моц у групе, але сіла „jednostki” яна не менш важная. І мне падаецца, я як мастачка яшчэ год таму, два гады таму, каб мне хто сказаў пра маю працу, звязаную са спробай увядзення слова „nowak” замест „uchodźca”, што будзе знаць ну давольна такі шмат людзей і ў медыях мне атрымалася распрапагаваць гэту ідэю будучы адной, карыстаючыся можа часам з таго, што, напрыклад, у „Wyborczej” напісалі пра мяне, таму што маім прамоўтарам быў Міраслаў Балка. І вось гэтае супрацоўніцтва на ўзроўні з капіталам сімвалічным, канешне, грошы патрэбны для прамоцыі, але ёсць вельмі шмат і альтэрнатыў, толькі трэба ўключыць свой крэатыў.

Яраслаў Іванюк:

To znaczy Lonik jest na pewno „seksi”. А ці „сэксі” ёсць беларуская літаратура?

Ян Максімюк:

Калі можна дапоўніць, бо тут гаварылі, я ўжо забыўся, хто казаў пра гэтую Моніку Шнайдэрман, якая казала, Аліна, так – што беларуская літаратура нецікавая і няма

там чаго перакладаць. Працягваючы „чорную нітку”, я хачу вам яшчэ адзін голас, я спецыяльна з Прагі прывёз сабе, занатаваў гэтую цытату. У 2014 годзе, здаецца, мы былі з Сяргеем, мабыць і Павел тады быў, на кніжным кірмашы ў Ляйпцыгу. Там якраз была ўкраінская імпрэза. Вядома, Майдан, час быў свежа па Майдане, там было пра Расею, Крым і так далей, і там украінцы былі галоўным пунктам зацікаўлення, ну але там, скажам, з боку-прыпёку былі і беларусы. Там можна было і Андруховіча пабачыць, і Жадана, і мы з імі парабілі інтэрв'ю, але была таксама адна асоба, якая працуе, скажам так, у літаратурных колах Нямеччыны, яна зарыентаваная ўвогуле ў літаратурнай і культурнай сітуацыі Цэнтральнай Еўропы і Усходу таксама. Яна называецца Катарына Нарбутовіч, прозвішча ў яе такое славянскае, відаць па мужу... Яна цяпер даволі вядомая як адміністратарка нямецкага фонду дапамогі мастакам з Усходняй Еўропы. Але яна працавала як лектарка ў выдавецтве ў Нямеччыне. Лектарка – гэта такая асоба, якая чытае кнігі, ці беларускія, ці ўкраінскія, і для выдавецтва рэкамендуе, што цікавае і вартае выйшла. А зараз яна ў гэтым фондзе дапамогі мастакам Цэнтральнай Еўропы працуе. Я б сказаў, як на мой густ, гэта адна з двух-трох асоб у Нямеччыне найлепш сарыентаваных у сітуацыі беларускай літаратуры, яна перакладала Вальжыну Морт, два ейныя зборнікі пераклала на нямецкую мову. Адзін зборнік, паколькі там былі вершы і на ангельскай мове Вальжыны Морт, перакладала ў супрацоўніцтве з іншай перакладчыцай. Але я з ёй зрабіў інтэрв'ю і я вам хачу прачытаць два пытанні і ейныя адказы. Я ёй задаў пытанні наконт прывабнасці ці непрывабнасці беларускай літаратуры. Варта паслухаць, што яна кажа. Справа не ў тым, ці я пагаджаюся, ці не пагаджаюся, паколькі я быў журналістам, то мне з ёй спрачацца не было трэба, я проста ставіў пытанні, яна – адказвала.

Максімюк: А як вы глядзіце на папулярызацыю беларускай літаратуры ў Нямеччыне? У чым тут галоўная праблема – у тым, што людзі на Захадзе наогул не чулі або мала чулі пра Беларусь, ці ў тым, што ў Беларусі няма цікавых аўтараў, скажам, аўтараў еўрапейскага фармату?

Нарбутовіч: З Беларуссю нам значна цяжэй, чым з Украінай. Як вам сказаць? У Беларусі няма такіх яркіх фігур, як ва Украіне, як Андруховіч або Жадан. Я вельмі рада, што ўрэшце пераклала Валянціна Акудовіча, таму што з ягонай дапамогай можна лепш зразумець, чаму ў Беларусі ёсць так, як ёсць, а чаму ва Украіне – па-іншаму. Мне здаецца, што і з мовай у Беларусі больш праблематычна...

Максімюк: Чаму больш праблематычна? Таму, што немцам цяжэй вывучыць беларускую мову, чым украінскую або расейскую? Ці таму, што і беларусам цяжка яе вывучыць належным чынам?

Нарбутовіч: І першае, і другое. Беларускае мова ў Беларусі – як пакінутае, нелюбімае дзіця. Я не ведаю, як вам выйсці з гэтай сітуацыі, і зараз кавалак найважнейшы. Але мне здаецца, галоўная праблема тут у тым, што беларусы да гэта часу ўсё яшчэ спрабуюць выдумваць кола нанава, з нуля... Вось на Украіне, напрыклад, значна больш людзей гавораць на іншых мовах, больш чытаюць на іншых мовах, больш сочаць за сусветнай літаратурай і культурай не толькі на расейскай мове, але і на іншых мовах. Мне здаецца, гэта важная розніца паміж украінцамі і беларусамі. Чаму ў нас так прыхільна рэагуюць на Вальжыну Морт? Таму што ў яе шырокі далягляд. Яна ведае не толькі беларускую культуру ці расейскую культуру, але і польскую, ангельскую, амерыканскую, карацей – сусветную. Скажам так: Вальжына Морт не варыцца выключна ў беларускім гаршку. Мне часам здаецца, што беларусы зашмат сядзяць толькі ў сваім гаршку...

Вось так нас бачаць людзі з Захаду, нашую літаратуру і нашую сітуацыю. Я ўжо з гэтым нейкіх высноў рабіць не буду, проста падкідваю да дыскусіі. Павел сказаў пра адну адказную даму з выдавецтва Znak, якая паведаміла, што ў Беларусі зацікаўлення беларускай літаратурай бракуе і праз тое, што ў Беларусі няма Майдану. А тут маем як бы іншае бачанне. Трохі набліжанае да таго, пра што сказала Аліна, то бок Захад нас бачыць – і Польшча, і Нямеччына – як мала цікавую літаратуру, бо мы для іх занадта, як кажуць, „засцянковыя" і як бы „свае", а заслаба адкрытыя на сусветны культурны кантэкст.

Яраслаў Иванюк:
Беларуска Святлана Алексіевіч атрымала ўсё ж такі Нобелеўскую прэмію. Выкарысталі гэта беларусы дастаткова добра для прамоцыі беларускай літаратуры ў свеце? Коратка, таму што ўжо нашая дыскусія да канца памалу падыходзіць.

Павал Касцюкевіч:
Так, выкарысталі. Калі зусім коратка: выкарысталі, але імгненна гэта не дапамагло. Адразу пасля атрымання Нобеля „Books from Belarus" зрабіла з дазволу спадарыні Святланы вялікі стэнд са спадарыняй Святланай „Нобель у нашых руках", маўляў, „вось наш нобель, а вось побач во яшчэ на іншых нашых беларускіх аўтараў". Гэта абсалютна быў разумны, прагматычны ход, я ўжо тады не быў у „Books from Belarus", але гэта было выдатна, каманда добра спрацавала. То бок, карыстаючыся Святланай Алексіевіч, карыстаючыся ёй як лакаматывам, запусціць беларускую лінейку далей. Прайшло мала часу, але гэта, думаю, дало плён, але пакуль мы яшчэ яго не бачым. Вось такіх прамых замоў на тых аўтараў, якія пайшлі вагончыкамі за Святланай Алексіевіч.

Яраслаў Іванюк:

Дарэчы, шмат было наогул спрэчак, наколькі Святлана Алексіевіч – гэта беларуская літаратура? Сяргей, ты адназначна выказваўся пра тое, што напэўна беларуская. Не мусіць яна пісацца на беларускай мове, каб была беларускай?

Сяргей Шупа:

У нас было вельмі шмат дыскусіяй, і я прыйшоў да высновы, што трэба быць вельмі асцярожнымі ва ўжыванні этнічных эпітэтаў у дачыненні да слова „літаратура". Таму што ці лічыць таго або іншага пісьменніка беларускім, будзе залежаць ад таго, што кожны канкрэтны чалавек лічыць беларускай літаратурай. І тут, я думаю, на 10 мільёнаў жыхароў у нас будзе 10 мільёнаў варыянтаў адказу. І аднаго аб'ектыўнага крытэрыя ніколі не будзе, таму што камусьці важнейшая мова, камусьці важнейшая прыналежнасць да зямлі, да краіны, да культуры. Як вымяраць такую прыналежнасць – таксама невядома. Што тычыцца мовы, таксама няясна, такая якая-небудзь, не ведаю, Анхела Эспіноса Руіс, якая піша толькі па-беларуску паэзію, – яна беларуская паэтка? Я думаю, што тыя, хто кажа, што Алексіевіч не беларуская, таму што піша па-расейску, яны будуць мець праблему адказаць на гэтае пытанне, таму што яно перакрэсліць іхні „прысуд" Алексіевіч. Я выступаю за тое, каб мы падыходзілі да гэтага пытання інклюзіўна. Усё, што не супраць нас – ёсць з намі. Напрыклад, я чалавек з Мінску, мне ўсё мінскае дарагое, і вось адзін з самых лепшых мінскіх раманаў напісаны ў абсалютна чужой нам расейскай літаратуры, гэта кніжка Сяргея Юр'енена „Фашыст праляцеў". Ён гэты Мінск ненавідзіць, але там проста так тапаграфічна, так фізіялагічна апісана, што гэта вельмі добрая кніжка, але яна не беларуская літаратура, хоць там тэма 150 працэнтаў беларуская. І такіх прыкладаў будзе мора. Зноў жа, мы гаварылі сёння пра тутэйшых пісьменнікаў, якія этнічныя беларусы, але пішуць па-польску. Яны беларускія пісьменнікі? Яны польскія пісьменнікі?

Яраслаў Іванюк:

Сёння я якраз больш прыхільнік таго, што Святлана Алексіевіч не да канца беларуская пісьменніца. Сяргей мяне раніцай за сняданкам пераканаў усё ж такі, прывёўшы прыклад Юркі Плютовіча. Вось, бо мне здаецца ўсё ж такі, што гэта беларускі пісьменнік, а піша на польскай мове.

Сяргей Шупа:

Калі б палякі яго лічылі польскім – калі ласка, мы не будзем з імі спрачацца. Калі нехта будзе цягнуць Алексіевіч у расейскую літаратуру – гэта іх праблема. Я думаю, мусяць тут гэтыя палі спакойна перакрывацца, і ад гэтага сусветная літаратура

і культура толькі выйграюць. Алексіевіч – яна не расейская пісьменніца, яна недзе над гэтымі этнічнымі межамі. І таму яна і прайшла. Але і тут яна, напэўна, павыходзіла ў самых вялікіх камерцыйных выдавецтвах пасля Нобеля, а пра гэта мы забываем і зараз плачам... Дык давайце хоць нечаму парадуемся.

Аліна Ваўранюк:

Яе раней павыдавалі, і якраз Czarne выдавала.

Сяргей Шупа:

Тым больш, і добра. Мы забыліся, што ў нас ёсць такія прыклады. І гэта там не нейкія старыя, нават Васіль Быкаў, Янка Брыль, якія выходзілі ў сацыялістычныя часы па нейкіх іншых квотах. Але гэта ўжо вольны рынак, гэта вольны свет, гэта літаратура, якая прадаецца.

Яраслаў Іванюк:

Менш вядомая пісьменніца з беларуска-ўкраінскага памежжа Наталка Бабіна. Яна беларуская, украінская пісьменніца?

Уладзіслаў Ахроменка:

Як на мой погляд, тое, што Наталка Бабіна напісала беларускай мовай, гэта адносіцца да беларускай літаратуры. Калі яна будзе пісаць украінскай мовай, гэта будзе адносіцца да ўкраінскай літаратуры. Гэта маё такое асабістае перакананне. Што тычыцца Алексіевіч, то ўсё ж такі ва Украіне, сярод украінскіх калег, яна не ўспрымаецца імі як беларуская пісьменніца менавіта з прычыны таго, што піша расейскай мовай. Гаворыш з украінскімі калегамі, і яны неяк так, Алексіевіч яна неяк так на ўзбочыне, па-за кантэкстам. Ну гэта проста стаўленне ўкраінцаў, якое я проста прэзентую тут.

Сяргей Шупа:

Проста гэтая катэгарызацыя, магчыма, важная для паліцы ў кнігарні. Вось літаратура такая, літаратура такая. Але, скажам, прыедзьце ў Нямеччыну, і ў раздзеле свая, дамашняя літаратура, там будуць стаяць і аўстрыйскія, і швейцарскія пісьменнікі, так што...

Уладзіслаў Ахроменка:

У камерцыйных выдавецтвах, там усё ж такі іншая каталагізацыя. Там ідзе такое: прыгоды, фантастыка, дзіцячая літаратура. Там вось такі падзел, а не нацыянальны.

Яраслаў Іванюк:

Павал, ставім кропку.

Павал Касцюкевіч:

Я за „стратэгію норкі”: усё, што наша, на палову наша, цягнем да нас. Адам Міцкевіч, Сяргей Пясецкі, гэта нашыя. Святлана Алексіевіч, пісала пра беларусаў, наша. Мэндэле Мойхер-Сфорым пісаў пра габрэяў у Беларусі, Мойшэ Кульбак пісаў пра мінчан, яны ўсе нашы, цягнем да сябе, перакладаем на беларускую, і з гэтым ідзем, паказваем усяму свету, што вось мы ёсць. Як нашы.

Яраслаў Іванюк:

Падсумоўваючы: патрэбныя грошы, аўтарытэтныя адзінкі і праграмная рада дзеля прамоцыі беларускай літаратуры хаця б тут, у Польшчы. І запускаем рухавік. Дзякую сардэчна за размову.

Лёнік Тарасэвіч:

Ну то я цяпер як шведскі мастак скажу, што маем перапынак поўгадзіны. Кава ёсць у галерэі, a goście którzy posługują się językiem polskim mogą zwiedzić teraz wystawę, bo Andrej Durejka będzie oprowadzał w języku polskim. Dziękuję bardzo, spotykamy się o pierwszej.





XIX ТРЫЯЛОГ

Сімпазіён „Belarusian outside”

Каўказская сінагога ў Крынках, 1 верасня 2018

XIX TRIALOH

Sympozjon „Belarusian outside”

Synagoga Kaukaska w Krynkach, 1 września 2018

частка II / część II

СМІ / MEDIA

Лявон Тарасэвіч:

Пачнём цяпер ужо частку, звязаную з журналістамі. Калі ласка.

Ярослаў Іванюк:

Добры дзень яшчэ раз, вітаю ўсіх, можа новыя ёсць госці. Закончылі мы нашую дыскусію, прысвечаную культуры. Цяпер будзем разважаць пра сродкі масавай эміграцыі, пра тое (*смех у зале*) інфармацыі... „трэба цягнікоў сюды даставіць трошкі". Фройд меў быў прастору... Ну гэта проста так... Можа гэта таму, што ўсе з запрошаных гасцей, звязаных з журналістыкай, мелі ці маюць дачыненне да гэтых жа эміграцыйных ці па-за межамі Беларусі сродкаў масавай інфармацыі, усё ж такі. Гавораць, што сродкі масавай інфармацыі – гэта чацвёртая ўлада. Тут пачнём ад Сяргея. Сяргей Дубавец выдаваў яшчэ падпольныя часопісы. Быў рэдактарам газеты „Свабода", заснавальнікам адроджанай у Вільні ў пачатку 90-х гадоў „Нашай Нівы", пазней „Балтыйская хваля", Радыё Свабода. Мікола Ваўранюк – чарговы ўдзельнік гэтай дыскусіі, у студэнцкія гады быў адным з рэдактараў часопісу „Сустрэчы", пазней тыднёвік „Ніва", цяпер Радыё Рацыя, вітаем, як у тэлебачанні цяпер так, воплескі... Павал Мажэйка пачынаў у легендарнай „Пагоні", цяпер вядучы тэлепраграм у Белсаце, які вяшчае з Варшавы, вітаем... Мне таксама давялося працаваць у сродках масавай інфармацыі, якія вяшчалі з па-за межы Рэспублікі Беларусь у Рэспубліцы Беларусь для беларускага слухача, таму што даводзілася мне пяць гадоў працаваць на Радыё Рацыя, надалей супрацоўнічаю з беларускай рэдакцыяй Польскага радыё для замежжа, таксама працую ў Радыё Беласток, дзе ствараюцца перадачы „Пад знакам Пагоні". Мне здаецца, што медыя маюць крыху большую магчымасць рэальнага ўплыву на грамадства, таму што далёка не кожны, хто чытае газету, слухае радыё, глядзіць тэлеканалы сягне па кніжку, прачытае нейкі літаратурны твор з гэтай вышэйшай полкі. Тады і на нас як на журналістках, ну можна сказаць, спачывае нейкая большая адказнасць перад тым жа грамадствам, каб перадаць нейкія ідэі, якія паводле тэксту Кастуся Бандарука не маюць ніякіх меж, таму нас і не абмяжоўвае тое, што мы можам вяшчаць, перадаваць нейкую інфармацыю з па-за межы Рэспублікі Беларусь. Ці мы спраўляемся з гэтым, ці гэта пад нашу сілу, каб гэтым усё ж такі займацца, Сяргей?

Сяргей Дубавец:

Мы, безумоўна, спраўляемся. Мы робім не толькі ўсё, што можам, але і больш, чым можам, таму што мы ўсе ў Беларусі працуем з вялікай доляй энтузіязму. Беларусь увогуле ўнікальная краіна ў тым сэнсе, што ў ёй існуе такі феномен як дзяржаўныя медыя. Прычым гэта не адзін нейкі тэлеканал, а гэта ўся тэлевізія дзяржаўная, усё радыё дзяржаўнае і плюс там 150 газет, якія выходзяць, і часопісаў – гэта ўсё дзяр-

жаўнае. А дзяржаўныя медыя – гэта не столькі журналістыка, колькі ідэалогія, гэта прапаганда, падтрымка дзяржаўнай улады. Уласна прафесійная журналістыка, тое, што мы называем журналістыкай, а не прапагандай, у Беларусі ўсё недзяржаўнае, і яно існуе, як я ўжо сказаў, з вялікай доляй энтузіязму, яно ўвесь час пад прэсінгам. Тыя ж „белсатаўскія" журналісты, як мы ведаем, сотні штрафаў атрымліваюць, іх там хапае міліцыя, яны ўсё адно здымаюць, яны ідуць на гэта. Зразумела, што гэта матывуецца не толькі іхнімі заробкамі, і не столькі іхнімі заробкамі, колькі місіяй. У Беларусі ўсе недзяржаўныя журналісты матываваныя сваёй місіяй. Вось. Яшчэ хацеў бы сказаць, што вельмі слушна агаварыўся Яраслаў пра „сродкі масавай эміграцыі", таму што часта мы сваё існаванне ў Беларусі называем унутранай эміграцыяй. Мы жывём у краіне, а як бы не ўзаемадзейнічаем з дзяржавай. Дзяржава – абсалютна ёй няма спраў да тых ідэй, якімі жывём мы, да ідэй нейкага духоўнага развіцця, асветы нацыянальнай, такіх рэчаў у дзяржаўных медыя практычна няма. Гэтую місію выконваюць недзяржаўныя медыя. Так было і за савецкім часам, калі ў 80-ыя гады, да прыкладу, мы проста зачытваліся беластоцкай „Нівай", таму што такіх проста журналісцкіх прадуктаў у Беларусі не было, была прапаганда і ўсё, праўда, яшчэ „эзопава мова", можна была між радкоў вычытваць нейкую праўду. А тое, што мы чыталі ў „Ніве", там гэтая праўда пісалася проста вось не толькі таму, што „Ніва" займалася беларускай асветай, а самае галоўнае таму, што гэта была проста журналістыка, якой проста ў савецкія часы не было. Пасля адбылася такая метамарфоза, гэта „Ніва" стала „Нашай Нівай" як бы. Сёння „Ніву" мы не чытаем у Беларусі, ну прынамсі так, як мы чыталі ў 80-ыя гады...

Яраслаў Іванюк:

Не чытаеце, бо яна не трапляе, ці проста знікла зацікаўленне тым, што піша „Ніва"?

Сяргей Дубавец:

Знікла зацікаўленне і сама „Ніва" стала абсалютна іншай. Яна змяніла свой характар, яна цалкам зарыентавалася на дыяспару, тады ў яе была нацыябудаўнічая місія.

Яраслаў Іванюк:

На нацыянальную меншасць я б сказаў, нас дыяспарай я б тут не называў.

Сяргей Дубавец:

Добра, я соры. Дзе разбярэшся, што скажаш. Яна выконвала нацыябудаўнічую функцыю для ўсёй Беларусі, мы чыталі артыкулы пра беларускіх папярэднікаў, ды

пра ўсіх. Тарашкевіч прыйшоў у галаву, пра Тарашкевіча ў Беларусі пісаць было нельга. А тут Бергман пісала пра яго артыкул. Тыя ж Луцкевічы, іх проста згадваць было нельга, забаронена. „Ніва" пра іх пісала. Яна была проста разняволенай, я не ведаю, можа вы так гэта не ўспрымаеце, тут усё ж такі ПНР і ўсё такое, а там „Дом вясці не задам трасці". „Толькі скнара і лянівы не выпісвае «Нівы»". Ну гэта ж любата...

Яраслаў Іванюк:

„Чытай «Ніву» і ў жніва..."

Сяргей Дубавец:

Гэта было проста прыгожа, па-беларуску, сваё, адкрытае. Але цяпер яна для нас знікла, у нас з'явілася „Наша Ніва". Але нібы гэта тая беластоцкая прыехала ў Беларусь, будучы такою, стаўшы такой унутранай эміграцыяй. Вось такая сітуацыя, але вяртаючыся да пытання, безумоўна, пад усімі гэтымі прэсінгамі мы выжываем, мы пашыраемся, мы пашыраем свой уплыў, зараз мы перайшлі ў электронныя медыя. Тая ж „Наша Ніва" – адна з лідараў па чытанню прэсы ў інтэрнэце. Тое ж Радыё Свабода таксама. І прычым тыя замежныя медыя, што Белсат, што Радыё Свабода, што іншыя, яны ўсё робяць палявую работу ў самой Беларусі, інакш бы яны проста страцілі аўдыторыю. А так гэта дадае ім і аўтарытэту, і сувязі з рэчаіснасцю. Мы працуем.

Яраслаў Іванюк:

Не так проста займацца місіяй будучы, напрыклад, журналістам тэлеканалу Белсат, а яшчэ да гэтага так, як гаворыць Сяргей Дубавец, працаваўшы там у Беларусі, у гэтым полі беларускім, не маючы акрэдытацыі, будучы там непрызнаным. Як выглядае, Павал, гэтая вашая місія, гэтая праца над місіяй тэлеканалу?

Павал Мажэйка:

Ну па-першае, добры дзень і дзякуй шчыры арганізатарам за магчымасць прыехаць сюды і таксама ўдзельнічаць у дыскусіі з людзьмі, якія для мяне аўтарытэты, як у прафесіі, таксама і ў беларускасці. Але я хацеў бы можа быць на іншую тэму, падзяліцца такой гісторыяй, якая абсалютна свежая, у Гародні ўбачаная і пачутая на гэтым тыдні, якая тычыцца якраз уплыву медыяў. Шмат кантактую з маленькімі дзеткамі, там 6-7 гадоў у сваім панадворку. Не ведаю чаму, але любяць мяне, называюць „дзядзя Паша". Але сэнс у чым. Адна з апошніх размоў на панадворку была пра тое, што бацькі адной дзяўчынкі пабудавалі альтаначку, як аказалася не зусім законна, і цяпер гарадскія ўлады загадалі яе збурыць. І вось тая дзяўчынка мне абурана кажа: „але ж Пуцін дазволіў!". Я спачатку нейкага падвоху не пачуў, пытаюся

„як Пуцін?" – „ну, он жа ж прэзідэнт наш", адказвае дзяўчынка. Другая гісторыя. Наступнага дня. З хлопчыкам мы языкамі зачапіліся, хто з чым есць піццу, ён кажа: „я люблю з нашай расійскай колай". Ізноў пытаюся: „як расійскай колай?". І ўжо са спартовага інтарэсу пытаюся ў дзетак, якія былі побач: а хто кіруе Беларуссю – „Ну, як хто, Пуцін!". „А каго яшчэ ведаеце?" – кажуць: „Мядзведзева ведаем". І я задаю пытанні і аднаму, і другому чалавеку, гэтым маленькім, будучае ж нашае пакаленне, пытаюся ў іх, „а хто Беларуссю кіруе?" Я ніколі не мог падумаць, што я праз 24 гады буду чакаць ад іх, прагнуць, каб яны сказалі, што Беларуссю кіруе Лукашэнка, гэтага я не мог сабе ўявіць. Але яны абсалютна не ведалі, хто кіруе Беларуссю. Важная вельмі для мяне выснова: мы сапраўды жывёму Беларусі ў расейскай інфармацыйнай прасторы. І тыя незалежныя медыя, якія спрабуюць дзейнічаць, іх сіл натуральна не хапае, яны робяць тое, што сказаў Сяргей, робяць усё магчымае, але іх сілаў не хапае. Дзяржава па нейкіх там прычынах, кожны з нас можа мець на гэта свае тлумачэнні, але практычна нічога не робіць дзеля таго, каб існавала ў гэтай інфармацыйнай прасторы Беларусь. І яшчэ важны для мяне момант. Мы ўсе думалі, што ў Беларусі змены якасныя прыйдуць, калі зыдзе старэйшае пакаленне, якое жыло ў Савецкім Саюзе, саветызаванае пакаленне. Аказваецца не. Вось мы маем прыклад гэтых дзяцей у Гродне, для якіх існуе ў галовах толькі Расія. І я задаваў ім пытанне „Адкуль вы бераце ўсё гэта?" – „Мы глядзім тэлевізар, з навінаў" – кажуць.

Яраслаў Іванюк:

Мікола, тут Павал уцёк крыху ад майго пытання пра місію...

Мікола Ваўранюк:

Я акурат хацеў пра тое, што Павал.

Яраслаў Іванюк:

Так, калі ласка...

Мікола Ваўранюк:

Мне здаецца, што ўсё роўна, таксама бедныя дзеці шасцігадовыя, якія ведаюць, хто Пуцін, як і тыя, што ведаюць, хто Лукашэнка. Ну, такое дзіця не павінна ведаць ні аднаго, ні другога. Мне запамяталася такая гісторыя, здаецца гэта быў 90-ы год, Савецкі Саюз ужо валіўся, але яшчэ школьная сістэма не валілася, калі мы наведаліся ў кватэру, здаецца, Сагановіча, і яго дачушка ў дзіцячым садку выклікала сенсацыю, бо не ведала, хто такі Ленін, хаця ўсе дзеці навокал ведалі. Мне б хацелася, каб тыя дзеці не ведалі ні Лукашэнкі, ні Пуціна, і не глядзелі навіны, а глядзелі мульцікі нейкія...

Павал Мажэйка:

Але размова ідзе пра тое, што гэтыя расейскія каналы глядзяць іх бацькі.

Мікола Ваўранюк:

Так разумею, але мне хацелася б, каб быў такі ідэальны свет. А па-другое, што тычыцца „Нівы” і разняволенасці „Нівы”, то найбольш там разняволенай была такая рубрыка „Сэрцайка”. Гэта парады нешчасліва закаханым, яна была найбольш папулярная. Яе чыталі, што тут, што там, і на Беласточчыне, і ў Беларусі. Наконт таго, што Сяргей Дубавец сказаў, што „Ніва” перастала быць такой, ну з пункту гледжання Мінску, калі я добра зразумеў, як бы нацыястваральнай, што больш засяроджваецца на сваіх справах мясцовых, Беластока, Падляшша, мне тут хацелася б перафразаваць такія словы Сакрата Яновіча. Ён вельмі любіў імі нерваваць палякаў, калі пыталі, а што вы там, што з гэтымі беларусамі ў Польшчы, якая тая нацыянальная меншасць, то ён заўсёды казаў, што нацыянальная меншасць кожная, любая, такая, як большасць і якое стаўленне да яе большасці. Мне б гэта хацелася аднесці тут, прынамсі да зададзенай тэмы, Беларусь „outside”. Кожны аўтсайдар, ці гэта будзе эмігрант, ці ўнутраны эмігрант, ці наогул маргінал нейкі, робіцца такім, як да яго ставіцца большасць, ці той жа цэнтр. Я думаю, што Беласточчына Мінску не патрэбная, не заўважае тая большасць, ці той жа цэнтр, прысутнасці беларусаў тут, ну можа па-за тым, што прысылаюць нейкія фальклорныя ці псеўдафальклорныя гурты, ці інструктараў, якія дарэшты выкарэньваюць мясцовы фальклор і псуюць узор нейкіх народных свят. Паколькі тая Беласточчына, і той Беласток, і тая „Ніва” не заўважаюцца, не патрэбныя Мінску, таму і ў другі бок такое ж. Неяк мы жывём тут кожны сабе, як два асобныя светы. І да прыкладу, тая ж „Наша Ніва” пару гадоў таму апублікавала серыю рэпартажаў Андрэя Дынько і Андрэя Скурко пра беларусаў Беласточчыны, з той ідэяй, як магла б выглядаць сённяшняя Беларусь, калі б той камунізм не быў такі строгі, а больш мяккі як у Польшчы, з індывідуальнай сельскай гаспадаркай, з царквой, з касцёлам і гэтак далей. І ў другі бок таксама было. Некалькі гадоў таму выйшла кніжка ў праграмнай радзе „Нівы” „Беларусь на старонках «Нівы»”.

Яраслаў Іванюк:

Ужо добрых некалькі гадоў...

Мікола Ваўранюк:

Ну так. Але гэта таксама прыклад, што паехалі туды ці рэпарцёры, ці навукоўцы па нейкіх сваіх справах і апісвалі нашым чытачам, ну нешта для іх калі не чужое, то прынамсі не сваё, нешта іншае такое. Як рэпарцёр едзе ў невядомую краіну, ці вёску, ці рэгіён і апісвае тым, хто таго не бачыў.

Яраслаў Іванюк:

Наколькі не зацікаўлены Мінск намі тут, на Беласточчыне, то я мог бы прывесці яшчэ прыклад журналісткі „Народнай волі”, якая прыехала сюды бадай у лютым, яна сустракалася з некаторымі беларускімі дзеячамі. Па сённяшні дзень не было ніводнага артыкула на гэтую тэму. Дзесьці там у студзені з'явілася нешта пра беларусаў Беласточчыны, і галоўны рэдактар вырашыў, што гэта будзе ўжо не цікава. Сёння маем ужо верасень і па сённяшні дзень нічога пра гэта не было напісана. Мне здаецца часам нават не то, што як Мікола сказаў, што прысылаюць фальклорныя калектывы на Беласточчыну, але тыя нашыя сябры-аднадумцы крыху лепш разумеюць, успрымаюць палякаў, чым нас беларусаў тут, на Беласточчыне. Даводзілася мне адказваць на каментары ў сацыяльных сетках, якія гаварылі пра нас беларусаў Беласточчыны, во вы глядзіце, ці яны не камуністы там нейкія, таму што яны змагаюцца там з культам „żołnierzy wyklętych”, аспрэчваюць геройства Рамуальда Райса „Бурага”. Ну гэта для мяне зусім не зразумела, чаму так адбываецца. Значыць, што? Беларускія сродкі масавай інфармацыі, якія знаходзяцца нават у той жа „ўнутранай эміграцыі”, пра гэта таксама не пішуць. Калі нават да аднадумцаў не даходзіць, хто такі Рамуальд Райс „Буры”.

Сяргей Дубавец:

Не. Гэта сітуацыя, калі пра тую ж „Ніву” казаць ці Свабоду, то яны пісалі. А ў сацыяльных сетках, сярод каментароў у нас сядзяць цэлыя аддзелы ў КДБ, якія гэтым займаюцца...

Яраслаў Іванюк:

Не, Сяргей, гэта людзі, якіх мы знаем у твар.

Мікола Ваўранюк:

Гэта суцяшае, хоць хто-небудзь чытае.

Сяргей Дубавец:

Ёсць усякія маргіналы, ёсць людзі, якія абазлёныя, якія хочуць спецыяльна шпільку якую ўсунуць. Але ў цэлым сітуацыя выглядае, я б не сказаў, што вось тое, што ты кажаш характарызуе неяк сітуацыю. У нас нацыя беларуская існуе асобна ад дзяржавы. Дзяржава не займаецца нацыянальным пытаннем ніякім чынам і нацыя мусіць сама самаўзгадоўвацца, узнаўляцца. Мы разумеем, што ўсе мы беларусы ёсць адна нацыя. Для дзяржавы гэта страшна, не тое што не выгадна, я б сказаў якраз выгадна, але яна ад гэтага ўхіляецца ўсяляк, і ў нас да гэтага лічыцца, што нацыяналізм – гэта нешта блізкае да нацызму, хоць насамрэч гэта зусім нейтральны тэрмін, як

яго выкарыстоўваць іншая рэч. Мы ёсць адна нацыя і мы абсалютна з даўніх савецкіх часоў успрымаем тых жа беларусаў Беласточчыны як крыху больш прасунутых, чым мы там на Бацькаўшчыне, усё ж такі вы Захад, вы бліжэй да свабоды. А на троляў і такіх маргіналаў проста не варта звяртаць увагу, на жаль, іх цяпер чуваць ва ўсіх фейсбуках, але што рабіць.

Яраслаў Іванюк:

Павал, як там на Гарадзеншчыне, там больш пра нас ведаюць?

Павал Мажэйка:

Я не зусім з Сяргеем пагаджуся, бо ўсё ж такі лічу, што пра беларусаў Беласточчыны сапраўды ведаюць толькі тыя людзі, якія гэтым цікавяцца. Для большасці, хто чытае газеты і глядзіць тэлевізар, наўрад ці жыццё тут, падзеі тут маюць значэнне. Усё ж такі мы жывём зараз, трэба прызнаць, у грамадстве „лайкаў”. І нашыя сродкі масавай інфармацыі, нават тыя, якія мы прадстаўляем, так ці іначай гоняцца за „клікальнасцю”, за тым, як часта будуць адчыняць старонкі і гэтак далей. Таму тэма беларусаў Беласточчыны для СМІ не ёсць тым, што прачытаюць, важней напрыклад напісаць, як памёр Іосіф Кабзон, гэта чытэльная тэма. Пытанне ў тым, як гэтую сітуацыю выправіць.

Яраслаў Іванюк:

Белсат мае хаця б сваю праграму „Беларускі свет”, дзе распавядаецца пра выхадцаў з Беларусі, пра беларускую меншасць. Радыё Рацыя таксама мае сваю праграму пра беларусаў Падляшша „З Падляшша родам”. Але гэта не выпраўляе сітуацыі. Мікола, як гэта выглядае на панадворку тым, дзе ты цяпер найбольш займаешся, у Радыё Рацыя?

Мікола Ваўранюк:

Радыё Рацыя тым адрозніваецца ад іншых СМІ, з якімі я меў нейкае дачыненне ці маю, што гэта радыё беларускае, кругласутачнае і там няма такога падзелу, што вось беларускімі справамі мы займаемся 15 мінут у дзень, як скажам польскае Радыё Беласток, якое мае праграму, ці польскае тэлебачанне ў Беластоку, якое мае свае акенца. Якраз Радыё Рацыя вяшчае, інфармуе пра жыццё беларусаў ці Падляшша, ці Гарадзеншчыны не па асобных рубрыках, а цэлы час, калі нешта цікавае здараецца, калі з „Трыялогаў” будзе шмат інфармацыі не толькі ў нейкай рубрыцы, але і ў навінах. Тым адрозніваецца суцэльны нейкі праект, ці суцэльнае беларускае СМІ ад нейкага акенца ў іншых сродках масавай інфармацыі. А наконт таго... Я не вельмі плачу па тым, што... або не вельмі чакаю, каб пра мяне пісалі на

Гарадзеншчыне ці ў Мінску, не ў тым справа. Я б хацеў засяродзіцца на тым, пагаварыць пра тое, чаму незалежна ад таго, што мы адна нацыя, але ўсё ж два асобныя светы. На тое ёсць пэўна адказы сацыялагічныя, гістарычныя, палітычныя. Але я б не быў такім аптымістам, што ў Мінску шмат хто разумее сітуацыю беларусаў у Польшчы, ці разумее наогул тую сітуацыю, што ёсць беларусы па-за межамі Рэспублікі Беларусь. І тут хацеў бы прывесці цытату з кніжкі Юрыя Туронка „За кардонам Бацькаўшчыны", гэта такая споведзь яго, аўтабіяграфія і не толькі, публіцыстыка. Ён якраз піша, што стымулам дзеля гэтага, каб напісаць гэтую кніжку, былі пытанні людзей з Мінску. „Першым было іх здзіўленне, як жывучы ўсё жыццё ў літоўскім і польскім асяроддзі я дайшоў да беларускасці. А другім, наколькі на кірунак маіх гістарычных доследаў паўплывалі асабістыя дасведчанні і палітычныя абумоўленні. Пытанне першае. Я не меў патрэбы самастойна даходзіць да беларускай нацыянальнай свядомасці. Яна была натуральным вынікам сямейнага патрыятычнага ўзгадавання, паводле якога маёй Бацькаўшчынай мелася быць Беларусь, а не тое ці іншае месца нараджэння. Літоўскае асяроддзе не садзейнічала асіміляцыі, хутчэй наадварот, давала добры прыклад захавання сваёй нацыянальнай адметнасці. Таксама ў Польшчы не адчуваў паланізацыйных націскаў. Дылема: захаваць сваю нацыянальнасць ці паддацца асіміляцыі несумненна існавала, аднак яе рашэнне залежала перш за ўсё ад асабістага выбару". Гэта Туронак, які не меў патрэбы даходзіць да беларускасці. І ён хутчэй за ўсё – выключэнне, што тут, што ў Мінску, паколькі ўсе мы, ці там 90 з нечым адсоткаў мелі такую патрэбу, мелі патрэбу чытаць, шукаць, вучыцца гісторыі. І ў нас тут, на Беласточчыне, таксама я не ведаю другой асобы, хто б мог так сказаць, што ён змалку ў натуральнай сямейнай беларускасці выхоўваўся. І якраз мы тут тую Беларусь, як піша Кастусь Бандарук у гэтым уводным слове да нашай дыскусіі, уяўляем сабе кожны па-свойму, трохі як нейкі рай, трохі як міф, хтосьці нечага ў ёй шукае. Сакрат Яновіч доўгія гады шукаў такую ідэальную Беларусь у гісторыі, у сваіх гістарычных эсэ, дзякуючы якім ён дарэчы адкрыў вочы палякам на Беларусь, на Вялікае княства Літоўскае. Але пад канец жыцця, думаю стомлены тым, што адбываецца ў Беларусі, перш-наперш русіфікацыяй і такой сацыяльнай мадэллю дзяржавы, а не нацыянальнай, а таксама думаю трохі тым, што ўсё ж такі ў Мінску яго не ўспрынялі як свайго, выдалі яму, праўда, здаецца дзве кнігі за жыцця „Самасей" і „Сцяна", але хутчэй за ўсё выдалі кніжку як нейкага дзівака, арыгінала, з-за мяжы, не зусім нашага. І ён ужо ў апошнія гады стаў пісаць пра тое, што мы ніякая не адна нацыя. Ён пісаў пра тое, што мы тут, беларусы Падляшша, беларусы Польшчы, асобная, найменшая, ці адна з меншых нацый у Еўропе, што нашыя дарогі так разышліся, што мы тут нешта асобнае ад тае Беларусі.

Яраслаў Іванюк:

Наколькі я разумею Міколу, ён ставіць даволі такі моцны, мне здаецца тэзіс, што мы страцілі наогул узаемазацікаўленне сабой. Добра я гэта зразумеў?

Мікола Ваўранюк:

Я не стаўлю такі тэзіс. Мяне цікавіць тое, што адбываецца ў Беларусі...

Яраслаў Іванюк:

Я гавару пра агульны працэс...

Мікола Ваўранюк:

Я падпіраючыся тым, што пісаў Сакрат у сваёй публіцыстыцы і прыводзячы словы Туронка, кажу, што Туронак быў выключэннем. Яго пазіцыя і тое, як ён глядзеў на Беларусь, беларускасць было нечым унікальным, паколькі ён інакш да тае беларускасці прыйшоў, яму наогул не трэба было прыходзіць. Мы тут на Беласточчыне, таксама як і вялікая частка беларусаў у Беларусі, прыходзіла „да Беларусі" з канкрэтным сваім багажом, досведам, сямейным, гістарычным, і часта гэты досвед быў іншым. Адтуль тыя розніцы, адтуль можа тое замалое зацікаўленне.

Сяргей Дубавец:

Мне таксама як Сакрату Яновічу часам так думаецца, толькі седзячы ў Мінску. Можа быць нас, якія мы ёсць усвядомленыя беларусы, можа мы з астатнімі і розныя нацыі. Зразумела, што гэта не так, але такое пачуццё, самапачуванне вось гэтай часткі беларусаў, якія ёсць рэальныя беларусы, не толькі паводле пашпарту, яно прысутнічае. І таму нельга сказаць, што тут страцілася нейкае зацікаўленне. Я тут прадстаўляючы Радыё Свабода, я памятаю з апошніх публікацый такое горкае інтэрв'ю гісторыка Мірановіча, які без асаблівага аптымізму распавядаў пра тое, як змяншаецца колькасць беларусаў на Беласточчыне. І сам бываючы і тут цяпер, і ў Гайнаўцы я часта бываю, бо там радня жыве, калі ты не чуеш мовы ні разу нідзе, ні ў краме, ні на вуліцы.

Яраслаў Іванюк:

Яшчэ ў Гайноўці то можна почуті як говорат на пудляскум дыялекце беларускай мовы...

Сяргей Дубавец:

Вось мне не сустракаецца, дома можна, а на вуліцы...

Голас з залі:

На могілках можна пачуці...

Яраслаў Іванюк:

У сераду на базары там напэўна можна пачуць.

Мікола Ваўранюк:

На могілках негаваркія людзі...

Яраслаў Іванюк:

На могілках таксама пры нагодзе нейкіх свят усё ж такі „по-своёму говорат". Тут Янка Максімюк мог бы патлумачыць, ці гэта беларуская мова, ці не беларуская, якая яна беларуская. Я лічу, што беларуская, таксама, як і літаратурная, што гэта дыялект беларускай мовы якраз.

Сяргей Дубавец:

Не хацелася б ставіць такую кропку песімістычную, але я ўсё ж такі веру, што ёсць нейкія кліматычныя ўмовы, што ў антрапасферы бываюць розныя надвор'і, і што прыйдзе такое надвор'е, калі беларусаў будзе станавіцца болей, а не меней.

Яраслаў Іванюк:

Аптымістычна тады, не песімістычна. Павал закрануў тут даволі цікавую тэму, магчыма яна крыху менш, а можа і звязана з гэтым аўтсайдам, вось гэтую расейскую прапаганду, якая прасочваецца ў беларускай медыяпрасторы, дзе можна глядзець сотні расейскіх тэлеканалаў з прапагандай. Ці тыя ж сродкі масавай інфармацыі могуць з гэтым неяк змагацца, тыя, якія незалежныя, тыя, якія сапраўды беларускія, ці наогул гэты патэнцыял ёсць дзеля таго, каб дабіцца такой сітуацыі, каб малыя дзеці, можа не тое – як Мікола гаворыць – не ведалі пра Лукашэнку, але ведалі ўсё ж, што прэзідэнтам Беларусі ёсць Лукашэнка, а не Пуцін?

Сяргей Дубавец:

Вось выйшаў новы часопіс „Наша гісторыя", значыць, робяцца нейкія захады, робяцца падзеі ў гэтым змаганні. Насамрэч, гэта самая вялікая праблема. Праблема, я лічу, не нават моўная, праблема ў тым, што беларусы ўспрымаюць расейскую гісторыю як сваю. Усе гэтыя Іваны Грозныя – гэта ўсё нашы цары, Пятры Першыя, хоць ніякім бокам мы да іх не маем дачынення, акрамя іхніх агрэсіяў. Гісторыя – гэта самае важнае для асветы, для дзяцей, для школы. Вось тое, што робіцца ў нас у школе, гэта ж людзі самі робяць. Як гэта не дзіўна, я пайшоў аднойчы ў белару-

скую гімназію, канцэрт на Дзень маці, усе дзеткі пяюць усякія песні, ніводнага слова па-беларуску, хоць гімназія называецца беларускай. І ў канцы песня пра „радныя неўскія масты" і думаеш бляха-муха куды я папаў, што гэта такое. Ці ўчора едзем праз Горадню аўтобусам, маса крамак прыватных, усе назвы па-расейску, чаму? Старайцеся быць адметнымі, бізнес, вы ж мясцовыя, прываблівайце да сябе, не, як у нейкім Тамбове. І людзі гэта робяць самі, яму ж ніхто не ўказваў, ці ўказваў, я не ведаю.

Мікола Ваўранюк:

Чаму? Ясна чаму. Калі ў школе спяваюць пра „радныя неўскія масты", то ясна, што потым будуць тыя шапікі таксама называць па-расейску. Так што тут не тое, што хочуць, проста не бачаць ніякага выйсця, тут усё ж такі на ўзроўні дзяржавы. Я дам польскі прыклад. Дзеці ў Сілезіі, у Польшчы, калі вывучаюць гісторыю, то таксама вывучаюць скажам студзеньскае паўстанне, хаця да іх продкаў гэта не мела ніякага дачынення, бо тады іх дзяды-прадзеды гінулы ў пруска-французскай вайне, ці там камуну парыжскую душылі, так. Але яны пра гэта ў школе наўрад ці вучацца, а вучацца пра бой пад Мілавідамі, ці дзе там.

Павел Мажэйка:

Мне здаецца, што мы тут упіраемся ў той самы чыннік, момант, пра які казалася і ў частцы дэбатаў пра літаратуру. Пэўныя рашэнні павінна прыняць беларуская дзяржава, што тычыцца пазбаўлення ад расійскай інфармацыйнай прасторы, або большага прамавання Беларусі ці беларускасці, бо грамадства незалежнае, незалежныя СМІ робяць не тое, што шмат, часам нават вышэй галавы. Таму для мяне пытанне, чаму беларуская дзяржава, сённяшняя беларуская ўлада не ідзе на тое, каб абмежаваць рашуча гэты расейскі ўплыў.

Яраслаў Іванюк:

Беларускай дзяржаве залежыць на гэтым, магло б залежыць сённяшняй беларускай дзяржаве?

Павел Мажэйка:

Мне вельмі хацелася б думаць, што ёй павінна залежыць на гэтым. Апошнімі гадамі мы маем перад вачыма расейскую агрэсію ва Украіне. І, здавалася, дзяржава, прынамсі галоўныя асобы, зразумелі небяспеку таго, што Расея можа прыйсці ў Беларусь у любы момант. І нібыта пачаліся працэсы такой лёгкай беларусізацыі, калі пэўныя рэчы сталі дазволенымі і нават да сённяшняга моманту дазволеныя яшчэ. Але як заўсёды робіцца крок наперад і два-тры назад. У Гародні не можна аддаць

дзіця ў беларускую школу, ну ў клас яшчэ можна аддаць, але беларускай школы ў 370-тысячным горадзе па-ранейшаму не існуе. І для мяне крытэрам таго, ці характарыстыкай таго, што беларуская ўлада пачала мяняцца, гэта будзе стварэнне беларускай школы, напрыклад, у маім горадзе. Нішто не перашкаджае стварыць у адным з раёнаў, якія ўсё яшчэ называюцца Кастрычніцкі і Ленінскі, але гэта ўжо іншая гісторыя, стварыць поўнавартасную беларускую школу. Гэта не патрабуе звыш выдаткаў.

Яраслаў Іванюк:

Мы можа сабе зусім не ўсведамляем, але тая расейская прапаганда яна прасочваецца не толькі ў беларускай інфармацыйнай прасторы, ці пануе ў гэтай беларускай інфармацыйнай прасторы. Анна Межыньска зрабіла такі аналіз польскіх інфармацыйных сайтаў, як гэта выглядае, хто карыстаецца ньюсамі са „Sputnik Polska" ці „Voice of Europe". І атрымліваецца, што ўсе гэтыя інтэрнэт-вітрыны, якіх яна налічыла 23, маюць на фейсбуку прыхільнікаў больш за 2,5 мільёны. Гэта вельмі многа. А калі палічыць толькі ў адным жніўні ўваходы інтэрнаўтаў на гэтыя 23 вітрыны, атрымліваецца больш за 50 мільёнаў уваходаў. Так што расейская прапаганда прысутная таксама ў Польшчы. Паколькі яшчэ „Sputnik Polska" асацыюецца даволі адмоўна, дык гэты „Voice of Europe", які рэгістраваны бадай у Галандыі, ужо не так адмоўна асацыюецца. І ўся інфармацыя таксама праходзіць такая, якую перадаюць расейскія каналы ў беларускай інфармацыйнай прасторы.

Сяргей Дубавец:

Рэч у тым, што ў Польшчы цяжка сабе ўявіць, каб дзяржава ваявала з „пальшчызнай". У Беларусі гэта нармальная практыка, гэта адзіная краіна ў свеце, дзе дзяржава душыць самабытнасць нацыі, якой кіруе. Вельмі лёгка зрабіць выснову, што гэта не выключэнне, але што гэта кіруе іншая дзяржава іншай дзяржавай.

Яраслаў Іванюк:

Я разумею адрозненне Польшчы і Беларусі, толькі што гэтая прапаганда, мы яе не ўсведамляем, але яна тут таксама прысутная.

Міра Лукша:

Мы тут успаміналі пра нашу „Ніву" і пра лідараў, якія маглі б весці сваю палітыку, нават і ў друку. „Ніву", якая выйшла ў 1956 годзе і быў там рэдактар Юрка Ваўкавыцкі. Гэта было выданне, якое выдавалася ў партыйным канцэрнце Prasa-Książka-Ruch. Юрка вёў сваю палітыку, у яго друкаваліся і „Тутэйшыя", маладыя

тады, неапераныя, прыняў такіх асоб на працу як Сакрат Яновіч, праўда, мусіў пазней яго звольніць, але гэта іншая справа, прыняў асобы, якія пісалі тэксты пра „нашаніўскую" пару, яшчэ жыве Мацей Канапацкі, татар тутэйшы, прыняў маладых людзей таксама. Хаця была цэнзура. Прыняў таксама нас, Колю, мяне, Аліка, Янку на працу. І ён, думаю, быў такім ціхім лідарам, не адчувалася яго такой рукі цвёрдай, але сапраўды можна было развівацца, друкаваліся тэксты таксама з Беларусі, але тады была падпіска, афіцыйная падпіска „Нівы" ў Беларусь. Так што кожны селянін, кожны хто хацеў, мог на „Ніву" беластоцкую падпісацца, і недзе 3,5 тысячы экзэмпляраў ішло ў Беларусь афіцыйна бадай да 1988 ці 89 году. Не было так, што „Ніва" цяперашняя адмовілася ад Беларусі, таму што ў нас і публіцысты друкуюцца, і матэрыялы з Беларусі, але кантакты ёсць такія асабістыя паміж журналістамі, пісьменнікамі з абодвух бакоў. Тут таксама Слава Ахроменка з намі супрацоўнічаў канкрэтна, „чорную" работу рабіў, праўда, але за той час напісаў „Здані і пачвары Беларусі", будучы ў Беластоку, з Максімам Клімковічам. І таму думаю, што тут таксама патрэбны такі лідар і яго адвага. Напрыклад, калі каму практычна немагчыма было друкавацца, Канвіцкага, ці іншых аўтараў ён іх перапіхаў, гэтыя тэксты ішлі, нават тэксты апальных аўтараў. А была ж цэнзура. Я пачала працаваць у „Ніве", ужо 34 гады працу. Сапраўды ён дазваляў на пэўныя рэчы, цэнзура вядома чытала, былі цэнзары, якія ведалі беларускую мову, і сапраўды яны не прапусцілі чагосьці, чаго нельга было прапусціць. Але сапраўды такія людзі як Юрка Валкавыцкі патрэбныя. Думаю, што святой памяці, на жаль ужо, галоўны рэдактар 32-гадовы, але патрэбныя вось такія канкрэтныя асобы, якія дазволяць, як калісьці Koncern Druku RSW, напрыклад, каб у „Ніву" прыходзіла „Культура" парыжская. І ўсе ў Беластоку ведаюць, што „Культура" ёсць у рэдакцыі „Нівы", можа прыйсці, пазычыць, пачытаць. Хаця, нашы вядома данеслі, што такая справўка ёсць. Так што думаю, патрэбныя канкрэтныя людзі. На жаль, у новай Польшчы няма падпіскі „Нівы" на Беларусь, няма кантактаў такога тыпу, але то патрэбныя таксама грошы, трэба дамовіцца проста на ўзроўні дзяржаўным, што можа ісці падпіска нашых газет на Беларусь. І мы не маем доступу практычна. Калі толькі хто паедзе купіць нешта, ці кніжкі прывязе, прывалачэ ў заплечніку, ці наадварот.

Яраслаў Іванюк:

Мікола, праўда, крыху змякчыў сваю пазіцыю, гаворыць, што гэта замалое зацікаўленне. А мне з таго, што прасочваецца з дыскусіі, і з таго, што нават Міра сказала, усё ж такі гэтае нашае ўзаемнае зацікаўленне было ў пакаленні Сяргея, было ў пакаленні Міколы, Міры, маім яшчэ, а цяпер гэтыя маладыя не цікавяцца.

Мікола Ваўранюк:

Як не цікавіцца? Ты пачынаеш гаварыць як нейкі стары чалавек, а скуль ты ведаеш, чым цікавіцца маладое пакаленне.

Яраслаў Іванюк:

А сённяшняе маладое пакаленне хаця б мае такія кантакты, якія мелі мы?

Мікола Ваўранюк:

Так, мае лепшыя нават кантакты, бо мае свае. Хаця б арганізатары „Басовішча" ездзяць у Беларусь, маюць там сяброў, маюць свае месцы, маюць свае кавярні, маюць таксама кніжкі, якія чытаюць і пра што гавораць. Так што тут якраз можа не варта наракаць на моладзь, ці гаварыць, што за нашых часоў, то было ого-го-го, а цяпер то не. Ты, Міра, не патрэбна апраўдоўваешся, маўляў, што „Ніва" і цяпер не адракаецца ад Беларусі, а ўсё ж такі піша пра тую Беларусь, толькі там не хочуць нас чытаць. Я ўсё ж такі замест апраўдоўвацца, прыслухаўся б да патэнцыйных чытачоў і браў бы гэта пад увагу. Я хацеў бы вярнуцца да „Нашай Нівы". Безумоўна, гэта адна з тых газет, хаця цяпер ужо толькі ў інтэрнэтным варыянце, у якую трэба заглянуць, каб даведацца, што адбываецца ў беларускім жыцці, у Беларусі. Тым не менш праект, віленскі праект, не сама газета, пацярпеў паразу. Аказваецца, тут таксама адношуся да таго інтэрв'ю песімістычнага Мірановіча пра сітуацыю Беласточчыны, але ці не накавана так лёсам, што калі няма цэнтру, то нічога не збудуеш на перыферыях, ні ў Беластоку, ні ў Вільні. Хаця ўсе прывыклі гаварыць „Вільня – крывіцкая Мекка" і ніхто не ўгрызаецца ў значэнне тых слоў. Усё ж такі „Нашу Ніву" давялося вяртаць, пераносіць у Мінск, каб у яе была перспектыва, было развіццё.

Яраслаў Іванюк:

А можа гэта проста так, што напачатку 90-х гадоў тая перспектыва „Нашай Нівы" была ў Вільні, а калі сітуацыя памянялася, тады яна перанеслася, пераехала ў Мінск, у цэнтр?

Сяргей Дубавец:

Так і ёсць. Я хачу нагадаць, што калі „Наша Ніва" пачала выходзіць у Вільні – гэта быў Савецкі Саюз. І перспектыву, як будзе гэта разыходжанне рэспублік у паасобных краінах, ніхто яе не ведаў. Вярхоўны Савет БССР нават прымаў заяву, што калі вы аддзеліцеся, мы Вільню забіраем. Была такая заява яшчэ ў часы Дземянцея. Пасля ішлі вялікія дыскусіі, падняўся польскі рух на Віленшчыне, цэлыя з'езды праводзіліся, праўда ён быў чамусьці цалкам камуністычны, што мы ў новай Вільні зробім сталіцу аўтаноміі.

Мікола Ваўранюк:

Сёння ў Польшчы пра той рух не ўзгадваецца.

Сяргей Дубавец:

Я ж проста быў у цэнтры гэтага віру. О, гэта так віравала, такія масавыя сходы, дэманстрацыі. І тут выходзіць „Наша Ніва” са сваімі там развагамі, чыя павінна быць Вільня ці Віленшчына. Таму гэта была абсалютна іншая сітуацыя. І гэтым дыктавалася. Пры чым ад пачатку гэта, безумоўна, было не выданне перыферыі, гэта не было выданне Віленшчыны. Мы паралельна выпускалі такі тыднёвік, здаецца „Вільня і край” называўся, гэта было зусім іншае выданне, менавіта для мясцовых спраў. А „Наша Ніва” яна і друкавался ў Беларусі, яна рабілася ў Вільні, пасля друкавалася ў Беларусі. Пасля, калі ў Беларусі забаранілі друкавацца, калі яна ў Мінску выходзіла, яна нейкі час друкавалася ў Вільні. Такія дзіўныя перакрутасы. Яна не пацярпела паразу, яна задумлялася як інтэлектуальнае выданне, прысвечанае літаратуры, культуры, пераважна яе задача была прывабіць новае пакаленне беларусаў да беларушчыны. Вось такая задача была, і я лічу, што мы з ёй справіліся, таму што той жа Дынько, цяперашні рэдактар, ён вырас на той „Нашай Ніве”, гэта яго прызнанне. А калі яна пераехала ў Мінск і пачала актыўна рабіцца газетай, тады яна менавіта стала такой „Нашай Нівай”, якой яна была ў шостым-дзесятым гадах XX стагоддзя. То бок цяпершаняя „Наша Ніва” – яна пераемніца той газеты ў большай ступені, чым тая, якую рэдагаваў я.

Яраслаў Іванюк:

Тады якія задачы цяпер павінны стаяць перад тымі сродкамі масавай інфармацыі, тымі медыямі, якія вяшчаюць з па-за Беларусі? Наколькі яны памяняліся ад гэтых 90-х гадоў?

Сяргей Дубавец:

У нас няма школы, пра што мы гаварылі, якая б дзецям расказвала, што Беларусь – гэта не ёсць Расія. Можа быць галоўная місія той жа „Нашай Нівы” расказваць пра гэта, гэта асветная місія, гэта мова, гэта гісторыя, гэта культура. Плюс уся астатняя інфармацыя, што адбываецца ў жыцці Беларусі і за межамі, што можна прачытаць у адным выданні па-беларуску.

Яраслаў Іванюк:

Можа таму менавіта асяроддзе „Нашай Нівы” пачало выдаваць часопіс „Наша гісторыя”?

Сяргей Дубавец:

Безумоўна.

Яраслаў Іванюк:

Але раней, як я вас запытаў пра тое, ці могуць гэтыя незалежныя медыя змагацца з расейскай прапагандай, вы сказалі, што не. Ну то адназначна, што не могуць таксама беларускім дзеткам данесці, што расейская гісторыя – гэта не беларуская гісторыя.

Сяргей Дубавец:

Гэта як дыяспарай. Зноў я вяртаюся да эміграцыі. Эміграцыя можа без грошай існаваць на нейкім уздыме. Сістэмна жыць, захоўваць сваё культурнае жыццё і асяроддзе без дапамогі метраполіі, яна не можа, яна проста перастае існаваць паступова. Тое самае з гэтымі незалежнымі СМІ. Яны проста робяць подзвіг, зразумела, што яны дасягаюць поспехаў, з'яўляюцца новыя прыхільнікі. Мы сёлета праводзілі пленэр паэтаў чарговы пад Маладэчнам і прыехалі сем маладых паэтаў, абсалютна... вось адкуль бяруцца такія свядомыя, з класнымі мазгамі, з цудоўнымі вершамі, супер. Дык гэта паэты, а колькі проста прыхільнікаў беларушчыны. Вось гэта тое, што гадуецца гэтымі СМІ нашымі, і гэта файна, я думаю.

Павал Мажэйка:

На мой погляд, сітуацыя, якая сёння склалася, яна выразна нагадвае 80-ыя гады. Я заспеў крыху канец 80-х, з'яўленне масавае арганізацый адраджэнскіх, і магу сказаць, што сітуацыя, якая склалася сёння, цалкам нагадвае вось гэтыя 80-ыя, сярэдзіну ці канец 80-х, калі патрэбна праца „u podstaw", то бок, ад самага пачатку, выконваць асветніцкія, адукацыйныя функцыі, якія павінна выконваць беларуская школа.

Яраслаў Іванюк:

Ты хочаш сказаць, што гэтыя дзесяцігоддзі страчаныя?

Павал Мажэйка:

Я хачу сказаць, што мы вярнуліся назад. Тое, пра што Сяргей казаў, праца „Нашай Нівы", тое што закладалася, місія, яна была выкананая, так, бо я таксама сябе лічу пакаленнем „Нашай Нівы". Але вось пытанне: сённяшняя моладзь, на што ім абапірацца? І мне падаецца, што вось менавіта калі ў школах не даецца, у прэсе не прачытаеш, хаця інтэрнэт, канешне, сёння даступны, але ўсё роўна,

гэта ж аграмадны пласт інфармацыі, патрэбнае яшчэ трэба ўмець знайсці. Якраз грамадскія арганізацыі, ініцыятыўныя людзі, мы ўсе павінны займацца зноў такім адраджэнствам. Працай „u podstaw".

Мікола Ваўранюк:

Ты сказаў пра заданні, якія ставяцца СМІ, ці якія мы сабе ставім. Я на шчасце ўсё жыццё працаваў і працую ў рэгіянальных СМІ, якія не ставяць сабе мэты змагацца з расейскай прапагандай, так што я сабе таксама такой не стаўлю. Адзіная мэта – гэта інфармаваць пра падзеі, якія вакол мяне, пра тое, што адбываецца, як мага больш справядліва, нейтральна, і стараемся рабіць гэта на беларускай мове, раз яна лепшая, раз горшая. І то ўсё. Я не ведаю, ці гэта многа, ці мала. Тая расейская прапаганда, я яе тут не адчуваю, яна тут у маёй працы ні пры чым.

Яраслаў Іванюк:

Дзякую. Слова публіцы.

Міхась Андрасюк:

Я хацеў бы запытаць, што такое Беларусь, беларуская дзяржава, беларуская прастора і беларуская нацыя менавіта для незалежных СМІ. На прыкладзе „Нашай Нівы" якраз. Ці не так гэта, што Беларусь – гэта тое, што ў межах адміністрацыйных, палітычных, у межах Беларусі. Нацыя – гэта нейкія беларусы. Але сапраўдная Беларусь – гэта Мінск, і за кальцавой ужо пачынаецца штосьці невядома што. З чаго я сыходжу? Не так даўно былі святкаванні стагоддзя БНР і мы да гэтых святкаванняў у Беластоку далучыліся. І пры нагодзе даведаліся з „Нашай Нівы", што чужая нам абсалютна ідэя беларускай дзяржавы, што не разумеем беларускую гісторыю, што мы нейкія там „парафіяльныя", калі дакладна памятаю словы Андрэя Дынько. Пачалося з таго, што мы запрасілі Лявона Вольскага на святкаванні ў Беласток. І як так можна забраць Вольскага ў Беласток, калі сапраўдныя святкаванні ў Мінску, і яго месца ў той дзень у Мінску. Нідзе больш. Якім правам Беласток забірае Вольскага. Значыць, беларуская нацыя, беларуская нацыянальная ідэя і права на святкаванні Дня незалежнасці затрымліваюцца на дзяржаўнай мяжы, а яшчэ лепей, калі затрымліваецца на мінскай кальцавой. І мы размаўляем пра Беларусь звонку, і мы размаўляем пра незалежную прэсу, якая павінна будаваць нацыянальную свядомасць. Ну вось паводле гэтай прэсы мы па-за гэтай мяжой. І я толькі магу пазайздросціць палякам, якія бачаць усіх сваіх, дзе б яны не былі, у кожнай кропцы свету. Ці такая прэса, ці іншая, ці праўрадавая, ці антыўрадавая. Для іх

палякі за мяжой ёсць палякі. Я разумею, калі б дзяржаўнае БТ там сказала, што ў Беластоку няма беларусаў, што беларуская нацыя – гэта адно дрэва з расейскім. Але не разумею „Нашу Ніву”.

Сяргей Дубавец:
Я згадваю гэты канфлікт і хачу сказаць, што вельмі добра, што Вольскі сам разабраўся, дзе яму выступаць. А Дынько можа што заўгодна выказваць, я з ім не згодны, вось у гэтай думцы. У прынцыпе, гэта ж плюралізм, кожны гаворыць тое, што ён думае.

Яраслаў Іванюк:
Але ўжо, Сяргей, гэта не нейкі маргінал.

Міхась Андрасюк:
Галоўны рэдактар самай, скажам, прэстыжнай газеты.

Сяргей Дубавец:
Ну трэба яму пры сустрэчы гэта і выказаць. Таму што можа быць ён гэта „ў сэрцах”, як кажуць, сказаў, я не ведаю.

Яраслаў Іванюк:
Ну я выказваў яму гэта, праўда, не ў твар, а ў нейкіх фейсбучных перапісках. Ён не зразумеў. Я пад ягоным выказваннем таксама прачытаў, тады ўжо вельмі крыўдна мне было, нехта напісаў, ужо не памятаю прозвішча, але таксама чалавек вядомы, „з асяроддзя”: „Дык чаго яны туды паехалі святкаваць гэтае стагоддзе БНР? Няхай бы сядзелі на Бацькаўшчыне і тут адзначалі”. Мы нікуды не паехалі, мы ў сябе. І мы тут хацелі адзначаць стагоддзе БНР.

Сяргей Дубавец:
Давайце не будзем спрачацца, Дынька асуджаць тут ці не асуджаць. У Беларусі вельмі шмат пакрыўджаных ім людзей, якія адмовіліся чытаць „Нашу Ніву”, ну што рабіць, такая сітуацыя. І не толькі праз гэты выпадак, бывалі і розныя іншыя, неакуратныя, скажам так, выказванні. Я пры першай магчымасці яму ўсё гэта перадам з вялікім задавальненнем, таму што я цалкам асабіста падзяляю пазіцыю вашу і я абсалютна на вашым баку і таму мне цяжка тут штосьці казаць.

Павал Мажэйка:
Я толькі дадам, што калі б мы мелі дзесяць „Лявонаў Вольскіх”, то ўсім бы хапіла і гэтага канфлікту не паўстала б.

Сяргей Дубавец:

Калі б мы мелі дзеяць „Дынькоў”, было б лепей...(*смех*)...

Павал Мажэйка:

Насамрэч, проста з Мінску было некалькі слоў сказана зашмат. Але варта таксама ўявіць тую сітуацыю: сто гадоў раз жа ў жыцці бывае, і дзяржава раптам дазволіла мерапрыемства.

Аліна Ваўранюк:

Дзякуй, Павал, за тое, што ты ў між часе сказаў, што калі б у нас было дзесяць Вольскіх. Безумоўна, адукацыя вельмі важная, і я гавару гэта як настаўніца. Але цяпер хачу сказаць як маці. Амаль у кожнага з нас тут ёсць свае дзеці. Ні школа не выхавае дзяцей, ні тэлебачанне, ні СМІ, гэта мы, бацькі, выхоўваем сваіх дзяцей. І або яны будуць беларусамі, або будуць тапіцца ў гэтым моры польскай мовы, расейскай мовы, дзе бы мы, беларусы, не жылі.

Павал Мажэйка:

Згода, але дзе ўзяць тых першых, хто выхавае? Дзе ўзяць тых першых бацькоў у саветызаванай цалкам Беларусі?

Валянцін Акудовіч:

Я трошкі вярнуся назад, бо свае крыўды мы можам тут да бясконцасці крыўдаваць. І на першай сесіі прагучала, Павал нават некалькі разоў паўтарыў, калі дзяржава не дапаможа беларускай кнізе, беларускаму адукаванню, то нічога і не будзе. Тое ж самае і другі Павал сказаў. Дзяржава або зробіць гэта, або „nic nie będzie”. Яны маюць рацыю, бясспрэчна. Але я толькі хачу сказаць, чаму дзяржава не дапаможа ні кнігадрукаванню, ні школцы ў справе беларусізацыі. Быў такі першы міністр сельскай гаспадаркі незалежнай Беларусі, у свой час, калі не памыляюся, першы сакратар нейкага абкама Васіль Лявонаў. Дык вось, Лукашэнка кінуў яго за краты, абсалютна за нічога пасадзіў, адно таму, што адчуў у ім канкурэнта. І Васіль Лявонаў, седзячы ў турме, напісаў яму адкрыты ліст, ад якога ў мяне пайшлі дрыжыкі па скуры, настолькі жорсткімі, бязлітаснымі словамі ён ганіў Прэзідэнта! Ну, думаю, згнаяць у турме мужнага чалавека. Не згнаілі. Потым на свабодзе Васіль Лявонаў актыўна спрыяў незалежным рухам, палітыкам, бо меў бізнес у Расіі і сам быў рускім. Між іншым, ён нават дапамагаў нам філасофскую літаратуру друкаваць. Дык вось, сядзелі мы аднойчы з ім у кафэ і ён даводзіў мне, што нам трэба за палітычную мадэль абраць незалежную ад усіх Швейцарыю. А я казаў, што не, нам патрэбны Еўразвяз,

бо незалежную „Швейцарыю” тут ніхто не абароніць ад Расеі, а Еўразвяз абароняць. Я выказаў гэтую банальную думку ды змоўк. І тут была доўгая моўча. Потым ён вельмі сур'ёзна паглядзеў мне ў вочы і голасам, які я ад яго ніколі не чуў, сказаў: „Валянцін, запомні, Расея ніколі не аддасць Беларусь”. З той пары я ведаю, чаму Лукашэнка хаваецца ад беларусізацыі краіны, бо ён прадаў мову за ўладу. Інакш кажучы, калі ён пачне выдаваць беларускія кніжкі і газеты, ствараць беларускакамоўныя школкі і Нацыянальныя ўніверсітэты, то ён неўзабаве застанецца без улады, а мы без сваёй краіны. Але ж тое самае будзе і з наступным Гаспадаром Беларусі, якім бы дэмакратам той не быў. Не шаноўныя, наша ўлада нам не дапаможа, таму што Дзяржава – гэта палітыка, а палітыка думае пра ўладу, а не пра мову.

Лявон Тарасэвіч:

Ну каб была здаровая, нармальная культура, трэба чатыры пакаленні. А мы тут сядзім, то мы тут з Беласточчыны трэцяе пакаленне трошкі авансам, таму што дасталі нацыянальную свядомасць ад пакалення Сакрата, Юркі Туронка. І для мяне цікавае, ці ёсць у Беларусі гэтае чацвёртае пакаленне. Тут, Сяргей, я да цябе проста. Нагадаў ты гэтых маладых паэтаў, ці ёсць гэтыя наступныя, каторыя працягнуць гэтую работу?

Сяргей Дубавец:

Вось, як ні дзіўна, ёсць. І па-мойму, іх болей, чым нас было, не па-мойму, а дакладна болей у дзясяткі разоў. Я ў 80-ыя гады ведаў усіх, хто ў Мінску гаворыць па-беларуску, проста ўсіх. Сёння я і мову магу пачуць, а калі збіраюцца, была Шупы прэзентацыя, такая ёсць маладзёвая прастора ОК у Мінску, прыйшло чалавек 300, у асноўным моладзь, я з іх ведаў чалавек 15. Ну для мяне гэта паказнік. Я ведаю, што па ўсіх фейсбуках, я ведаю, што ў правінцыйных гарадах шмат моладзі, свае асяродкі, мы ж ездзім шмат там, сустракаемся, прыходзіць аўдыторыя, маладая пераважна. А што тычыцца дзяржавы. Ну былі Віскулі ў Беларусі. Для мяне нават больш, чым Віскулі паказчык, дзе ў Савецкім Саюзе адбыўся першы пратэстны мітынг перад развалам. Ні ў Вільні, ні ў Прыбалтыцы, ні ў Грузіі, ён у Мінску адбыўся, дзе вадамётамі разганялі ад Курапат людзей, а людзі пратэставалі. Так што і няхай Расея не аддасць, а можа нам удасца самім забраць, я не ведаю.

Хрыстафор Ангельчык:

Добры дзень. Я хачу як бы пра хуткасць і пра грошы сказаць. Нядаўна пачуў проста на вёсцы ад старэйшых людзей. Пытаю, што там адбываецца, а старэй-

шыя дзядзькі кажуць: „Ну, што адбываецца. Цар прыехаў, казаў нам паставіць „нужнік”, а Унія Еўрапэйская прыехала і прымусіла нас рукі мыць”. Карацей, грошы не ўплываюць, бо ж бачым вялікія сістэмы, якія пампуюць гэту культуру. І думаю, што грошы не вырашальныя тут, у гэтым пытанні, таму што людзі на вёсцы кажуць пра прастору шыроку, „срач” і „прымусілі рукі мыць”. Таму культура тут так не развіваецца. Думаю, што мусім думаць інакш. І пра хуткасць хацеў запытаць, пра хуткасць медыяў і змены, гэты кантэкст. Тут Сяргей сказаў, што ўсё ж такі маладое пакаленне ёсць, грошы не ўплываюць, а нас штораз больш.

Сяргей Шупа:

Лічу, што Валянцін сказаў тут абсалютна ключавую фразу, якая дае адказы на ўсе пытанні. Мы тут выказваем свае алібі, апраўдваемся. Кажам, што ўсё залежыць ад дзяржавы, слушна. Але ж дзяржава залежыць ад Расеі! І Расея не зменіцца. Над Расеяй ужо толькі Бог ці хто там яшчэ, а што ён там сабе думае – не ведаю. Так што ўсіх нас можа ўратаваць толькі распад Расеі. Усё.

Анэта Прымака:

Мы тут гаварылі, чаму Мінск не расказвае аб Беласточчыне, чаму людзі ў Мінску не хочуць ведаць многа аб Беласточчыне, чаму на Беласточчыне не вельмі хочуць аб Мінску. Я думаю, што мы павінны думаць аб гэтым, што ў сённяшнім свеце, калі мы жывём у зусім другіх рэаліях вельмі часта. Так што мы можам даць сабе ўзаемна? Што можа быць цікава? Ты гаварыў аб Бурым, так, для нас тут, на Беласточчыне, я думаю, што цяпер гэта адна з такіх галоўных, вельмі эмацыянальных тэм, каторая для людзей у Мінску, я не знаю, ці яна зразумелая, ці не. І наадварот, людзі ў Мінску маюць іншыя праблемы. І я думаю, што мы не павінны крыўдзіцца на сябе, што вы не панімаеце нас. Але падумаць, што ёсць такое, што мы можам панімаць і даць адныя другім. Бо можа гэта будзе больш цікава. Гэта натуральна, больш за 70 гадоў мы жывём у зусім другіх рэаліях, і зусім другі расказ цяпер, нарацыя ў Польшчы, чым вы там маеце на штодзень. Такі вывад, што трэба з гэтым справіцца. Справіцца, але гэта як бы прыняць, бо не памяняем гэтага, што наша дасведчанне зусім другое вельмі часта бывае. Аб культуры, калі мы пачнём гаварыць, альбо аб музыцы, то можа гэта ёсць якаясьці такая „płaszczyzna”, якая больш зразумела.

Яраслаў Іванюк:

Дзякую сардэчна. А пра тое, што ўсё ж такі можа не ёсць так страшна, і Мінск цікавіцца намі тут, на Беласточчыне, няхай можа сведчыць той факт, што кніжка

Анэты ўсё ж такі выйдзе ў Беларусі, на беларускай мове, праўда? „A, nie zna – szto to?” Вось і загвоздка.

Мікола Ваўранюк:

Часам, як мне здаецца, лепш каб Мінск, прынамсі той афіцыйны, не цікавіўся намі тут на Беласточчыне. Бо якраз калі слова бярэ афіцыйны Мінск і бароніць беларусаў Беласточчыны ад палякаў у справе „Бурага”, то вельмі ахвотна ўсе гэтыя дыпламаты бяруць слова, а я не хачу такіх адвакатаў як жыхар Беласточчыны, як беларус, як грамадзянін Польшчы. Так што не заўсёды добра, калі Мінск намі цікавіцца.

Яраслаў Іванюк:

Я думаю, што ў асноўным мелі тут на ўвазе ўсё ж такі гэты незалежны Мінск, гэты беларускі Мінск, гаварыўшы, што намі не цікавіцца. Павал Касцюкевіч у першай частцы нашай дыскусіі, прысвечанай літаратуры, упіраўся на тое, каб паставіць пытанне Чарнышэўскага: „Что делать?” Што рабіць, каб было лепш? Дык у гэтай журналістыцы, у гэтай медыясферы, што рабіць? Што перад намі цяпер, Сяргей?

Сяргей Дубавец:

Працэс. Мы ўсе занятыя з галавой гэтым працэсам. Назіраем ягоны плён. Таму рабіць далей, адказ Чарнышэўскаму.

Павал Мажэйка:

Можна толькі пагадзіцца. Я яшчэ раз паўтару, што незалежныя медыя сапраўды робяць неверагодную справу і будуць працягваць. На жаль, іх само існаванне ў Беларусі часта залежыць ад розных знешніх чыннікаў. Але будзем спадзявацца, што ўсё будзе добра.

Мікола Ваўранюк:

Рабіць сваё. Кожны з нас якраз, хто тут сядзіць, думаю, робіць і не мала, працы хапае. А як шаноўны Валянцін Акудовіч тут карціну прадставіў і потым яшчэ Сяргей Шупа дапоўніў, на тое думаю маем малы, вельмі малы ўплыў, а можам проста ўдзельнічаць у працэсе, рабіць нешта сваё. Працы ўсім хопіць, мы ж адзін аднаму не мяшаем, не перашкаджаем, нам пакуль што паветра хапае.

Яраслаў Іванюк:

Нам можа тут на Беласточчыне вельмі цяжка зразумець тое, што сказаў Валянцін Акудовіч, што пацвердзіў Сяргей Шупа, таму што мы гэтых беларускіх рэаліяў усё

ж такі не ўспрымаем, не жывём у іх, так што нам гэта цяжка зразумець. Я б зрабіў такую канстатацыю кароткую пасля нашай дыскусіі, бо нас ужо з абедам чакаюць, што не спадзявацца ўсё ж такі на дзяржаву, не крыўдаваць на сябе, што мы адны другіх не даацэньваем, працаваць разам з сабой і чакаць на распад Расеі. Дзякуй сардэчна. Сустракаемся а трэцяй трыццаць тут.





XIX ТРЫЯЛОГ

Сімпазіён „Belarusian outside"

Каўказская сінагога ў Крынках, 1 верасня 2018

XIX TRIALOH

Sympozjon „Belarusian outside"

Synagoga Kaukaska w Krynkach, 1 września 2018

частка III / część III

КУЛЬТУРА / KULTURA

Яраслаў Іванюк:

Мы размаўлялі пра ролю дзяржавы пры нагодзе літаратуры, таксама пры сродках масавай інфармацыі. Размаўлялі пра тое, ці спадзяванні на яе абгрунтаваныя, ці не абгрунтаваныя. Я прапаную з гэтага таксама пачаць размову ў гэтай частцы, у якой маем чатырох гасцей, чатырох удзельнікаў. Алена Макоўская, кіраўніца Згуртавання беларусаў свету „Бацькаўшчына", арганізацыі, якая займаецца працай з беларускай дыяспарай. Вітаем... (*апладысменты*). Валянцін Акудовіч, які ўжо браў голас падчас нашых дыскусіі, філосаф, эсэіст, тэарэтык літаратуры... (*апладысменты*). Андрэй Дурэйка, мастак, таксама куратар выстаў, Дзюсельдорф, вітаем сардэчна... (*апладысменты*). І Лёнік Тарасэвіч, гаспадар гэтага месца, які ўсіх нас тут запрасіў, а як некалі адзін з удзельнікаў сказаў „przecież panu profesorowi się nie odmawia", то мы ўсе сюды і прыехалі. Дзякуем (*апладысменты*)... Дзяржавы па-рознаму адносяцца да сваіх эмігрантаў, да тых людзей, якія выехалі за мяжу, шукаючы ці то лепшага жыцця, ці то, каб там проста працаваць, займацца сваёй справай. Адны трактуюць гэтых людзей як чужых, як тых, якія здрадзілі Бацькаўшчыне, выехалі, пакінулі тую Бацькаўшчыну, яны ўжо не лічацца патрыётамі. Іншыя дзяржавы падыходзяць да гэтай эміграцыі па-другому. Лічаць іх, напрыклад, такімі культурніцкімі амбасадарамі, падтрымліваюць іх, дапамагаюць ім развіваць культуру роднай краіны ў эміграцыі. Як гэта выглядае ў выпадку беларускай дзяржавы? Як падыходзіць да эмігрантаў, да дыяспары, да беларускай меншасці, якая пражывае за мяжой, беларуская дзяржава? Я б наперш прасіў узяць голас Алену Макоўскую, таму што вам як кіраўніцы Згуртавання беларусаў свету, хаця б арганізаваўшы з'езды беларусаў свету раз на чатыры гады, даводзіцца таксама працаваць з гэтымі дзяржаўнымі структурамі. Як гэта ў выпадку беларускай дзяржавы? Кім для яе з'яўляюцца гэтыя эмігранты, беларуская дыяспара, беларусы замежжа?

Алена Макоўская:

Добры дзень, шаноўнае спадарства. Дзякуй вялікі за запрашэнне ўзяць удзел у гэтай надзвычайна цікавай дыскусіі. І сапраўды, калі я чытала тэму мерапрыемства, я задумалася над яе шматзначнасцю. Таму што Беларусь „outside", можа азначаць як і беларусаў замежжа, так і саму краіну, якая знаходзіцца нібыта па-за межамі сусветных працэсаў, пра што ўжо вельмі добра сказаў Яраслаў. Да прыкладу, многія краіны свету вельмі актыўна працуюць са сваімі дыяспарамі і ўжо не лічаць сваіх замежных суродзічаў страчанымі для краіны. Магу прывесці прыклад Ірландыі, там у краіне жыве каля сямі мільёнаў ірландцаў, а па-за межамі – 70 мільёнаў. Толькі ўявіце, што дыяспара ў 15 разоў большая за насельніцтва краіны. І тым не менш краіна не лічыць, што нешта страціла, а наадварот, дыяспара – яе найвялікшы актыў, праз які паступаюць ідэі, інавацыі, тэхналогіі і інвестыцыі. Яны разам раз-

віваюць ірландскую культуру і знаёмяць з ёй увесь свет, чаму мы ўсе – сведкі. Але давайце пагаворым пра беларусаў замежжа, якіх амаль тры з паловай мільёны, гэта таксама вельмі багата, калі лічыць, што нас у самой краіне меней за 10 мільёнаў. Вось учора мы былі на выставе, якую арганізаваў Андрэй Дурэйка, і ў мяне ўзнікла пытанне, хто каму больш патрэбны: беларусы замежжа – Беларусі, ці Беларусь сваім суайчыннікам з іншых краін? Да прыкладу, мы бачылі працы мастакоў, што добра прадаюцца ў замежжы, маюць мажлівасць самарэалізацыі і прызнання. Што трэба зрабіць Беларусі, каб яны ўвайшлі ў нашы школьныя падручнікі, а іх працы набыў Мастацкі музей. Сёння адносіны з беларускай дыяспарай рэгулююцца законам „Аб беларусах замежжа”. Можа быць вы чыталі гэты закон, ці чулі пра яго. Але ў любым разе вам будзе цікава ведаць, што ён прымаўся болей за 10 год. Яго то адкідалі, то зноўку абмяркоўвалі на дзяржаўным узроўні. Мы прыкладалі вялікія намаганні, як і асяродкі беларускай дыяспары, каб закон усе ж быў прыняты. І яго прынялі ў 2014 годзе, праўда са шмат якімі агаворкамі, таму што міністэрствы, якія ўзгаднялі закон, казалі: „А чаму мы павінны падтрымліваць беларусаў замежжа, гэта не нашы грамадзяне, яны з’ехалі, яны не плацяць нам падаткі. А мы павінны нейкія рэсурсы накіроўваць на іх падтрымку. Навошта?” З аднаго боку вельмі добра, што гэты закон есць, бо зараз мы можам на яго абапірацца, каб ісці далей. З другога боку яго недахопы відавочныя. У Беларусі дзейнічае таксама падпраграма „Беларусы ў свеце”. Яна не самастойная, а частка другой дзяржаўнай праграмы, і вельмі слаба падмацаваная фінансава. Беларусы – удзельнікі Сёмага з’езда беларусаў свету крытыкавалі гэты дакумент за этнаграфічна-цымбальны характар, бо праграма не ахоплівае ўсе аспекты беларускай культуры, а яшчэ за тое, што падтрымка ідзе тым арганізацыям, якія лаяльныя да беларускай улады, што падмацоўвае падзел беларусаў на сваіх і не вельмі. Такое стаўленне да беларусаў замежжа паглыбляе нашу самаізаляцыю. Гэтая тэма ўжо гучала сёння ў першай секцыі. Мы закрываемся ад свету, працягваем гэтую савецкую традыцыю ізаляванасці, нібыта беларусам можна быць толькі ў Беларусі, а ўсе хто з’ехаў ужо перастае ім быць. Для „Бацькаўшчыны” – арганізацыі, што я прадстаўляю, вельмі важна, каб беларуская культура, якая была створаная ў замежжы была прадстаўленая ў беларускіх падручніках. Таму што вельмі часта можна пачуць ад беларусаў Беласточчыны чаму беларусы з Беларусі нічога не ведаюць пра іх і лічаць за палякаў. Гэта ўсе адукацыя і сфармуляваны ў ёй падыход да беларускага замежжа. Мы вырашылі зрабіць аналіз беларускіх падручнікаў за 9-11 класы, каб паглядзець, якія дысцыпліны ўтрымліваюць згадкі пра беларусаў замежжа. І нам вельмі цікава было даведацца, што ў прынцыпе прадмет, які найбольш утрымліваў такіх згадак – гэта геаграфія. Беларуская літаратура цалкам ігнаруе культурную спадчыну беларусаў замежжа, што з Беласточчыны, што з іншых краін свету, не гледзячы на вялікую колькасць пісьменнікаў. Геаграфія

ж закранае тэму беларускай дыяспары ў межах апісання міграцыйных працэсаў. Эміграцыя падаецца цалкам негатыўна, гэта людзі, якія пакідаюць сваё месца жыхарства, таму што катаклізмы і войны. Эканамічная эміграцыя, палітычная і ўвогуле вольнае перамяшчэнне працоўнай сілы не разглядаецца як прычына змены краіны. Вось крыху прыкладаў, гэта ўрыўкі з падручніка па грамадазнаўству, якое фарміруе ў чалавека ўяўленне пра знешні свет, пра грамадства, якое звязана якраз з міграцыяй. Тут напісана: „У шматнацыянальных калектывах беларусы, як правіла, не схільныя ўтвараць зямляцкія нацыянальныя мікрагрупы, таму што цэняць у чалавеку перш за ўсё асабістыя якасці, а фактар этнічнай прыналежнасці для іх не вырашальны". Гэта значыць, адмаўляецца ў прынцыпе існаванне самой дыяспары, саміх беларускіх дыяспаральных арганізацый, а іх не меней за 200 у 25 краінах свету. Другая, таксама не меней цікавая цытата: „патрыятызм мае перадумовай перш за ўсё шчасце Радзімы, людзі, абыякавыя да лёсу Бацькаўшчыны, гатовыя ў любы момант змяніць яе на іншыя краіны, ніяк не могуць лічыцца патрыётамі". І трэцяя: „беларуская нацыя, беларускі народ, які аб'ядноўвае ўсіх грамадзян нашай краіны". Таму, калі вы не грамадзяне нашай краіны, адпаведна вы не можаце лічыцца беларускім народам. Гэта ўсё падручнік. Мы, канешне, будзем рыхтаваць нашы прапановы ў падручнікі, таму што гэты, нядаўна зроблены, аналіз якраз сведчыць пра тое, што робіцца ў нашай сістэме адукацыі. Такім чынам фарміруецца стаўленне да эміграцыі, стаўленне да дыяспары. Таму наперадзе яшчэ вельмі шмат працы і мне падаецца, што калі мы не наладзім гэтыя масты супрацоўніцтва з беларускай дыяспарай, з беларусамі замежжа, то як раз Беларусі наканавана быць „outside" ці па-за межамі.

Яраслаў Іванюк:

А як гэта з пункту гледжання мастакоў, якія працуюць па-за Беларуссю? Андрэй Дурэйка, ты працуеш у Дзюсельдорфе, але ты ўсё ж такі грамадзянін Беларусі, то цябе можна залічыць да беларускага народу. Але да нечага табе гэты закон патрэбны, пра беларусаў замежжа, ты яго можаш скарыстаць, ты пра яго ведаеш?

Андрэй Дурэйка:

Я ведаю пра гэты закон, але... Ёсць такая скульптура ў Мінску, цяпер пастаўлена замежнікам, такое кола з ручнікам. Вельмі страшная скульптура і па-расейску трэба сказаць „скатертью дорожка" называецца, метафара такая. Гэта выпадкова, што я пра яе ведаю з усіх астатніх мастакоў, бо ўсіх астатніх гэта не цікавіць, бо да гэтага ставяцца вельмі фармальна. Добра, калі яшчэ хто змагаецца за гэтую справу. Ясна, што мастакі заўсёды больш за астатніх індывідуалісты, і шукаюць зусім іншыя шляхі. Для Беларусі, апрача ўсяго, гэта ўжо можна сказаць тыповая сітуацыя. Ста-

годдзе БНР адзначылі і маем ужо традыцыю, што беларусы з'язджаюць са свайго краю. Не важна, альбо яны там былі грамадзянамі, альбо па нацыянальнасці беларусы. І мне здаецца, што ёсць такі імунітэт, каторы ўжо выпрацаваўся. Ты сказаў (*звяртаецца да Лёніка Тарасэвіча*) праз тры пакаленні, а можа ўжо і больш за сто гадоў, чатыры пакаленні, каторыя могуць за сябе змагацца, і гэта як бы не з'яўляецца праблемай для асоб. І мы ведаем паспяховых беларускіх мастакоў, але гэта тэрыторыя толькі мастацтва. Вось калісьці, гэта было ў канцы 90-х, я быў Швейцарыі, і першы сакратар беларускай амбасадыі прыязджаў, і быў зацікаўлены мастацкім працэсам. Пасля гэты сакратар стаў амбасадарам у Нямеччыне, і з усіх мастакоў, якія тут на выставе, а я ведаю яшчэ ў тры разы больш, персанальна і ва ўсіх пытаўся, ці калі-небудзь нехта з гэтых людзей з амбасады афіцыяльна прыходзіў на якое-небудзь мерапрыемства, то я атрымаў адказ „ніколі". Адзін у мяне быў досвед, выбарамі дзясятага года, прыйшоў нейкі чалавек з амбасады ў Берліне, калі я ладзіў выставу. Гэта не нармалёва і гэта падкрэслівае тое самае, што стаіць у гэтым страшным падручніку. Як так можна? Так што праблема застаецца з аднаго боку, калі мы кажам аб палітыцы, аб культурнай палітыцы, а з другога боку, усе людзі, каторых я ведаю, навучыліся жыць без гэтай дзяржавы. Так ёсць, хаця гэта праблема. У ва ўсіх, каго я ведаю з іншых краёў, мастакоў, заўсёды ёсць нармальная падтрымка, ёсць цэлыя інстытуты, інстытуцыі, і Польскі інстытут і Інстытут Гётэ, напрыклад, іншыя падтрымліваюць сваіх людзей. І казаць, што нікому не хацелася б, каб дзяржава іх падтрымлівала, гэта было б таксама хлуснёй.

Яраслаў ІВАНЮК:

Лёнік, у адрозненні ад Андрэя, мы з табой паводле падручніка па грамадазнаўству Беларусі нават не ўлічваемся ў беларускі народ. Тут Мікола Ваўранюк у папярэдняй дыскусіі гаварыў пра тое, што лепш не чакаць і не мець такой падтрымкі ад беларускай дзяржавы як з боку беларускіх дыпламатаў. Ты якраз ад Беларусі, ад пабывак у Беларусі, сваіх выстаў, маеш не найлепшы вопыт. Ты б спадзяваўся на нейкае зацікаўленне з боку беларускіх дыпламатаў, палітыкаў, беларускай дзяржавы, тваёй асобай, тваёй творчасцю?

Лявон ТАРАСЭВІЧ:

Радзі Бога, сцеражы! Але я ведаю, што цяпер і цікавяцца і патрэбны я быў бы ім. Але пакуль што, знаеш, мы адныя ад другіх далёка і не канешне мы сабе патрэбныя. Але гэта такое пытанне, што проста гэтая дзяржава, якая ёсць, яна не патрабуе, каб развіваўся інтэлект, і таму непатрэбнае ім мастацтва ў такім як мы думаем сэнсе сучасным, яны не завельмі зацікаўлены гэтым мастацтвам. Яны не ведаюць, што гэта быў бы вельмі добры рухавік, каб развівалася дзяржава, бо дзяржава, якая не

мае мастацтва, яна проста памірае. Але на ўзроўні такім сялянскім ты не ў змозе гэта камусьці растлумачыць. Я ў нейкі спосаб ужо пераэжыў гэты час, таму што мы ў 80-ыя гады жылі тут у Польшчы і таксама не патрабавалі, каб дзяржава намі апекавалася. Мастацтва існавала, даходзіла таксама да гэтага, што ўзнагароды Цыбіса былі дзве, і адна такая, каторую мастакі прызнавалі мастаком, а другая такая, што дзяржава прызнавала. Быў такі час, што мастацтва вельмі добра існавала ў гэтыя гады 80-ыя, і спецыяльна людзі не бралі ўдзелу ў выставах афіцыйных, і помню, калі ў Сіднеі было біенале, і Томэк Цяцерскі меў прапанову, каб ён прадстаўляў Польшчу на гэтым біенале, ён не згадзіўся. А Эдвард Двурнік згадзіўся і потым, праз дзесяць гадоў цяжка яму было выставіць штось у мастацкім асяроддзі Польшчы, таму што польскае мастацтва ёсць вельмі з сабой звязанае і як бы цягне гэты цяжар адказнасці за мастацтва, так як і сёння. Ну, ніхто ў асяроддзі мастацкім не быў захоплены гэтым, што Юрка Каліна зрабіў гэты помнік, каторы ў Варшаве на Пляцу Пілсудскага. Адным словам я выхоўваўся ў такім асяроддзі, і таму, калі прыйшлі гады 80-ыя, мы самі стараліся па сабе, па-за дзяржавай працаваць, рабіць выстаўкі. То быў яшчэ час такі, што трэба было мець пашпарт, каб выехаць, найгоршым было, каб перавезці выстаўку, а потым многія выстаўкі тут, у краіне, мы іх фінансавалі, таму што не было грошай з афіцыйных устаноў. І 80-ыя гады – гэта таксама ёсць такі час, што многія работы, якія ёсць у музеях, яны от проста былі дарма аддадзены толькі таму, каб яны былі ў музеі. Была такая адказнасць за гэты мастацкі інтэлект у Польшчы. Так што думаю, такі адказ.

Яраслаў Іванюк:

Светы існавалі паралельна, і ў Беларусі можна па-сутнасці сказаць, што цяпер таксама ёсць такія два паралельныя светы, якія з сабой амаль не перасякаюцца. Мы тут, у Крынках, падчас гэтых дыскусій розныя рэчы прыдумлівалі, я прыдумаў „сродкі масавай эміграцыі", размаўлялі пра падзенне Расеі, можна сказаць, прыдумалі падзенне Расеі. Давайце яшчэ прыдумаем: Валянцін Акудовіч стане прэзідэнтам Беларусі. Валянцін, якую ролю вы прыдасце беларусам замежжа, беларускай культуры ў замежжы, беларускаму мастацтву, усяму таму, што ствараецца па-за межамі Беларусі?

Лявон Тарасэвіч:

(*у бок Акудовіча*) Лёгка было б твае партрэты рабіць...

Валянцін Акудовіч:

Маё вясёлае дзякуй, шаноўны Яраслаў! Але я б нават брыгадай сантэхнікаў не змог бы кіраваць. А каб праз нейкую фантастыку такое прэзідэнцтва здарылася, то я са-

браў бы ў вечар перамогі найлепшых сяброў, мы смачна выпілі б, а пад ранак засіліўся, каб выратаваць краіну ад такога нягеглага кіраўніка... А далей пра сур'ёзнае. Ад моманту Незалежнасці мне балела і баліць дагэтуль праблема беларускай эміграцыі і найперш праблема маёй роднай Беласточчыны. Я нарадзіўся і асталеў у мястэчку Свіслач. Гэта такое дзяржаўнае марнатраўства, якое варта прыраўняць да дзяржаўнага злачынства. Колькі людзей, падзей і ўсялякага іншага дабра мы згубілі за гэты час. Толькі пра беларускае замежжа хай лепей, яшчэ распавядзе. А я трохі пра сучасную Беларусь, у якой мы, нацыянальна заангажаваныя, па сутнасці апынуліся ў тым жа статусе эмігрантаў як і вы стасоўна Беларусі. З гэтага ў нас склалася два дыскурса культуры: дзяржаўны і незалежны. Пра дзяржаўны мне няма чаго сказаць добрага, а пра незалежную культуру я магу казаць хоць да ночы. Бо тут у 90-х сфармавалася выдатная рок-музыка, новая гісторыяграфія, радыкальна іншая літаратура, адметная школа перакладу, незалежныя выдавецтвы, розныя адукацыйныя інстытуцыі, сярод іх слынны Беларускі калегіум. Але найбольш мяне цешыць, што мы змаглі сфармаваць, лічы з нуля, дыскурс сучаснага беларускага мыслення. Яшчэ ў 90-ыя гады, калі хтосьці казаў „беларускі філосаф", усе побач, угнуўшы галавы, сарамліва пасміхаліся, як з аксюмарана „жывы нябожчык". Сёння гэта гучыць ужо зусім сур'ёзна. Бо за прамінулыя гады паўсталі розныя інтэлектуальныя выданні і першы ў гісторыі Беларусі чыста філасофскі часопіс „Фрагменты". Таму ўжо ў 2005 годзе мы з Алесем Анціпенкам у межах Беларускага калегма стварылі фундаментальную анталогію сучаснага беларускага мыслення. Ясна, у нас і думкі не было прасіцца да дзяржавы, ды і ўвогуле наракаць на тое, што нам дзяржава замінае. Карацей кажучы, я вяртаюся да ранейшых гаворак і скарг маіх калег, што дзяржава нам не дапамагае. Трэба забыцца на дзяржаву, на такую дзяржаву трэба забыцца. Так усім будзе лепей.

Яраслаў Іванюк:

Ну тады гэтыя светы ніколі не будуць перасякацца.

Валянцін Акудовіч:

І не патрэбна з такім светам перасякацца, прынамсі, пакуль ён нам чужы. Але я хацеў бы сказаць яшчэ колькі слоў пра дзяржаву і пра нацыю ўпаасобку. У нас чамусьці паводле адраджэнскай завядзёнкі ўсё яшчэ лічаць, што без беларускай мовы ні беларускай дзяржавы, ні беларускай нацыі не будзе. Шаноўныя сябры і калегі, відаць больш за палову нацый сусвету размаўляюць не на ўласнай мове і не румзаюць. Прыкладам, аўстрыйцы скарысталіся нямецкай мовай і цудоўна пачуваюцца. Уся паўднёвая Амерыка з мноствам нацый ужывае іспанскую мову. Я ўжо не кажу пра ўніверсальную для ўсяго свету мову ангельцаў... Асабіста для

мяне беларуская мова – гэта дом майго быцця. Без яе я жабрак і валацуга. Але пры гэтым я ведаю, што ні мова фармуе нацыю, а ў першую чаргу Дзяржава ўсімі сваімі інстытутамі, законамі, мытнямі і г.д і да т.п. Інакш кажучы, незалежна ад стану мовы нацыя будзе – ужо ёсць. Што да ўласна мовы? Як кожнаму з нас вядома, тут дамінуе руская. Але руская ў нас – гэта пераважна мова камунікацыі, а беларуская мова – гэта мова каштоўнасцей, і сама каштоўнасць. На беларускай мове напісана Біблія Скарыны. На беларускай мове створаны статут Вялікага княства Літоўскага, а пазней і амаль уся наша літаратурная класіка. Далей болей. Беларуская мова адыграла ключавую ролю ў палітычным паўставанні Беларусі. Калі вырашаўся лёс БНР, Вацлаў Ластоўскі выступіў з лозунгам „Жыве Беларусь у этнаграфічных межах”, а этнаграфічныя межы Беларусі навукоўцы, між іншым, пераважна расейскія, вызначалі найперш паводле мовы.

Яраслаў Іванюк:

Мне ажно цяжка паверыць, што ў гэтай Анталогіі беларускага мыслення не было ні слова пра беларусаў замежжа, але сапраўды здаецца не было?

Валянцін Акудовіч:

Сапраўды не было. Хаця не, Максім Шчур быў з Прагі з вельмі харошым эсэ, нездарма ён потым атрымае найвышэйшую літаратурную прэмію імя Ежы Гедройца. Аднак Вы маеце рацыю. Разрыў паміж „намі” і „вамі” драматычна глыбокі. Тым болей каштоўныя сустрэчы, якія вы штогод ладзіце на радзіме дарагога мне Сакрата Яновіча.

Андрэй Дурэйка:

Прабачце, але скажу троху іншую думку. Мне было вельмі цікава спаткацца ў гэтай зале з філосафам, і маю другую думку, напрыклад, як мастак, каторы па-за мовай, і чалавек, які звязаны з канцэптуальным мастацтвам, а апошнім часам займаецца постлігвістычнай пластыкай. І ўласна таму як чалавек, які працуе ў візуальным мастацтве, пытанне застаецца, мяне заўсёды пытаюць: а як выглядае там у тым безмоўі беларускае мастацтва? Я парырую і кажу, быць можа гэта вызваленне беларускай культуры па-за моўнае. І таму аб беларусах свету, хто там Шагал, Суцін, каго хочаш можам дацягнуць да таго, Драздовіч або ўсё астатнія, гэта не значыць, што яны не выкарыстоўвалі мову, або выкарыстоўвалі іншую мову, але тое, што яны казалі зусім іншым языком. І для мяне, напрыклад, як для мастака выяўленчага гэта вельмі-вельмі важны пункт, і быць можа, мне часам здаецца, што гэта і ёсць тое прыстанішча, дзе чалавек можа пазбавіцца гэтага вузкага паняцця „нацыянальнасць”.

Валянцін Акудовіч:

Вельмі цікавая заўвага. Між іншым, я пра гэта таксама раней пісаў, толькі ўсё тут не перакажаш...

Яраслаў Іванюк:

Нягледзячы на тое, што Акудовіча няма...

Валянцін Акудовіч:

Так называецца мая першая кніжка „Мяне няма. Роздумы на руінах чалавека". Калісьці Свабода праводзіла апытанку і там было такое пытанне: што будзе, калі беларусы перастануць гаварыць па-беларуску? І я адказаў: яны будуць маўчаць па-беларуску. Гэта і трагічны жарцік, але і вельмі сур'ёзна...

Яраслаў Іванюк:

Андрэй Дурэйка гаворыць, што сучаснае мастацтва можа быць бязмоўнае, але пад канец сцвярджае, што таксама безнацыянальнае. Лёнік, ці сапраўды мастацтва не мае нацыянальнасці, не павінна гэтай нацыянальнасці мець?

Лявон Тарасэвіч:

Ну гэта, знаеш, ёсць як бы чарговыя ўзроўні, на якіх развіваецца мастацтва і мастакі. Мне гэта вельмі цікавае, што Андрэй нам прыбліжае гэты свет мастацтва, каторы ёсць на сённяшні дзень у Еўропе і сярод беларусаў у свеце. Бо гэты BELARUSIAN OUTSIDE мы перажылі першыя, жывучы ў Беластоцкім краі, што гэтае першае нашае пакаленне, каторае ўваходзіла ў свет мастацтва, тут маю на думцы Янка Грыку, каторы ў Любліне Галерэю „Белую" вядзе, ці Мірэк Філёнік, каторы быў у групе „Neue Bieriemiennost" разам з Міркам Балкам, важнае для польскага мастацтва, і потым яшчэ малодшыя, каторыя ўвайшлі ўжо, ці Паўлік Грэсь з фатаграфіяй, ці Оля Чарняўская з жывапісам. Гэта паказвае, што патрэбныя ёсць чарговыя ступені. Мы проста, калі знайшліся па-за Беласточчынай, самыя пабачылі, што мы ёсць іншыя. І гэта Беласточчына пачала і беларускасць мець значэнне для нас. Каб яшчэ цікавей, то людзі, каторыя з Беластока і палякі жывуць у Познані, яны разам трымаюцца, яны чуюцца ў гэтым Познані на эміграцыі. І важна таксама, што думкаю ў выяўленчым мастацтве можна было найхутчэй супрацоўнічаць разам з другімі нацыямі. І зараз таксама шанц ёсць вялікі, калі гаварыць пра беларускіх мастакоў, якія жывуць у Нямеччыне, Бельгіі ці ў Англіі і другіх краінах, што тады можа наступаць супольны дыскурс, супольнае тварэнне новай мовы, каторая спалучае нас усіх. А то ж мова – гэта медыум, якім мы паслугоўваемся. І часта ёсць так, што не звяртаем увагу, што часта мастакі, да

прыкладу, польскія мастакі не валодаюць польскай мовай, а лічацца як польскія мастакі, і ў іншых нацыях ёсць таксама. Ці яшчэ кантрастная рэч, што японскі мастак Коджы Камоджы жыве ў Польшчы ўжо 40 гадоў, ён стварае польскае мастацтва. Мы, думаю, за вельмі прыпінаем такую латку, ці ён гаворыць ці не гаворыць, ці мае свядомасць, ці не мае свядомасці. Часта ёсць так, што творца можа не мець свядомасці, калі ён ёсць спалучаны з якойсьці культурай. Ну такім прыкладам для польскай культуры ёсць творчасць Канрада, каторы проста сёння лічыцца ў літаратуры польскай. І тое, што мы выязджалі, бо вы выязджалі з Беларусі, я выязджаў з Беластоцкага краю, думаю, каб перад вайной, то я выехаў бы ў Вільню, бо ж у нас ніхто ў Варшаву не ездзіў. А так паехаў да найбліжэйшай акадэміі, якая ёсць у Варшаве. Часта я паўтараў студэнтам, што каб я меў розум і час, які цяпер, то я проста бы спакаваў сабе наплечнік і паехаў таксама ў Дзюсельдорф, бо калі ёсць якаясьці акадэмія, каторая ёсць найлепшая ў Еўропе, то проста трэба туды ехаць так, як раней ехалі палякі ў Пецярбург, так як ехалі ў Парыж, бо мы ёсць эміграцыяй інтэлектуальнай, мы не ёсць ані палітычнай, ані эканамічнай, мы проста ёсць эміграцыя інтэлектуальная, каторая паехала туды, дзе можна займацца гэтым, што мы робім. І таму такая ёсць развязка.

Яраслаў Іванюк:

Тады мова – гэта толькі сродак перадачы ідэй, ці ўсё ж мова – гэта ёсць вялікая каштоўнасць. Алена, як гэта ёсць у гэтых суполках беларускага замежжа, якія займаюцца захоўваннем беларускай спадчыны?

Алена Макоўская:

На гэтае пытанне магу працытаваць аднаго з прадстаўнікоў беларускай дыяспары з Расіі. А сказаў ён наступнае: „Вы сабе ў Беларусі як хочаце, а нам, у Расіі, гуртавацца проста няма вакол чаго". Таму што, калі Беларусь будзе размаўляць па-руску, то тады што рабіць беларускай дыяспары ў Расіі, на якой мове яны будуць размаўляць і чым адрозніваццa. Мова, культура – важнейшыя складнікі нацыянальнай ідэнтычнасці. У 2011 годзе мы правялі цікавае сацыялагічнае апытанне з мэтай даведацца, як змяніліся беларусы з моманту атрымання краінай незалежнасці. Ідэя апытання ўзнікла ў сувязі з высокімі тэмпамі асіміляцыі беларусаў у замежжы. Так, беларусы па-ранейшаму з'язджаюць, але рэдка далучаюцца да беларускіх арганізацый ды суполак, трымаюцца ў асноўным свайго звыклага кола камунікацыі, тым болей што сучасныя сродкі камунікацыі робяць гэта камфортным. Але вернемся да апытання. У працэсе даследавання высветлілася, што ў беларусаў дамінуе тэрытарыяльная, грамадзянская ці сацыяльная ідэнтычнасць, а вось нацыянальная, культурная значна слабей. Гэта значыць, што калі чалавек мяняе краіну пражы-

вання, мяняе пашпарт, ён мяняе сваю ідэнтычнасць. Культурная ж ідэнтычнасць больш глыбокая і з'язджаючы чалавек будзе працягваць лічыць сябе беларусам. У 2008 годзе мы разам з шэрагам грамадскіх арганізацый Беларусі пачалі кампанію „Будзьма беларусамі", яе мэта была і есць – паглыбленне нацыянальнай ідэнтычнасці. А рабілі мы гэта праз дэманстрацыю таго, што беларуская мова, беларуская культура – сучасная, актуальная. Казалі пра тое, што беларуская мова якасны сродак камунікацыі. Размаўлялі з бізнесам, з рэкламістамі. І спачатку яны былі вельмі крытычныя, казалі, што ў рэкламе мова ўжываецца толькі дзеля таго, каб падкрэсліць адрознасць, звярнуць увагу, так бы мовіць „выпендрыцца". Зараз ужо прайшло колькі год і мы правялі шэсць фестываляў беларускамоўнай рэкламы і камунікацыі, і рыторыка абсалютна змянілася. Кампаніі хочуць размаўляць са спажыўцамі на роднай мове, таму беларуская мова пашырылася менавіта ў рэкламе. Калі вярнуцца да тэмы ідэнтычнасці, нашы сацыёлагі вынайшлі ў працэсе яе даследавання цікавы факт – у беларусаў эмацыйны складнік не прысутнічае ў структуры нацыянальнай ідэнтычнасці. Калі раскрыць сэнс гэтай высновы, то выглядае што мы выступаем староннімі назіральнікамі ў сваёй краіне. З аднаго боку мы разумеем, што незалежныя, адпаведна прымаем факт, што ў нас мусіць быць і свая культура, і свая мова, як і ў іншых народаў. Але мы не суперажываем, у нас няма пачуцця калектыўнага сораму, ці калектыўнага гонару. І вось для гэтага, я думаю, трэба ладзіць грамадскія, адукацыйныя кампаніі, ствараць, актуалізаваць прадметы супольнага гонару, каб гэта нас яднала. І тут, канешне, культура і мова маюць найвялікшае значэнне. Так, сёння людзі асэнсоўваюць, што мова гэта каштоўнасць, але мы хочам каб гэта была не толькі музейная каштоўнасць, якую берагуць, але не карыстаюцца.

Яраслаў Іванюк:

Лёнік, ты ўзяў мікрафон, нейкі каментар?

Лявон Тарасэвіч:

Так, я проста хачу сказаць, што мы, каторыя займаемся сучасным выяўленчым мастацтвам, мелі такую праблему, бо так як Андрэй і сябры выехалі з Беларусі, ці я выязджаў з Беласточчыны, то мы на месцы вырасталі ў такім асяроддзі, дзе не можна было развіваць сучаснае мастацтва. Паехалі на эміграцыю, і ў гэтай эміграцыі было бел-чырвона-бела і „Пагоня", і ўсё, звязана з беларушчынай гэтай, каторая выехала, але з другой стараны мы таксама там не мелі свету, дзе патрэбнае было сучаснае мастацтва. Трэба было як бы павярнуць і стварыць такі свой свет, кожны па сваіх магчымасцях, як можна зрабіць, каб займацца мастацтвам. Я вельмі хутка падзяліў сваю асобу паміж Беласточчыну, мову, царкву і такі свет, каторага не маю дзесьці там у Еўропе, і другі свет мастацкі, у каторым не было таго, што

было на Беласточчыне. Беласточчына з Польшчай вельмі кантрастная. Думаю таксама і Андрэй, і другія мастакі, жывучы ў тых краінах таксама мусілі падзяліць гэты свет, а пасярэдзіне заставалася тое, чым мы так папраўдзе займаемся і толькі ў такіх абставінах мы маглі гэта развіваць.

Андрэй Дурэйка:

Я толькі троху хачу дадаць. З майго вопыту было так, што калі я толькі прыехаў у Нямеччыну і мяне запрашалі шмат на якія выставы, а пасля высвятлялася, што я беларус, а не рускі і не ўкраінец, альбо ўвогуле чалавек, які не хоча падпісвацца пад СССР, дык адразу ставілі на мне кляймо, што я не рускі. Таму для беларусаў усё роўна няма магчымасці пазбавіцца свайго. І нават людзі, каторыя выехалі, я ведаю некалькіх калег, з Амерыкі, спрабавалі гэта зрабіць, але і так праз дзесяць гадоў атрымалі гэтае кляймо „беларускага мастака”, таму што гэты дыскурс папросту сёння існуе ў палітычным і культурным свеце на ўсім глобусе. І гэтага пазбавіцца амаль што немагчыма.

Яраслаў Іванюк:

Ну кляймо – гэта такое... ці сапраўды назваць некага „беларускім філосафам” ці „беларускім мастаком” – гэта ўжо такое ацэначнае?

Андрэй Дурэйка:

Быць можа так, таму што тады ёсць код культуры, каторы атрымоўваеш, і тады пытанне зразумела ў адносінах да мастакоў. Я амаль кожны год у Польшчы бываю, выстаўляюся, альбо раблю лекцыі і спатыкаюся з маладымі мастакамі, і заўсёды пачынаюцца размовы. І ўсе ведаюць „Bauhaus”, а да сённяшняга дня яшчэ не ўсе, нават з мастацкага асяроддзя, ведаюць, што такое „Унавіс”. Калі ты кажаш, што гэта з Беларусі, у людзей адчыняюцца вочы. І наадварот, сёлета была выстава, напрыклад, у Пампіду „Легенды Віцебска. Расійскі авангард”.

Валянцін Акудовіч:

Можна я ў суплёт да сваіх слынных калег і ўласную байку распавяду пра выезд у эміграцыю. Я паступіў у Літаратурны інстытут у Маскве – здаецца, адзіны ў свеце, з Мінскага маторнага завода, і паспяхова скончыў яго. Больш за тое, пасля чацвёртага курса ўжо працаваў у часопісе „Знамя”. Мне і прапіску гатовыя былі зрабіць, каб я ў маскоўскі часопісе застаўся. А я, не маючы ў Мінску нічога абсалютна – ні імя, ні жытла, ні працы вярнуўся на бацькаўшчыну. Сем год адседзеў вартаўніком у розных катухах. І калі мяне пыталі, а чаго ты сюды вярнуўся, кінуўшы сталіцу свету і адзін з лепшых часопісаў у камуністычнай імперыі, я шчыра казаў: „Халера

яго ведае”. І толькі напрыканцы 80-х, калі здарылася тое, што здарылася і паўстала незалежная Беларусь, я зразумеў чаму я не застаўся ў Маскве.

Яраслаў Іванюк:

Словам, Валянцік Акудовіч – гэта таксама эмігрант у пэўным сэнсе, у Расеі пабываў. Можна нехта з публікі захоча ўступіць у такі філасофска-мастацка-культурніцкі дыскурс?

Яна Шостак:

Была мова пра інтэлектуальных эмігрантаў, і вы пыталіся, што мы можам прыдумаць, каб быць патрэбнымі, ці мы, беларускія мастачкі, жывучыя за мяжой, патрэбныя Беларусі і чаму. Мне падаецца, патрэбныя, таму што трэба мець, паўтару за куратарам Стахам Рукшам, „niezdrowy entuzjazm”, каб выехаць з Беларусі ў іншую краіну і стаць інтэлектуальным мігрантам. Таму тое, што мы маем, то бок „niezdrowy entuzjazm”, што мы вырваліся і выехалі, і захацелі чагосьці новага, чагосьці іншага, дакладна не ведаючы, што гэта, таму што ў нас у школах і нідзе... акрамя інтэрнэту, калі ты не ведаеш, як паслугоўвацца інтэрнэтам і як шукаць сучаснае мастацтва, і што яно такое, то ты нават не будзем ведаць, як пішацца „бойс”: „beus”, ці „boys” як хлопцы. Таму мне падаецца, Андрэй Дурэйка для мяне такі асабісты прыклад, што ў яго ёсць такі „niezdrowy entuzjazm”. Ён мяне знайшоў праз інтэрнэт, і ён увогуле, калі вы не ведаеце, робіць кожны месяц такія „zestawy”, pdf, складкі, проста сам сядзіць і робіць на валанцёрскай аснове, складкі ўсіх беларускіх мастачак і мастакоў, які рабілі выставы там у ліпені, у жніўні. І так кожны месяц атрымліваю ў месенджары рассылку і дзякуючы гэтаму ведаю беларускае асяроддзе. Вось гэты „нездаровы энтузіязм” ён вельмі патрэбны Беларусі. На жаль, канешне, гэта незразумела для самога беларускага мастацкага асяроддзя. Маю на жаль такое дасведчанне, што падышла да мяне маладая куратара з Украіны і кажа, „о, супер, што ў вас там на Беларусі тварыцца, увогуле з мастацтвам, вельмі хацелася б даведацца. У мяне быў праект, каб супрацоўнічаць з беларускім мастацкім асяроддзем, я напісала ў галерэю – зразумела, у Беларусі ёсць толькі адна галерэя, і не атрымала адказ”. Для мяне гэта проста не зразумела. І я, тое, што магу, і Андрэй, і ўсе іншыя мастакі за мяжой, то гэта толькі пераказаць і перадаць гэты „niezdrowy entuzjazm”, які мы тут маем, дзякуючы Польшчы, між іншым.

Яраслаў Іванюк:

Як зваў так зваў, „niezdrowy entuzjazm”. Сяргей гаварыў, што вар’ятаў тут у нас шмат, так што можа ўсё будзе з гэтым добра. Я хацеў бы запытаць Андрэя, тут

Лёнік гаварыў, што ў часы Польскай Народнай Рэспублікі мастакі аддавалі дарам свае працы, каб толькі яны былі ў галерэях, у музеях. Ці ёсць шанц, што гэтыя мастакі, якія прэзентуюцца ў Крынках, што іхнія працы трапяць у бліжэйшы час у беларускія музеі? Дзе можа іх пабачыць жыхар Беларусі?

Андрэй Дурэйка:

Ну, некаторыя ўжо там ёсць, як Жана Грак, якая падаравала сваю працу для музея. Таксама беларускія мастакі, я ведаю, шмат хто аддаюць свае працы за вельмі сімвалічную цану, альбо калі кажуць, мы набудзем у цябе малы абраз, ён аддае шасцімятровы абраз, каб проста трапіў у нацыянальную калекцыю. На жаль, мы ўвогуле маем праблемы, што Беларусь падаравала Еўропе Страмінскага, які стварыў першы Музей сучаснага мастацтва ў Польшчы, а сама Беларусь не мае музея. Гэта той жа віртуальны праект архіву беларускага мастацтва „Калектар" (*http://kalektar.org*), ініцыятар Сяргей Шабохін, ён на жаль цяпер так сама ад'ехаў з краю, з якога выйшла выстава, якая называецца „Збор". І яна была ўжо прадстаўлена ў Беластоку чатыры гады таму, пасля мы зрабілі вялікую выставу ў Кіеве, і цяпер плануецца, у канцы канцоў, у Мінску, каб паказаць, што сучаснае мастацтва ёсць. Там будзе прадстаўлена 40 праектаў, каторыя на нашу думку, думку групоўкі, савету, з'яўляюцца найважнейшымі за час незалежнасці Беларусі. І ёсць план стварыць гэтую віртуальную калекцыю твораў, якія маглі б увайсці ў наш Музей сучаснага мастацтва. На жаль, гэта тэма асобная, і тое, што нават намінальна ў Мінску быў Музей сучаснага мастацтва, а сёння зноў знік. Таму гэтая выстава, чаму я адказаў „так", як куратар, што буду яе рабіць, таму што гэта зноў тая самая праблема. І, напэўна, мастакі падаравалі б.

Міхась Андрасюк:

Лёнік тут называў прыклады, калі мастак можа існаваць і ствараць, не валодаючы сваёй нацыянальнай, ці сваёй роднай мовай. Ну гэта так, калі гэта датычыць выяўленчага мастацтва, скульптуры, а што тады з літаратурай. Як выжываць, існаваць беларускай літаратуры без беларускай мовы? Ну можа гэта быць беларуская літаратура на расейскай мове. Але калі паглядзім у не так далёкую гісторыю Еўропы, калі ўжо амаль не існавала чэшскай мовы, і калі б так засталося, калі б гэтая чэшская мова не адрадзілася, ці быў бы сёння Кундэра, ці быў бы Гашак, ці быў бы Грабал? Мабыць, былі б. Але ці такія, ці нам хацелася б іх чытаць, ці я кахаў бы Грабала, як кахаю сёння, калі б ён пісаў на нямецкай мове? Спадар Акудовіч казаў, што можа існаваць дзяржава з дзяржаўнай мовай суседняй дзяржавы і прывёў прыклад Аўстрыі і Нямеччыны, але я хачу звярнуць увагу на адзін факт. Ёсць адзін варунак, можа так быць. А што было б, калі б не разгром Нямеччыны ў 45, дзе была б сёння Аўстрыя, ці была б незалежная дзяржава Аўстрыя, ці была б часткай Нямеччыны?

І можа быць сапраўды, каб Беларусь магла жыць, магла існаваць на расейскай мове, то таксама ёсць адзін варунак: разгром Расеі.

Лявон Тарасэвіч:

Пра літаратуру скажу табе, Міхась. Калі б Сакрат Яновіч не меў кантакту з Гедройцем, Адамам Міхнікам, Яцкам Куранем ці Літвіньскім, ён не мог бы так развівацца, бо асяроддзе, якое меў вакол сябе, не дараўноўвала яму проста ўзроўнем літаратуры, так. Але хачу таксама сказаць з другой стараны пазітыўнае, бо гэты BELARUSIAN OUTSIDE, ён ужо існаваў у нас, бо каб не тое, што Марк Радковіч, ці Марк Шагал, каб яны не выехалі, каб яны не былі па-за Беларуссю, яны не маглі б гэтага развінуць на такім узроўні і быць разам з другімі сучаснымі мастакамі найбольшымі, якіх той час выдаў. І на сёння мы можам карыстацца імі толькі таму, што яны там развіваліся. На месцы я ўпэўнены, што таго не магло б быць. Думаю таксама, што тое, што да сёння выехала многа мастакоў і працуюць у розных іншых месцах, бо там могуць гэта рабіць, і могуць разам іншымі абмяняць думкі і развівацца, гэта таксама ёсць вельмі добрае. На будучыню гэта ёсць кадра, каторая можа быць фундаментам Акадэміі мастацтва на Беларусі, і гаварыць пра нармальнае мастацтва. А не гэтыя, знаеш, постсавецкія цацкі, каторыя проста яшчэ засталіся. Мы калісьці пайшлі з Клаўсам Нордэнхаке ў Чыкага на ярмарку, знаеш, мастацкую і пераглянулі ўсе работы ў палоскі. Ні на адным не былі падобныя.

Валянцін Акудовіч:

Спадар Міхась, можа так пачулася, што я быццам абыякавы да лёсу мовы. Ні ў якім разе. Толькі пакуль немагчыма беларусізаваць усю Беларусь і нават небяспечна з узгляду на імперскія парыванні ўсходняга суседа. Нам спачатку трэба стварыць асобныя плацдармы, дзе мова магла б натуральна рэгенерыравацца сама з сябе, а не праз высілкі энтузіястаў. І калі гэтак зможам зрабіць, то тады стане бачна ці ёсць шанцы пашыраць гэтыя плацдармы на абсягі ўсёй краіны.

Андрэй Дурэйка:

Я яшчэ адкажу таксама з другога боку пра гэтае паступовае развіццё. Ёсць такія рэчы, якія вельмі дзіўна адбываліся з беларускімі мастакамі. Напрыклад, праз тое, што Алег Чорны працаваў разам з філасофам Джорджа Агамбенам, рабіў фільм і ўжываў цытаты Галілея, і аказалася, што гэты тэкст Галілея быў упершыню пераптлумачаны на ўкраінскую мову на нашай выставе, цяпер будзе перапттлумачаны таксама на беларускую. Такі вось лінгвістычны выпадак, хаця гэта мастак візуальны, робіць відэа-арт. Альбо, напрыклад, цяпер Аліна Блюміс, працы якой тут прадстаўлены, якая жыве ў Нью-Ёрку, мае дзве выставы, цяпер у Лондане, потым у Бер-

ліне, сказала, што ў Берліне друкуецца кніжка з тэкстам Гройса. Друкуецца гэтая кніжка на нямецкай мове і на мове мастака, на беларускай мове будзе надрукавана. Так што ёсць такія выпадкі нават вельмі дзіўныя, каторыя прыходзяць з візуальнай культуры, але таксама працуюць на мову, на беларушчыну, і гэта таксама фенаменальныя рэчы. І больш такіх прыкладаў ёсць.

Яанна Чабан:

З Крынак менавіта. Так, я тут пра спадара Акудовіча цэлы час думаю. Так, беларуская мова – гэта цэннасць, безумоўна, трэба ёю даражыць і захоўваць, таму што яна вымiраючая мова. І я б тут забыла пра спадарыню Алексіевіч на нейкую хвіліну і сканцэнтравалася на беларускай мове. Што зрабіць, што б прадоўжыць яе жыццё. З другой стараны, вы тут гаворыце-гаворыце і ўжо загубіліся ў гэтай беларускасці, бо па-мойму беларускасць нельга разглядаць у кантэксце толькі беларускай мовы, гэта нешта больш, чым адна беларуская мова. І думаю, калі б не гэта шматмоўнасць Беларусі, не было б гэтай беларускай філасофіі. Беларуская філасофія магчыма чаму? Таму што ў нас жылі такія і такія нацыі, якія карысталіся такімі і такімі мовамі і яны працавалі на гэты клімат, якім вы цяпер карыстаецеся, які дае натхненне для вашай творчасці. Дзякуй.

Валянцін Акудовіч:

Вельмі істотная рэпліка. Але Вы мяне ўніверсальна інтэрпрэтавалі паводле адной лакальнай рэплікі. У нас ніколі не было адной мовы, у нас ніколі не было адной культуры, у нас ніколі не было адной рэлігіі і гэтак далей. Таму мы паводле азначэння не можам быць монацэнтрычнымі. Мы ўжо ўнутры саміх сябе, унутры свайго генатыпа – мультыкультурныя. Пра гэта я таксама ўжо шмат казаў раней.

Яраслаў Іванюк:

Я разумею, што публіка тут патрабуе больш тонкіх вывадаў. Але ўчора Лёнік, адказваючы на пытанне, якое я яму паставіў як журналіст, перад мікрафонам, пад запіс пра нацыянальнасць мастацтва, ён мне адказаў проста: „Ну ты што? Я толькі гляну і ведаю, што гэта маляваў француз, немец, паляк”. Ну тут вядома больш тонка, чым для журналіста, адказаць, што пойдзе ў свет. Алена напачатку нашай дыскусіі паставіла, не ведаю, тэзіс, пытанне, ну хто так па-сутнасці, на аўтсайдзе. Ці на аўтсайдзе мы, людзі, якія па-за Беларуссю, ці на аўтсайдзе ўсё ж такі сучасная Беларусь. І можа я прасіў бы нашых гасцей ад Андрэя пачынаючы, закончыўшы на Алене, хто на аўтсайдзе?

Андрэй Дурэйка:

Ну гэта гісторыя, канешне, пакажа, хто на аўтсайдзе. Але я заўсёды кажу, што я б не хацеў, каб увогуле існавалі гэтыя межы, і ўсё раблю для таго, каб у мастацтве іх

не было, і таму прэзентую мастацтва не толькі па-замежнае, але і беларускае, і для мяне няма гэтых меж. З другога боку, з майго досведчання, тое самае, як Лёнік казаў, мы маем, напрыклад, такую артыстку Эвэліну Домніч, цяпер пераехала з Нью-Ёрка да Амстэрдаму, тое, што яна робіць – аналагаў няма ў Беларусі. Максім Тымінько, відэамастак, тое, што ён робіць – няма аналагаў. Аляксей Кашкараў і так далей. Я магу далей і далей называць. Ёсць шмат і іншых праблем. Напрыклад, я не ведаю аніводнага беларускага мастака ні ў Беларусі, ні па-за мяжой, які б займаўся біа-артам, або біялагічным мастацтвам. Гэта тое таксама, што Лёнік кажа, калі мы павінны некаторыя дзядзіны развіваць, то мы павінны ехаць і вучыцца, калі няма іх у нашых школах, і гэта падставовая праблема інстытутаў у цэлай краіне. І тады пабачым, хто будзе аўтсайд. На сённяшні дзень ёсць так як ёсць, што некаторыя рэчы, авангардныя, скажам так, па-за краем адбываюцца.

Яраслаў Іванюк:
Лёнік, будзем чакаць на адказ гісторыі, ці ты нам скажаш, хто на аўтсайдзе?

Лявон Тарасэвіч:
Знаеш, калі гаварыць пра слова „аўтасайд”, то можа мы геаграфічна так і ёсць. Але калі ўлічыць, што ты лічыш сябе жыхаром Еўропы, то гэтага няма. Калі ідзе пра інтэлект, то гэтай граніцы няма. Мы і так, і так кантактуемся з сабой ці калі ідзе пра сучасную музыку, ці з усімі мастакамі, дзе хто ёсць. Найважнейшае для нас на сёння, калі ідзе пра выяўленчае мастацтва, каб часцей рабіць „агору”, на каторай спатыкаемся і на каторай можам рабіць тое, што мы робім хаця б у Крынках, калі дзякуючы „Трыялогу” мы можам спатыкацца. Кожны потым можа жыць, але важна спатыкацца, і гэта дае такую сілу, каб далей магчыма было жыць, тварыць і гэтак далей.

Яраслаў Іванюк:
Валянцін Акудовіч, крышку можа па-філасофску я прасіў бы, як вы сябе адчуваеце: на гэтай „агоры”, ці як аўтсайдар?

Валянцін Акудовіч:
Ну, гэта будзе вельмі доўга. Найперш скажу, што, на жаль, пры ўсёй глыбокай сімпатыі не толькі да прыгажосці, але і да інтэлекта спадарыні Алены, мне здаецца, гэтая пазіцыя аўтсайдар-лідар запазнілася. На ўсялякі выпадак нагадаю, што мы ўжо даўно існуем у глабальным свеце, які скаланізаваў усю зямную кулю. І глабальны ён не толькі таму, што ўвесь свет загорнуты ў агульны інфармацыйны дыскурс: Euronews, CNN, Трамп... На якім кантыненце б мы

не жылі, ва ўсіх нас у жытле абавязкова стаіць тэлевізар, камп'ютар, пральная машына, а ля пад'езда ці ў гаражы – легкавік. І чым у гэтым сэнсе сутнасна адрозніваецца нават японец ад беларуса, гэта яшчэ пытанне, я ўжо не кажучы пра тое, у чым мы тут разрозніваемся з нашай дыяспарай... Я з вялікім задавальненнем прачытаў тэкст спадара Кастуся. Грунтоўны, разгорнуты, цікавы матэрыял пра ўсю эміграцыю беларускую як у яе гістарычнай вертыкалі, так і гарызанталі, але яго оптыка зноў жа скіраваная ў прамінулага час. Карацей, нам трэба мяняць слоўнік у самым шырокім сэнсе. Былы слоўнік састарэў абсалютна. Яшчэ Зыгмунт Баўман, папулярны год 30 назад філосаф, актуалізаваў азначэнне „намады". Мы як старажытныя качэўнікі з кожным годам робімся ўсё больш рухомымі істотамі. Ладная частка з нас ужо цяпер больш жыве ў гатэлях, чым у родным жытле. Усе гэтыя менеджары, спартоўцы, музыкі, „чаўнакі", мастакі, кіроўцы рэфрэжэратараў і г.д. і да т.п. у роднай хаце калі і бываюць, то ў адпачынак. Дык да чаго і да каго іх прыпісваць? Яны гойсаюць па ўсім свеце, дзе грошы сабе зарабляюць ці марнуюць зробленыя.... Калісьці вялікі нямецкі філосаф Марцін Хайдэгер напісаў, што ўжо згубілася ўкаранёнасць у глебу. Ён вельмі востра гэта адчуў яшчэ ў першай палове ХХ стагоддзя. А цяпер ужо не ўкаранёнасць у глебу згубілася, згубілася сама глеба. І мы нібыта тыя намады лётаем, ці сноўдаемся, па ўсяму свету. І ўжо дарэмна пытацца: „А хто там ідзе?" абсалютна іншыя часы.

Лявон Тарасэвіч:

У нас цэлы час нацыяналізм.

Яраслаў Іванюк:

Калі прыдумваць новыя словы, новы слоўнік, то ўжо пачатак ёсць. Яна Шостак ужо пачала новыя словы прыдумваць, называць па-іншаму. Паколькі ў нас ва ўсіх дыскусійных блоках гендарнае пытанне было зусім парушанае, толькі адна жанчына, я думаю, што Алена такім сваім падвядзеннем вынікаў проста, як кажуць палякі, паставіць кропку і „będzie pozamiatane", на гэтай „агоры".

Алена Макоўская:

Я пагаджаюся са спадаром Акудовічам. Свет сапраўды сёння імкліва мяняецца. І калі мы, беларусы, унутры Беларусі будзем закрывацца, зачыняць свае межы, не бачыць сваёй дыяспары, сваёй нацыянальнай меншасці, то, безумоўна, гэта мы будзем „outside", мы будзем па-за межамі цывілізацыйных працэсаў. Мы павінны быць адкрытыя. Мне хочацца спадзявацца, што наш афіцыйны Мінск таксама гэта зразумее, таму што выпаданне з глабальных працэсаў не дазволіць нам атрымліваць

з іх бонусы. Гэта вельмі важна, і я веру ў сілу прагрэсу, спадзяюся, што мы будзем разам з нашай нацыянальнай меншасцю і разам з нашай беларускай дыяспарай. Дзякуй.

Ярслаў Іванюк:

Chciało by się powiedzieć: a nie mówiłem? Kropka i jest pozamiatane.

Я з гэтага месца хацеў бы прывітаць Кастуся, якога няма тут з намі, але ён напісаў вельмі цікавыя, на маю думку, уводныя тэксты, асабліва гэты тэкст пра яблык. Гэты тэкст пра яблык, дзе ён зрабіў параўнанне краіны, народу, з яблыкам. І вось у гэтых матэрыялах, якія вы маеце і можаце гэта прачытаць, мне застаецца толькі такая канстатацыя, што ўсім нам трэба самім вырашыць, ці мы якраз, беларусы замежжа, гэта тыя адкіды, лупіны і смецце, ці ўсё ж такі гэтая найбольш шматколерная і прывабная, пахучая вонкавая абалонка ў гэтым яблыку. Дзякую сардэчна. Сардэчна дзякую таксама арганізатарам за арганізацыю і правядзенне гэтых дэбатаў, дзякую ўсім дыскусантам, якія, напэўна, увялі шмат новага ў гэты дыскурс, дзякую публіцы за тое, што выслухалі нас, за тое, што таксама ставілі пытанні нашым удзельнікам.

Лявон Тарасэвіч:

І а шостай трыццаць будзе канцэрт, так што можам выйсці, пачакаць, каб прышыкаваць залу да канцэрту. І дзякую за гэты канцэрт слоўны, які ў Крынках прагучаў сёлета.

Ярслаў Іванюк:


Думаю, што Сакрат Яновіч быў бы задаволены.


Лявон Тарасэвіч:

Горды быў бы.

Ярслаў Іванюк:

Сёння ўсё амаль па-беларуску (*апладысменты*)...





МАСТАЦТВА

Пра___бел

Дадзеная выстава арганізавана адмыслова для XIX Трыялогу ў Крынках (XIX Trialog „Belarasian outside”) і з’яўляецца сегментам шматгадовага даследавання Андрэя Дурэйкі прысвечанага беларускаму мастацтву за мяжой.

Пад канец 90-х мінулага стагоддзя, на фоне распаду Савецкага Саюза і здабыцця Беларуссю незалежнасці, склалася ўнікальная сітуацыя для беларускай культуры, калі за яе межамі апынулася вялікая колькасць мастакоў, якія, тым не менш, шмат у чым вызначаюць яе сённяшні твар.

Ужо ў назве выставы агучана дваістае становішча такой сітуацыі: з аднаго боку, паўсталая пустэча, інтэрвал, пазначыліся мяжы; з іншага, працягваецца сведчанне за/пра беларускую платформу.

Наш свет раздзіраецца адначасовым глабалісцкім і нацыяналістычным контр-рухам. Мы імкнёмся да волі перасоўвання, адкрытасці меж, і пры гэтым выступаем за захаванне дзяржаўнай незалежнасці і культурнай самабытнасці. Тым часам эмігрант паступова робіцца самым тыповым жыхаром планеты. Гэтыя не толькі ўцёкі ад палітычных і эканамічных праблем, але і вечная спроба выйсця за бар’еры: геаграфічныя, прыродныя, філасофскія, эстэтычныя. Такое трагічнае становішча разрыву з зыходнай культурай, імкненне да новага і патрэба самаідэнтыфікацыі, звароту да вытокаў, з’яўляецца адным з матораў пераасэнсавання мастацкай мовы. Уласна, у першую чаргу, гэта выстава пра мову актуальнага мастацтва, з дапамогай якога толькі і магчыма ўяўленне пра пашыраную нацыянальную культуру як агульнасусветную; пра сучаснае мастацтва, як тэрыторыю свабоды, дзе адбываюцца галоўныя бітвы чалавека,

якія здымаюць супрацьстаўленні паміж „тут” і „там”.
У выставе возьмуць удзел мастакі: Аліна Блюміс, Максім Вакульчык, Ягор Галуза, Жанна Грак, Лена Давідовіч, Андрэй Дурэйка, Аляксей Казанцаў, Андрэй Логінаў, Віка Мітрычэнка, Марына Напрушкіна, Уладзімір Пазняк, Ганна Сакалова, Лена Сулкоўская, Максім Тымінко, Ігар Цішын, Сяргей Шабохін, Яна Шостак, Алег Юшко, працуючыя сёння ў Амерыцы, Бельгіі, Галандыі, Нямеччыне, Польшчы і Расіі. Будзе прадстаўлены шырокі спектр медыяў і плыняў, ад геаметрычнай абстракцыі да палітычнага арт-актывізму.

Куратар выставы: *Андрэй* Дурэйкаа

SZTUKA


Pra___bel

Wystawa ta zorganizowana została specjalnie z myślą o XIX Trialogu „Belarusian outside” w Krynkach i jest segmentem wieloletniego studium Andrieja Dureiki poświęconego sztuce białoruskiej poza granicami kraju. W końcu lat 90. ubiegłego wieku, na tle rozpadu Związku Sowieckiego i otrzymania przez Białoruś niezależności, powstała unikalna sytuacja dla kultury białoruskiej, kiedy to za granicą znalazło się wielu twórców, którzy tym mniej, wydatnie formują współczesne oblicze tej kultury.
Już w nazwie wystawy brzmi dwojakość tej sytuacji; z jednej strony powstała pustka, przerwa spowodowana zarysowaną granicą, a z drugiej strony żywe pozostaje świadectwo białoruskości (kultury białoruskiej) w ogóle. Nasz świat rozdarty jest pomiędzy dwoma kontrtendencjami: globalistyczną i nacjonalistyczną. Dążymy do swobody przesuwania, otwartości granic, a jednocześnie optujemy za zachowaniem niezależności państwowej i tożsamości kulturowej. Tymczasem emigrant stopniowo przeistacza się, po prostu, w całkowicie typowego mieszkańca planety. Jest to nie tylko ucieczka od problemów politycznych i ekonomicznych, ale także odwieczna próba przekroczenia barier: geograficznych, środowiskowych, filozoficznych i estetycznych.
Ta tragiczna sytuacja oderwania od macierzystej kultury, dążenie do nowego i potrzeba samoidentyfikacji, zwrócenia się ku źródłom, jest jednym z motorów przewartościowania języka sztuki. Właściwie, jest to wystawa, w pierwszej kolejności, o języku sztuki za pomocą którego, wyłącznie, możliwe jest wyobrażenie o kulturze narodowej jako

ogólnoświatowej; o sztuce współczesnej jako o przestrzeni wolności, gdzie odbywają się zasadnicze zmagania człowieka, gdzie znikają przeciwieństwa pomiędzy „tu" i „tam". W wystawie wezmą udział artyści: Alina Blumis, Maksim Wakulczyk, Jahor Hałuza, Żanna Hrak, Lena Dawidowicz, Andrei Dureika, Alaksiej Kazancau, Andrei Łohinau, Wika Mitryczenka, Maryna Napruszkina, Uładzimir Pazniak, Hanna Sakałowa, Lena Sułkouskaja, Maksim Tyminko, Ihar Ciszynia, Siarhiei Szabochin, Jana Szostak, Aleh Juszka, którzy obecnie pracują w Ameryce, Belgii, Holandii, Niemczech, Polsce i w Rosji. Będzie przedstawione szerokie spektrum mediów i nurtów, od abstrakcji geometrycznej do politycznego art-aktywizmu.

Kurator wystawy: *Andrei* Dureika





МУЗЫКА


Галя Чыкіс

